*П. Галавач*

# ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

Б Дз В

ас. Бд 46587

ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

# ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

Вокладка Л. Зусмана

Бд 46587
Бел. аддзел
1994 г.
1.328
Б Г15
БССР
імені Леніна

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Заказ. № 410. 3.000 экз. ($6^{1}/_{4}$ арк.). Галоўлітбел № 401.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выд-ва.

25.04.2009

# УЦЯКАЧ

*Апавяданьне*

Паўлу Голубу,—адчуваў ён гэта з кожным днём усё больш і больш,—рабілася страшна. Думкі былі толькі аб адным—аб сьмерці. Ці то ён успамінаў далёкі дом, маці, працу ў полі, ці то свае маленства,—усё гэта зараз-жа пераплятала́ся з думкай аб тым, што яго кожную хвіліну могуць забіць, і ўсё адразу зьнікала, прыемныя думкі і вобразы ўспамінаў беглі прэч, заставаўся адзін толькі страх.

Голуб добра памятае, як ён упяршыню адчуў гэты страх.

Ляжалі ў акопах, стралялі. Страляў і Голуб. Цэлы дзень поўзалі па лініі акопаў весткі, што з левага крыла ёсьць шмат забітых і параненых.

Але Голуб іх ня бачыў, не ўяўляў і гэта не палохала. У дзень здалёку падпаўзьлі думкі пра дом, пра родных, але зараз-жа зьнікалі. Думкі тупелі ад страляніны. Ноччу-ж было спакойна і ад таго трывожна. Чакалі яшчэ большай страляніны назаўтра. І ён у гэтую ноч асабліва чакаў дня. У чаканьні трывожным сьцягнулася кароткая летняя ноч.

Пачало разьвідніваць. Наўкола было ціха. Ніводнага гуку, ніводнае прыкметы вайны, небясьпекі. Хвілінамі здавалася Голубу, што гэта так сабе зайшлі яны ў далёкае поле і ляжаць на зямлі, адпачываюць; здавалася, што вось-вось узьнімуцца хутка, абтрасуць з шынэляў пясок і пойдуць кудысьці да людзей.

Драмалася.

А як толькі неба зусім прасьвятлела і ўсход задрыжэў блізкім полымем сонца, Голуб адчуў сябе лепей, вальней заварушыўся ў сваёй ямцы і, ня паднімаючы галавы, глянуў на таварышоў. Недалёка ад яго паварушыліся яшчэ двое, усьміхнуліся насустрач.

— Па вадзічку зьбегаем.

Крокаў трыццаць да ручайка. Двое падняліся з ямак і з рогатам пабеглі з кацялкамі. Вось, бачыць Голуб, яны нахіліліся ўжо над вадой, мыюцца і ўсё чагосьці рагочуць. Ужо заўважыў іх камандзір і крычыць, каб паўзьлі ў акопы. Маладзейшы махае камандзіру рукой, паказвае на кацялок. Потым яны зачэрпалі ў ручайку кацялком вады і, сагнуўшыся, пабеглі да акопаў. Ужо зусім блізка. У гэты момант пачуўся глухі стрэл уперадзе, за ім гулкі выбух. На Голуба сыпанула пяском. Цэлая гара пяску і дыму ўзьнялася недалёка ад акопаў, дзе былі двое, і захавала іх. Калі растаў дым, усе ўбачылі: старэйшы—скурчаны, з разорваным целам і ў лахманох ад падранай шрапнэльлю вопраткі, ляжаў нярухомы. Малады падняўся, сеў і, пазіраючы шырока раскрытымі вачыма на таварышоў, пачаў запіхаць у жывот вывараченыя кішкі. Жывот

прарвала. З жывата бегла кроў. Замазанымі ў кроў рукамі ён пхаў кішкі ў жывот, абціраў з твару пот, пакідаючы на ім кроў, а кішкі зноў выпадалі. Гэта было ўсяго некалькі сэкунд, а ўсім здалося, што вельмі доўга. А калі зьнямогшы, спуджана і крыва ўсьміхнуўшыся ў бок таварышоў сваёй няўдачы, ён спусьціў рукі і аблёг на зямлю, яшчэ некалькі сэкунд усе глядзелі, быццам акамянелыя. Потым да параненых папаўзьлі санітары. Голубу зрабілася да балючасьці страшна і крыўдна. Ён уздрыгануў.

— Як страшна. І ня думалі яны...

На яго словы паварушыўся сусед.

— Не ўсьцерагліся...

Гэта Мушка, добры знаёмы Голуба, малады, прыгожы. Мушка ляжаў патыліцай на зямлі. Ён быў вясёлым хлапцом, умеў прогожа апавядаць і падабаўся Голубу сваімі гаворкамі аб людзях, аб жыцьці.

Зараз Мушка ляжаў нярухома і раскрытымі вачыма, сьветлымі, як само неба, пазіраў угору,—мусіць, марыў. Голубу хацелася пасьля бачанага пагаварыць з Мушкай. Ён ня стрымаўся.

— Такі-та дзень! Рабіць-бы што-небудзь, араць, дый касіць ужо час, а мы тут. І вось так дарэмна гінуць людзі...

— Не дарэмна. Трэба сьцерагчыся, а гінем не дарэмна. Самы раз касіць ужо. А хіба не касілі-б, каб не яны, каб ня белыя? Э-эх! Хутчэй-бы іх прыкончыць,—тады-б пайшлі і касіць, і араць... І не падобна зусім, што мы на вайне, на фронце,—каб не

забітыя,—нібы на начлезе сьпім... Як ты думаеш, пасьля гэтых белых знойдзецца яшчэ хто-небудзь супроць нас? Ім самі ангельцы дапамагаюць. Калі іх падоляць, мне так здаецца, не асьмеліцца другі лезьці?..

І сам адказаў на свае словы.

— На нашу галаву хопіць іх. Гэтага паб'ём—другому дапамагаць будуць. Пакуль усіх не пераможам, не араць нам спакойна, не касіць. Та-ак.

А Голубу хацелася другога.

— Навошта гэтая вайна? Якая ім справа да нашых парадкаў. Нам яны падабаюцца—добра, па іх мы і будуем жыцьцё, а калі вам не да густу—ня трэба. Мушка, ці хацеў-бы ты дадому?

— А ты, хіба ня хочаш? Хацець адно, а ці можна?

— А чаму? А каб уцячы, хіба мала ўцякае?

Мушка павярнуўся тварам да Голуба, глянуў на яго моўчкі, зноў лёг, як і раней, і дадаў.

— І я жыць хочу, працаваць, але каб гэта можна было зрабіць, трэба наперад кончыць з белымі. Куды ўцячы? Ты ўцячэш, я, за намі другія, а яны сьледам і зноў на шыю сядуць. Кончыць трэба, потым дадому... Скінуў-бы ўсё, у аднэй кашулі выйшаў-бы ў поле, зямля дрыжэла-б! Зямлі ў нас зараз во-о, ад паноў адабралі... комуну сваю організавалі-б і жылі...

Гаворачы аб комуне, Мушка захапляўся сваёй гаворкай, цьвёрда верыў у тое, што гаварыў. Ён бяз кніг, з чужых слоў і сваіх думак намаляваў сабе чароўны

вобраз жыцьця ў комуне і, гаворачы аб сваёй комуне, зачароўваў і другіх.

— ... Сталі-б сотняй адзін за другім з плугамі і адразу гоні ўзараныя, па баразьне і гоні..

— А ў нас аб комуне ня ведаюць.

Змоўклі.

Мушка зноў па-ранейшаму пазіраў у блакітны прастор неба і марыў аб комуне.

А неба ўсё болей сьвятлела. Нябачным полымем дыхаў усход. Ціха адпаўзала на захад цёмнаю хмараю ноч. Ціха плылі ў галаве Мушкі і Паўла думкі, думкі мірныя—пра дом, пра работу.

Прарваўся з-за небасхілу першы прамень, пырснуў золатам сьвятла па полю. Сьпераду гукнуў адзінокі вінтовачны стрэл—і зноў усё ціха. Голуб пазіраў на Мушку. Той таксама ляжаў нярухома, як і раней, яго шырока расчыненыя вочы спакойна пазіралі ў навіслы над ім блакітны прастор. А па яго абросшаму рэдкімі валасамі твару паўзла буйная, яскрава-чырвоная на сонцы казяўка; расьцягнулася шнурком, дапаўзла і скокнула ў чырвоную росную мураву. І нават ні ўздрыгануў Мушка. Голуб бачыў гэта і спачатку не зразумеў, ня мог зразумець. Ён моўчкі чакаў. Потым штурхануў суседа ложаю стрэльбы, але той і не варухнуўся. А вочы, бачылі, як па шчацэ яго паўзьлі шнурком чырвоныя казяўкі і скакалі ў мураву. Зрабілася страшна. Голуб чуў, як па скуры забегалі халодныя казытлівыя мурашкі, самі заляскалі і зубы, пачалі

дрыжэць рукі. Ён адвярнуўся ад суседа, нешта сам сабе зашаптаў.

З гэтай пары зразумеў Голуб, што ня сьцерпець яму акопнага жыцьця. Нарадзіўся страх перад сьмерцю, якой ня відаць, але якая пагражае кожную хвіліну.

Думалася толькі аб сьмерці.

Было страшна.

*

Прайшло яшчэ два тыдні, фронт адышоў у глыб Беларусі. Голуб з таварышамі зноў ляжалі ў ямках-акопах, на краю лесу. Белыя затаіліся, чакаюць большых сіл. Вёрст дзесяць да іх. На фронце ўсе дні было ціха...

Страх не пакідае Голуба... Ноччу ён брэдзіць... Яшчэ страшней ад цішыні, ад чаканьня... Нараджалася жаданьне—хутчэй-бы ўжо,—ці забілі, ці што іншае— абы не чакаць, абы ня мучыцца...

Нялёгка было і ўдзень.

Лес поўніўся шэптамі ветру і сьпевамі птушак. Сьвежасьцю, сілай дыхала зямля, будзіла прагнасьць жыцьця, а ад гэтага яшчэ яскравей здавалася небясьпека сьмерці: перад вачыма ўставаў белы, аброслы рэдкімі валасамі, твар Мушкі і буйныя чырвоныя, крывавыя казяўкі на ім. Цяжка было маўчаць і ён гаварыў суседу.

— Чаго мы ляжым? Ці туды-б, ці сюды—усё-роўна...

Сусед з фабрычных, зямляк, са зьдзіўленьнем пазіраў на Голуба.

— А табе што, не ляжыцца?.. Было-б сілы болей,—пайшлі-б уперад, а няма—паляжаць трэба і так. Ты чаго?..

— Страшна мне, браце. Ляжыш, чакаеш і ведаеш, што сьмерць чакаеш. Каб хутчэй яно! Ці хоць-бы стралялі, а то маўчаць. Ды яшчэ разам ведаеш, што пільнуюць, каб забіць.

— Дык што-ж, па-твойму?

— Ня ведаю. Хочацца дадому, да сваіх. Малады я яшчэ... Навошта столькі людзей б'юць?..

— Ня ведаеш! А зямлю, нябось, бацька ўзяў ад пана? Волю ўзяў?..

— Я ведаю, але страшна мне, так страшна, што не магу я тут быць. Сьмерці страшна... ні завошта-ж...

— А зямля? А воля?

— Дык чаму сьмерць за гэта, кроў?

— Таму, што ня дарам. Ня ты будзеш біць—цябе будуць. На тое і воляй завецца, на тое нам і хочацца яе, што крывёю бярэм. Што лёгка бярэцца,—ня люба, ня дорага тое!

Ноччу ня змог заснуць Голуб. Ня сьцерпеў і абудзіў суседа.

— Не магу я, не перанясу... Страшна... Мучыць мяне...

— А ты сьпі, ня думай, баязьлівец!

— Не ад гэтага, а так не магу, з таго разу, як забілі Мушку... з таго часу і не магу...

БССР Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна

— Дык што-ж?..

— Уцяку, пайду адсюль...

— Уцячэш? Уцекачом станеш?..

— Абы куды, абы ня тут!

— ... Уцячэш, а мы каб за цябе сядзелі тут?.. Уцячэш—зловім, самі расстраляем... Ня ведаеш, за што ваюеш?.. А ведаеш, дык чаго-ж, чаго на другіх страх наводзіш? Для прыкладу другім такіх расстрэльваць трэба! Тут вораг, а ён ные: уцяку... Не паслабляй фронту! Каб ня вы, уцекачы такія, даўно-б з белымі кончылі...

Голуб маўчаў. Хацеў супакоіць сябе, але страх густою навалай цёмнай ночы поўз на яго, душыў сваімі халоднымі капцюрамі і не выпускаў з іх. Голубу хацелася бегчы адсюль, крычаць, і каб не зрабіць гэтага, ён да болі драпаў пальцамі зямлю, без канца голасна ўторыў адну толькі думку...

*

Зьмяркалася.

Паціху хвалявалася нагрэтае за дзень паветра. Успаміналіся дні хатняе працы на сенажаці. Голубу хацелася прыпомніць і ўявіць сабе да самых дробязяй і родных, і двор, і сенажаць, і працу, але ў галаву супроць жаданьня лезьлі думкі аб небясьпецы і ўспаміналіся сказаныя мінулай ноччу словы суседа. Голуб застаўся нездаволены гэтаю гутаркаю і хацеў пагаварыць яшчэ, каб той зразумеў. Але сусед маўчаў і

Голуб чамусьці баяўся зачапіць яго. А маўчаньне палохала... Страх не даваў ні на хвіліну пакою... І заглушыць яго нельга было нічым...

Калі зусім ужо зьмеркалася, падышоў камандзір.

— Таварыш Голуб, вы ідзеце ў выведку, зараз-жа! Да раньня трэба зьвярнуцца назад з весткамі.

Камандзір растлумачваў, як і куды ісьці кожнаму выведніку, аб чым дазнацца. Голуб слухаў і хоць разумеў усю небясьпеку гэтага даручэньня, разумеў, што ідзе мо' на пэўную сьмерць, але не супярэчыў, не адмаўляўся, саромеўся суседа. І як толькі камандзір скончыў, ён паправіў шынэль, праверыў вінтоўку і накіраваўся за камандзірам.

Сусед падняў галаву.

— Уцячэш—глядзі!..

Выведнікам трэба было ісьці ў адным напрамку, але так, каб ня ісьці кучай і каб быць блізка адзін ад другога. Дзеля таго, прайшоўшы крыху разам, яны разышліся ў бакі.

Ціха ішоў Голуб. Асьцярожна ступалі ногі ў густой роснай мураве. Ён бачыў, як зьлева крыха-па-крысе зьнікала ў цемры постаць суседа і гублялася сувязь між імі: усьведамленьне поўнага адзіноцтва пачынала палохаць...

Ісьці трэба вёрст пяць. Яшчэ некалькі крокаў поплавам, а там—далей дарогай ці полем...

Пад нагамі густая трава, высокая і сакавістая—у самы раз касіць... Шкода таптаць... Голуб высока

ўзьнімаў ногі і асьцярожна ступае ў месцы раней нагледжаныя. Чаравікі абмываюцца расой, але на іх і на абмотках застаюцца травінкі і кветачкі. Голубу хочацца схіліцца, узяць у жменю куст муравы і гладзіць рукою, і нюхаць яе.

Выйшаў на дарогу. Асеўшы пыл, здаецца пухам. Мякка ступаюць ногі, як гарачы прысак пухкае пад нагамі пыл, мокрыя чаравікі робяцца шэрымі. Па бакох дарогі жыта сьпее. Цяжкае калосьсе гнецца да зямлі. Пахне сьвежа-ўзоранай зямлёй і гноем...

«Бач ты, другі раз ужо, мусіць, аралі, пад азімае».

Зусім забыўся Голуб, дзе ён, захапіўся малюнкам ціхага поля, такога блізкага, роднага... Ён ішоў, гладзіў і песьціў рукою росныя і буйныя жытнія каласы...

«Якое буйнае—няўжо гэтак па ўсіх палосах?»

Яму захацелася ў глыб поля. Зьвярнуў на мяжу. Мяжа—наўскасяк побач з дарогай. З двох бакоў жытнія каласы біліся ў твар. Прайшоў трохі і, набраўшы ў жменю каласоў, спыніўся, спрабаваў пальцамі зерні. Потым успомніў, што ён у выведцы, і міжвольна прыслухаўся.

Недалёка ў жыце нешта дзіка крыкнула, зашамацела. Голуб аслупянеў, застыў з узьнятай над каласамі рукой. Цела нібы пракалолі наскрозь нечым вострым, халодным. Адчуваў як халадзее галава, як узьнімаюцца пад шапкай валасы. Зьнік спакой. Успомнілася, што свае—далёка ўжо, а тут—мо' на мяжы, ці ў разоры, праз загон, сядзіць белы выведчык, можа зьме-

ціў яго і рыхтуецца кінуцца ззаду, схапіць і задушыць, ці пракалоць штыхом. На плячах, між лапаткамі, балюча заныла, нібы туды ўжо калолі. Уявіў, як лезе ў цела штых, адчуў балючасьць і чуць ня крыкнуў ад страху. Разумеў, што трэба зьняць з пляча вінтоўку, нарыхтавацца да стрэлу, але ня мог паварухнуцца, скрануцца з месца.

«Назад, назад... Не пайду далей, хай што хочуць робяць»... «Хут-чэй, хут-чэй ад-сюль, уця-чы, уця-чы»— выбівала ў тахт думкам напалоханае сэрца.

І, ня маючы сіл ісьці, сагнуўся і накарачках папоўз мяжой назад. Спатыкаўся рукамі аб каменьні, зьбіваў аб іх калены, калоў рукі дзікай межавой травой. Перашкаджала паўзьці вінтоўка, павіслая на руцэ, наступаў на яе каленамі, але поўз і ўсьлед паўзла трывога, здавалася, гоняцца за ім сотні нябачных страшных ворагаў.

Ззаду на дарозе пачуўся тупат. Спыніўся, прыслухаўся.

«Коні. Едуць верхавыя».

Тупат ужо зусім блізка... Вось параўняліся, усяго праз некалькі загонаў... Хацелася трохі падняцца, глянуць, колькі іх, але ня мог адарваць рук ад зямлі, страх прыкаваў іх, абцяжарыў усё цела; так і прастаяў на карачках, пакуль ня сьціх тупат.

«Белыя. Значыцца, яны недалёка. Іх выведка».

Дапоўз да дарогі і замест таго, каб ісьці да месца, дзе свае акопы, перабег дарогу, зноў у жыта і хутка

папоўз разорай, ня ведаючы куды, змучаны, дрыжучы ад страху і стомы... Поўз доўга, без адпачынку... А трывога расла і расла...

Ужо блізка лес... Вось поплаў... Выпаўз з жыта, глянуў пужліва ўперад, па бакох і зноў папоўз, баючыся ўзьняцца, каб ня зьмецілі...

Лес...

«Уцячы, уцячы, уцячы...—шапталі без канца губы».

«Цішэй, каб не пачулі свае, яны недалёка».

Прапоўз ціхенька яшчэ з паўсотні мэтраў па лесе, прыпыніўся паслухаць.

У лесе аніводнага гуку, толькі гоман працяжны, ціхі ўгары...

Падняўся і пайшоў. Прайшоў яшчэ крокаў дзьвесьце, зьняў вінтоўку і патранташ і кінуў пад хвою.

Шавяльнулася дакорам думка, што бачыў белых і не сказаў сваім. Успомніў дакоры суседа па акопу.

«Можа пайсьці, вярнуцца?»

Але холадам падыхаў страх перад небясьпекай быць забітым, і перапалоханае сэрца яшчэ мацней выстуквала:

«Уця-чы, уця-чы, уця-чы»...

Хацеў апраўдваць сябе.

«Я не магу тут... Ня здраднік я, але не магу, мучыць мяне. Абы куды, абы ня тут»...

Палахліва прыслухоўваючыся да тупату сваіх ног і да стукаў сэрца, крочыў уперад, ня ведаючы дарогі,—абы туды—у глыб лесу, абы далей ад фронту...

*

Дарога.

Абапал густа стаяць стромкія хвоі.

Угары гул нясьціхаючы, роўны, ціхі... А там, яшчэ вышэй, чыстае глыбокае неба. Дзе-ні-дзе праплыве кавалачак белай хмаркі пушыстай і зноў чысты, бязьмежны прастор.

У такую пору прыемна думаць аб жыцьці, хочацца жыць...

Між хвой два чырвонаармейцы канчаюць капаць яму. Капаюць моўчкі, сьпяшаючыся.

На другім канцы дарогі шэрагам стаіць узвод узброеных чырвонаармейцаў. Стаяць павольна. Перакідаюцца асобнымі словамі, больш маўчаць, кураць...

Зусім у баку, асобна, яшчэ двое чырвонаармейцаў з вінтоўкамі напагатове і між іх Павал Голуб, у шынэлі, бяз зброі... Маўчыць... Да балючасьці ўглядаецца кудысь у глыб лесу, хоць нічога там ня бачыць. Ён ведае, што для яго капаюць яму, што гэтыя, вось, чырвонаармейцы, з якімі ён разам ляжаў у акопах, будуць яго расстрэльваць, што хутка яго ў гэтай яме закапаюць, і тады ўсяму канец. Хацеў зразумець гэта, але нічога ня выходзіла... У думках была пустэча, у галаве і грудзёх, ад уяўленьня блізкае сьмерці, тупая балючасьць...

Таварышы на яго злосна пазіраюць: ён разумее завошта і не сярдуе на іх. Не глядзіць на іх, баіцца сустрэцца з поглядам суседа па акопу.

Каецца ў думках, што ўцякаў, мо' каб не баяўся і заставаўся тут, дык і жыў-бы, а так...

Угары плыве цягучы роўны гоман. Гулка стукае дзюбаю аб хвою дзяцел. Недзе далёка кукуе зязюля, ня сьціхае...

На вочы нагортваюцца сьлёзы... Голуб абцірае іх рукой... Вартавы бачыць гэта і адварочваецца ўбок...

Утыркнулі ў сьвежы пясок жалезьнякі чырвонаармейцы і адышлі. Нехта скамандаваў Голубуісьці да ямы. Ён падышоў, стаў тварам у бок ад таварышоў... Ужо ні аб чым ня было думак, быў толькі страх перад блізкай сьмерцю, які ўсё засланіў сабою, і тупая балючасьць ныла ва ўсім целе.

Калі камісар пачаў гаварыць чырвонаармейцам аб справе дэзэртыра Паўла Голуба, а потым чытаць пастанову Вайскова-рэвалюцыйнага трыбуналу, Голуб выпадкова глянуў сабе пад ногі на жоўты сыры пясок, яскрава ўявіў усё, што павінна адбыцца праз некалькі хвілін, і страх, яшчэ большы, як дагэтуль, заўладаў ім, скаваў усё цела. Захацелася крыкнуць таварышом аб сваёй здрадзе, кінуцца ім у ногі, прасіць літасьці, абяцаць да канца заставацца на фронце, але ногі нібы ўрасьлі ў зямлю, язык ня мог зварухнуцца, і толькі губы шапталі словы, чутныя толькі для самога сябе...

— «Братцы, братцы, я-ж не хацеў, я ня мог, мучыла мяне сьмерць»...

Ня сьціхае ўгары ціхі гоман. Ня сьціхае зязюля, кукуе камусьці доўгія годы.

Халоднымі цяжкімі кроплямі падаюць у мазгі словы прысуду.

Цяжэе тулава. Усё болей урастаюць у зямлю ногі. Страшны боль шчэміць галаву...

Чуў апошнія словы прыгавару, чуў злосныя словы таварышоў...

Але стаяў ужо, як спаралiжаваны. Толькі адчуваў, што на твары выступіў халодны пот.

Сьціхла... Пачулася кароткая каманда...

Хацелася ўзьняць вочы, глянуць на таварышоў, каб убачылі, каб зразумелі, што ён каецца, але галава, быццам налітыя волавам, ня ўздымаецца. Апушчаныя ўніз вочы бачаць перад сабой бліскучыя канцы цэлага шэрагу штыхоў. Пачуў апошнюю каманду.

Перад вачмі замітусіўся цёмны туман.

Нешта балюча стукнула па нагах, у грудзі. Узмахнуў рукой. З грудзей, з самае глыбіні, вырваўся і застыў на губах крык. А зямля, і хвоі, і чырвонаармейцы задрыжэлі, захісталіся, зьнiклі ў тумане.

Лістапад 1927 г.
Менск.

Б 46587

## ДАСУЖАЯ

— Ітту! Ітту! А божухна, бацюхна мой, і ў каго яна толькі ўдалася! Вось вырадак нейкі! Усюды лезе, усюды ёй трэба. Не пажывеш ты, Надзечка, доўга, скруціш галаву сваю звар'яцелую, скруціш... А маскруціш галаву сваю звар'яцелую, скруціш... А мачкі мае, галубачкі, што з яе будзе?.. Гэта-ж, бач, у крыві і рукі, і шчака. Дзе гэта ты, кажы?!

Надзя, утаропіўшы ў зямлю вочы, слухала дакоры мацеры і маўчала. Са шчакі ля вуха сачылася кроў, кроў была і на руцэ.

— Хадзі сюды, я завяжу руку! Вось коршак, вось драчун расьце, кіпцюрамі сваімі гатова горлаперадраць усім. Мо' білася з кім, а!

— Не.

— А дзе, як? Кажы, а то біць буду!

— Я не вінавата.

— Дзе абадралася, кажы?

— Аб елку.

— Аб елку, як гэта?

— З кургана, дзе елкі, стрэхі нейкія відаць, а я хацела бачыць усё далёка і палезла...

— Ну?

Надзя глянула на маці, на сьмяхотлівы твар суседкі і ціха сказала:

— Я ўпала.

— З елкі?

— Ага!

— А божачка-ж ты мой, ай, ай, ай! Мо' ўдарылася, баліць?

— Не.

— Што з яе будзе, што з яе толькі будзе. Вось дык ліха ўрадзілася на маю галаву! Маленькай была—усюды лазіла, так і сачы за ёй, а не, дык на печ узьлезе ды грымнецца адтуль, а то з плоту. А вырасла,—яшчэ горай! Ой дам, Надзя, дам, калі будзеш яшчэ лазіць! Прападзеш ты гэтак нізавошта, прападзеш... Бяжы ў хату, памыйся.

Надзя глянула на маці і, упэўненая, што яна тут больш не патрэбна, пабегла да раўчука.

— Во, бач, як бяжыць. Куды ты! Я табе!

— Спрытная дзеўка, маладзец! А то вунь у Палашкі нейкі цяльпук удаўся, дык ні павернецца, людзей баіцца. Ужо лепш дасужае мець, чым такое.

— Яно-то і праўда! Удалая дзеўка, мо' і выйдзе што, але-ж баюся я, баюся, што не дарасьце яна да тае пары, чуе нешта маё сэрцэйка.

І пачала маці апавядаць суседцы пра Надзю.

— ... І гэтак-жа кожны дзень! Ты ёй гэта скажы, гэта пакажы... А то ў лес пацягнецца вечарам адна, сядзе там і слухае, а потым пытае: «Чаго, мама, лес

так жаласна гудзе? чаго ноччу птушкі ў лесе паціху пераклікаюцца?» А адзін раз ля лесу, на поплаве, прылажыла вуха да зямлі, слухала доўга-доўга,—мы якраз сена грэблі ў той час, а потым і кажа: «Слухала я, мамачка, зямлю, стогне зямля, як хворы чалавек, цяжка стогне».—А то,—грэх мо' і казаць? як пачну я маліцца, дык яна і пытае:—«А ці бачыла ты, мамачка, сьвятых, чаму ты ім гаворыш, гаворыш, а яны ані слова табе?—А летась-жа—чуць не ўтапілася. Убачыла нейкую кветку ў рэчцы і палезла за ёй, кажа—ня бачыла я такой кветкі нідзе раней... Хто яе ведае, кумачка, што з ёй такое? Я і зарок тройцы давала, і на старцоў...

— Дасужая дзеўка, надта ўжо дасужая.

І ківае галавою суседка.

— Дасужая, гора мне з ёй!

— Затое, як вырасьце,—не прападзе, усюды знойдзе сваю сьцежку.

— Ці-ж вырасьце? Хіба выжыве такое? Кажуць-жа людзі, што ўсе дзеці разумныя ды дасужыя на сьмерць толькі раджаюцца.

— Крый божа, мала што кажуць людзі.

— Ды так, але хто-ж яго ведае, ці-ж угледзіш за ёй, такою, ці-ж утрымаеш у хаце!..

Яшчэ доўга стаялі суседкі, гаварылі пра Надзю, а яна сядзела на купіне ля раўчука, пазірала на пазалочаны край сіняй хмары, на заходзячае чырвонае сонца і жмурыла вочы, каб рассыпаць у іх сонца

тысячамі маленькіх іскраў, залаціць імі палявыя прасторы і лавіць іх рукамі, прыгаршчамі зьбіраць румяную пазалоту.

*

Цемра.

Беспрасьветная ноч. А ў цемры ночы, пануючай на зямлі, губіцца дзень за днём жыцьцё «Мачульскае». З дзён складаюцца тыдні, тыдні сплятаюцца ў месяцы, месяцы ў годы, і год за годам зьнікае ў цёмнай бяздоннасьці,— зьнікае нікому непатрэбнае жыцьцё мачулянцаў.

Хіба дасьледваў хто-небудзь і калі-небудзь нетры мачульскія, хіба мераў каштоўнасьць іх?

Сотні год стаяць на гэтым месцы хаты, зьнікаюць адны, зьяўляюцца новыя. У хатах сотні год жывуць людзі і таксама адны зьнікаюць, і таксама зьяўляюцца новыя. Колькі іх нарадзілася, колькі памерла? Хто ведае, колькі сярод іх талентаў, геніяў, колькі было ў іх творчай сілы? І колькі карысьці яны далі-б сьвету, каб адшукаць іх, каб даць ім прастор?

Каму і якое дзела да Мачулак? Ці-ж адны Мачулкі на сьвеце? Багата іх! І ў кожным гэтак—і ня год, ня два, а сотні год,—і ніхто ня прыйшоў, ня прыгледзеўся, каб зьмяніць што, перарабіць. А Мачулянцы самі ня ведаюць, як зрабіць лепшым жыцьцё сваё, бо такім яно і ў прадзедаў, і ў дзядоў іхных, бо такім самым жыцьцём жывуць і Пятровічы, і Камянка,

і Старцы—і скрозь цемра, і скрозь ноч беспрасьветная...

Хаты мачульскія зімамі сьнегам занесены, не пратоптаны да іх сьцежкі, не праежджаны дарогі... Недзе далёкія людзі думаюць, што ў Мачулках жыве неразумны народ, бяз таленту, створаны толькі для таго, каб працаваць і працаваць...

І жыцьцё ішло па-старому...

Язэп жыў, як і другія. Розьніца крыху толькі ў тым, што дзяцей у яго было багата, а хлеба мала, было каму пасьвіць сьвіней і кароў, было каго аддаваць у парабкі... З гэтай прычыны і аддаў Язэп Надзю вясною ў Пятровічы, у пастушкі; але зімою, каб не спрачацца з настаўнікам, бо той вельмі раіў, пакінуў яе ў школе.

Першыя дні цесна было Надзі ў вучылішчы, малымі здаваліся пакоі школьныя пасьля лясных прастораў. Потым пазнаёмілася яна з шафай настаўніка, блізка спазналася з кніжкамі і маленькімі крокамі-старонкамі пайшла ў новыя далі, што расчыніліся перад ёю, недасяжныя, вабныя...

У Пятровіцкай школе вучылася Надзя тры зімы. На чацьвертую сьнягі замялі ўсе дарогі—усё далей і далей адплывала мільгануўшая будучыня. Чацьвертай зімою плакала Надзя вечарамі за прасьніцай, прасіла бацьку, каб адвёз у Глуск, у вучылішча, а пятай зімою—прыбірала пакоі настаўніцы і за гэта вучылася.

Цяжка было.

Але што значыць цяжка у параўнаньні з тым, што яна пазнала і яшчэ пазнае ў школе? І за ўсім,—і за цяжкай працай, ад якой ныла сярэдзіна, і за кпінамі другіх дзяцей над ёю,—бачыла Надзя далі прыгожыя.

Надзеі! Мары! Колькі часу аддае ім чалавек у сваім жыцьці? Жыцьцё чалавечае—гэта вечныя надзеі, мары; гэта імкненьне наперад і наперад, ад учарайшага да заўтрашняга, ад старога да новага, ад горшага да лепшага. Надзеі і мэта, да якой імкнецца чалавек, прымушаюць яго напрудзіць усе сілы, усю энэргію, каб толькі зрабіць так, як яму хочацца. Надзеі! Цяжка жыць з разьбітымі надзеямі...

Язэп прадаў цялушку, завязаў новенькія паперкі ў ражок хустачкі і павёз Надзю ў горад за сорак вёрст, каб аддаць вучыцца ў настаўніцкую сэмінарыю. Больш некуды! Хтосьці сказаў, што ў сэмінарыю прымуць, што там будуць вучыць за кошт казны. Надзя ўзяла з сабой у сэмінарыю ліст ад настаўнікаў Глускай школы з просьбай прыняць яе. Ехала, спадзяючыся, што прымуць, што будзе вучыцца.

У сэмінарыі ў Надзі зарадзілася нейкая трывога. Пахадзіла, паглядзела наўкола, на людзей і нешта нядобрае пачало гаварыць сэрца.

Зранку на другі дзень прыезду яе агледзеў доктар, а ў поўдзень трэба было трымаць залікі.

Невялікі пакой, са сьценамі абвешанымі портрэтамі сьвятых і цароў, людзі за сталом пекна прыбраныя, увешаныя мэдалямі,—усё гэта адразу няпрыветліва

спаткала Надзю, зьдзівіла яе... Тады і надзеі, учора яшчэ зусім яскрава бачаныя, пачалі хавацца за туманамі...—вось-вось зьнікнуць...

Доўга яна стаяла каля стала, даўга яе распытвалі, экзаменавалі. Пыталі пра веды кніжныя і пыталі аб тым, што робіць бацька, колькі мае зямлі, ці спраўна плаціць падаткі. Поп з залатым крыжам і мэдалямі доўга разглядаў яе паперы і настаўніцкі ліст.

За Надзеяй у пакой заходзілі другія. Яна да вечара хадзіла ў калідоры, усё чакала, што скажуць. Зноў усплыла надзея прыгожая і павяла яе ў марах за сабою. Чакала яшчэ дзень. Потым яе зноў паклікалі ў пакой і той-жа самы поп з мэдалямі, угледзеўшыся ў яе, сказаў.

— Вы ня прыняты, ня можаце быць прыняты, бо ў вас... што ў яе доктар?

Доктар парыўся ў паперах.

— Малакроўе ў яе, айцец.

— Та-ак. У вас малакроўе, а мы толькі здаровых прымаем. Ідзеце...

Як цяжка жыць з разьбітымі надзеямі!

Бывае так:

Атрымаеце вы ліст ад блізкага, дарагога чалавека, у якім ён піша, што зусім здаровы і просіць вас прыехаць да яго. Вы едзеце. Вы ўпэўнены, што ўбачыце чалавека, якога любіце, спатканьня з якім так доўга чакалі. Вы ўяўляеце яго твар, погляд, яго ўсьмешку, рухі, ён як жывы перад вамі, а потым, калі вы прыехалі, на месцы вас сустракае другая вестка,

што гэты чалавек нечакана захварэў, памёр. Гэта сьмерць—факт, але вам ня хочацца верыць у сапраўднасьць гэтага факту, вы ня можаце ўявіць сабе мёртвым чалавека, аб спатканьні з якім толькі-што марылі, вы ня можаце зразумець такога капрызу жыцьця, ня хочаце прымірыцца з ім.

Надзя ехала ў горад упэўненая, што яе прымуць у сэмінарыю. За яе—настаўнікі Глускія, за яе—здольнасьці асабістыя, за яе—жаданьне вучыцца. А тут гэтыя словы,—«вы ня прыняты». Яна не паверыла адразу словам, перапытала. Ёй не адказалі наваг і, стоячы на месцы, яна аслупянела на момант, а перад вачыма ўсё задрыжэла, пачало расплывацца туманам.

«Ехаць назад? Як-жа гэта? Бяз нічога назад і толькі таму, што доктар сказаў, што ў мяне малакроўе. А мо' і ня толькі таму? Але як-жа назад, чаму няма дарогі ўперад? Што-ж дома скажуць, тата-ж цялушку прадаў».

Няма дарогі далей, а перад вачыма прорва бязданная, цёмная... Па дарозе дадому адна толькі думка без перапынку зьвівалася ў клубок, усё цяжэйшы і цяжэйшы.

«Назад, больш мне ходу няма, усё дарэмна прапала». Дома ўсё па-старому. Толькі бацька маўклівей зрабіўся і хадзіў ціхі, смутны. Маці вечарамі за прасьніцай ціха плакала аб праданай цялушцы, аб нешчасьлівай долі дачкі.

Дома ціха чуць-чуць краталася жыцьцё. Прапаўзалі адзін за другім вечары зімовыя, з імі разам між

пальцаў бегла бесконца нітка кужэльная, намотвалася радкамі на шпулю, а вакол сэрца намотваўся смутак ціхі, нікому нявыказаны, балючы... Думкі роіліся ў галаве, краталі сэрца пачуцьцямі рознымі, жаданьнямі, шукалі выйсьця жаданьні і, не знаходзячы, больш ціснулі сэрца.

За вокнамі вечарамі зімовымі плакалі мяцеліцы, ня відаць было за сьнегавымі хмарамі сьцежак, дарог. Нехта злосны, страшны хадзіў у полі, па вуліцы, слухаў пад вокнамі, бразгаў трывожна вакяніцамі... і здавалася, што ніколі-ніколі ня будзе канца зіме, мяцеліцы...

Надзя слухала мяцеліцу, слухала думы свае, чакала, глядзела, а мо' блісьне промень надзеі, і ня бачыла...

Плакалі мяцеліцы, густа сыпалі сьнегам, засыпалі нізенькія хаткі Мачульскія. Нараджаліся ў Надзі думкі адна за другой і зьнікалі. Праходзілі дні, запоўненыя марамі, жаданьнямі, падзеямі і толькі павялічвалі сум мінулага, пражытага...

*

Прыйшлі дзіўныя дні.

Сотні год не мяняўся зьмест жыцьця мачулянцаў, ні разу раней ня бачылі мачулянцы такіх дзён, ня чулі панават. Жылі па-свойму: хлебам, зямлёй, працай, падаткамі. І ўсе думкі іх, усе гутаркі, усе надзеі, усе жаданьні былі пераплецены з разуменьнямі—хлеб, зямля, праца, падаткі. І цераз хлеб, цераз зямлю, цераз працу і падаткі былі яны трохі зьвязаны з

другім жыцьцём, далёкім—гарадзкім. Але горад жыў па-свойму, а Мачулкі па-свойму, здавалася, што адны другога надта мала цікавяць. А недзе праз хлеб, праз зямлю, праз працу, праз падаткі каваўся моцны ланцуг, нябачны, але зьвязваючы ўсё мацней і мацней Мачулкі з далёкім горадам.

У адну, з многіх—шмат пережытых, восеняй пачулі мачулянцы новыя словы, убачылі новых людзей і па-новаму, зусім па-другому загаварылі аб хлебе, аб зямлі, аб працы, аб падатках. Гукнуў па-новаму горад, і на гэта рэхам адгукнуліся загубленыя ў полі, сярод лясоў Мачулкі.

Пачалося нешта другое ў жыцьці Мачулак.

Кожны дзень нёс новыя словы, новыя весткі. Прагналі цара, скончылася вайна, пачалася вайна другая, новая, пачаліся ў горадзе дні, жорсткія, галодныя... Горад здалёку заклікаў на дапамогу, прасіў, патрабаваў, браў дапамогу... У Мачулках—адны адгукнуліся і пайшлі за горадам, другія, напруджаныя—чакалі, што будзе, а трэція—з хат пайшлі ў лес, у кусты зялёныя прыдарожныя, пачалі падпільноўваць новых людзей.

«Не парушай таго, што вякамі збудавана»,—шаптала ў кустох нешта страшнае і паўзло па лесе, кроўю сьляды свае замывала.

Надзя з першых дзён, як толькі дайшлі да Мачулак словы гораду, пачула ў іх нешта сваё, нешта роднае, блізкае Мачулкам, і пачала жыць новым, прынесеным з гораду людзьмі ў шынэлях, з вінтоўкамі... Хаваю-

чыся ад бацькоў, яна, разам з другімі ў мястэчку, зрабілася комсамолкай і пачала гарэць новым, дагэтуль невядомым ёй.

— А божа-ж мой, божа-ж мой, што толькі яна сабе бандумае, гэтая дзеўка, што толькі думае? Наўкола бандыты, прайсьці нельга, а яна дзень-у-дзень у мястэчка ляціць, у такую даль, і нічога ня кажа. Хоць-бы ж ты спытаў яе, хоць-бы ж ты пакрычаў на яе.

Мучылася трывожнымі думкамі маці.

— Хоць-бы ж ты накрычаў на яе, настрашыў...

— Крычы,—яна мо' вучыцца надумалася, кажуцьжа вунь, што зараз вучыць дарам будуць.

— Куды вучыцца? Чаму-ж слова ніводнага ня кажа? Тады хацела ў горад паехаць, праз яе страціліся, дык, мусіць, і ня хоча зараз казаць нічога... ходзіць, кніжкі нейкія носіць, газэты, хто яе ведае. Ды ў такую пару, па такой дарозе! А калі-ж гэта ўбачаць,—дык ведае бог адзін, што могуць з ёй зрабіць за газэты. Хіба мала пабілі?.. Якою малая была, такой і цяпер засталася. Усё ёй цесна, усё ёй мала, усё чагосьці хочацца! Вось сядзела-б дома, як равесьніцы, дый усё. Хіба можна пра што ў такія часы думаць, нават пра вучэньне. Хто ведае, што яшчэ з гэтага будзе ўсяго... Б'юць, рэжуць, страляюць. Есьці людзям няма чаго, бульбачцы рады... Дзе ўжо тут шукаць лепшага? Чакай, пакуль пярэйдзе ліха гэтае, тады ўжо... А яна, сама ня ведаю, што за дзеўка! Маўклівая зрабілася, не загаворыць ні аб чым... У поле пойдзе, дык песьняй заліваецца, а ў хаце зноў маўчыць... Я ўжо і людзей

пытала і да самой Уліткі хадзіла,—мо' хворая, ці што? Гэта-ж,—вазьмі равесьніц яе,—дык дзеўкі, як дзеўкі, а яна вырадкам нейкім, а ня дзеўкай выдалася.

І з трывожнымі думкамі матка ішла на сяло на дарогу, каб сустрэць Надзю.

«Што з яе толькі будзе, чаго яна сабе шукае, чаму ня ўрымсьціцца дома, чаго ёй трэба? Каб-жа работы ня ўмела рабіць, ці каб хворая, а то золата—рукі, агнём работа гарыць, а вось не хапае нечага ёй, шукае чагось...».

Надзя вечарамі раз у тыдзень, пасьля цяжкай працы, ішла ў мястэчка на сход комсамольскі, а мацеры гаварыла, што да таварышак на гулянкі ходзіць. У нядзелю кожную з самага раньня да позьняе ночы праводзіла час у вёсках і жыла гарачымі словамі аб тым, што патрэбна даць хлеба фронту, галадаючым. З хаты да хаты, па чужых незнаёмых вёсках хадзіла яна з другімі комсамольцамі. І ў мяшок, пасьля палкіх Надзіных слоў, сыпалі бабы вясковыя гарцамі жыта, ячмень, бульбу. З жартамі зьбірала яна ў сялян для фронту цэлыя вязкі лапцей. З непатухаючым ніколі ў вачох агоньчыкам гаварыла на сходах сялянскіх аб разьвёрстцы, слухала злосныя крыкі мужчын насупроць і сама крычала так, каб перакрычаць іх, і разьвёрстку зьбіралі. Ад хаты да хаты хадзіла, перапісвала коняй, калёсы і ўпрашвала, выганяла сялян у лес, каб падвезьці да станцыі ў трохтыднёвік апалу патрэбныя дровы.

І няпрыкметна ў рабоце праходзілі дні, няпрыкметна засталіся ў пражытым два з паловай гады. У жыцьці

БССР · Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

пачыналася новае. Надзі самой захацелася пачаць жыць па-новаму.

Да гэтага—уражаньні ад Мачулак, мястэчка. У мястэчку густа налепленыя, лапленыя хаткі, нахіленыя набок, з абросшымі мохам стрэхамі. У хатах шыбы забіты лубкамі, дошчачкамі, запханы рызьзём, а то і цэлыя вокны забіты дошкамі. Над дзьвярыма хат аблезлыя, паіржавеўшыя шыльды на адным гвазду вісяць, ад ветру хістаюцца і жалобна-іржава зьвіняць, стукаючы аб сьцену.

Там, дзе монополька была—рамы зусім выламлены, нехта забраў іх на лучыну, а ў сярэдзіне—прылавак абернуты, абломленыя паліцы. Усе крамы з забітымі вокнамі, пахмурнелыя, маўклівыя, а з вакон незабітых—з кватэр, на вуліцу глядзяць пужлівыя вочы, рукі трывожна перабіраюць пальцамі валасы барод.

Даўнейшая папова лазьня цяпер перароблена на хату і жыве ў ёй сам поп, бо выселілі яго комсамольцы з пакояў у лазьню, а ў пакоях разьмясьцілася школа (стала цесна школе ў былым будынку). І тут аконныя шыбы дзе-ні-дзе лубком забіты, абарваныя вакяніцы на іржавых завесах пішчаць, пахіліўся набок дзіравы плот. Побач быўшае «волостное правление», зараз—валасны выканком. На выканкоме палінялы чырвоны сьцяг. Выканком і школа аддзялілі папа ад царквы і царква, засаромеўшыся нібы, прынізілася за таполямі і бярозамі, схавала тры аблезлыя свае купалы.

У быўшым папоўскім доме цяпер займае пакой комсамольская ячэйка. Самы жывы, вечна гаманлівы па-

кой. Небагата комсамольцаў у ячэйцы: тры дзяўчыны ды сямёра хлапцоў. Надзя сакратаром ячэйкі.

Склікала бюро. Сама за сталом сарамліва тупіць вочы ўніз, з-за хваляваньня гаварыць ня можа, а ў вачох агоньчык знаёмы: дадумалася—зробіць!

— Не магу жыць я дома, хутка даведаюцца аб усім бацькі, жыць не дадуць. Я ліст з Укомолу атрымала, на рабфак абяцаюць паслаць, а ў мяне няма з чым... Дома я прасіць ня буду ў бацькоў ні капейкі, а паехаць няма як. Хоць-бы на чыгунку, а да гораду я і пехатою дайду.

— Вучыцца, а ячэйка як?

— А ў ячэйцы Хведзька сакратаром будзе.

— Трэба як-небудзь сабрацца ды дапамагчы. Надзя ў нас з першых,—сама ячэйку арганізоўвала і вучыцца ёй першай трэба.

— Дык як-жа зрабіць?

— Як хочаце, але зрабеце. Я адно толькі кажу, пакуль хавалася ад бацькоў, пакуль ня ведалі, што я ў комсамоле, датуль было ціха, а зараз сэрца пачнуць ад'ядаць, кпіны, дакоры, лаянка,—зусім загрызуць. Мне яны і капейкі не дадуць, самі гэта ведаеце, і прасіць у іх я ня буду. Дапаможаце чым,—добра, а не— дык пехатою пайду і да Менску, ног можа хопіць.

— Пехатою ня пойдзеш, зьбярэм грошы. Спэктакль, хлопцы, паставім і будуць на дарогу грошы.

— Спэктакль, а інакш не зьбярэш. Усе мы надта багатыя!

— Спэктаклем зьбярэм, а ты з дому толькі вырвіся.

— Вырвуся, не затрымаюць, ня іх справа.

У гэты момант у Надзі было—адно жаданьне, адно імкненьне—пайсьці ў новыя далі, уперад, аб чым марыла калісь. Вусны ў тахт са стукам сэрца шапталі такія зразумелыя зараз словы: «Гэй, наперад, покі сэрца б'еццa, рвецца на прастор! Гэй, да сонца, гэй, да зор!». І перад вачмі яскрава ўсплывалі прасторы недалёкае будучыні, асьветленай сонцам навукі, цудоўныя далёкія зоры.

— Паеду.

— Вырвіся, а мы падтрымаем.

І калі зьмярканьне завалакло местачковую вуліцу цёмнай шэраньню, выйшла Надзя з ячэйкавага пакою і, забыўшыся пра блізкую ноч і пра бандытаў, доўга стаяла ў лесе, зачарованая гоманам хвойным, слухала яго нібы ў апошні ўжо раз і пад гоман гэты ў думках сьпявала, нейкую новую для яе самой, песьню. Нараджалася і расло жаданьне зьліцца з гоманам хвойным і разам з ветрам, што гамоніць у верхавінах хвойных, імкнуцца і імкнуцца без канца туды, дзе невядомы яшчэ новы горад, дзе рабфак...

*

У жыцьці Надзіным пачыналася вясна. З жаданьнем аб вучобе нарадзілася новая сіла, і ўжо ніякая другая сіла не магла задушыць жаданьня вучыцца, спыніць Надзю ў яе імкненьні да вучобы. Думку аб вучобе яна вынасіла ў сэрцы сваім затаёна, не гаворачы

нікому з тых часоў, як пакінула школу калісь у мястэчку і да сёнешніх дзён. І цяпер жыла толькі гэтаю думкаю.

З вечара ў Язэпавай хаце доўга гарэў на комінку корч. Даўно ўжо спала сям'я, а Надзя на заслончыку пераглядала бялізну сваю, вопратку, лапіла, дзе трэба, і складала ў адзін клунак, каб заўтра з самага раньня быць гатовай у далёкую дарогу рабфакаўскую.

Лягла яна позна, але ня спалася... Дый хіба магла яна спаць у такі час, калі ведала, што заўтра едзе ў дарогу, што заўтра дасягне тае мэты, да якой столькі імкнулася.

Ляжыць на ложку Надзя, жмурыць вочы, успамінае, як ехала з такім вось самым жаданьнем, з такой надзеяй у сэмінарыю і таксама ўпэўнена была тады, што будзе вучыцца; успамінае, як балюча, крыўдна было варочацца дамоў, але зараз ня было, як тады, трывожнай думкі, а была цьвёрдая ўпэўненасьць—паеду і буду вучыцца.

Спрабавала задаць сабе пытаньне: а што, калі і зараз ня прымуць, як тады? І на гэта пытаньне ўсплываў гатовы адказ: «Не, так ня можа быць зараз, ня тыя часы. Не малакроўная я. Магу працаваць, значыць, і вучыцца здолею. Не паеду назад, што-б ні здарылася! Цяпер ня тыя часы, ня тыя, ня тыя»...

І ўжо ўяўляла сябе ў цягніку, потым у нейкім незнаёмым вялізным пакоі сярод незнаёмых людзей, і ад уяўленьня захаплялася радасьцю, нязнанай да гэтага.

Даўно перасьпявалі пэўні. Ад надышоўшага раньня пасьвятлела ў хаце. Заварушылася на ложку маці, устае.

«Трэба ўставаць. Скажу, што еду, разьвітаюся і пайду».

Пачаў уставаць і бацька.

Надзя хуценька ўзьнялася, апранулася. Рабіла ўсё моўчкі. Моўчкі завіхалася маці ля печы, зьдзіўлена пазірала на клунак, на Надзю, мерылася спытаць нешта. Бацька хмурны ціха ладзіў хамут.

Усім хацелася загаварыць, і ўсе, пакуль-што, маўчалі, чакалі, хто першы пачне.

— Ці ёсьць, мама, сала яшчэ, я на дарогу ўзяць хачу.

— На дарогу? Куды-ж гэта ты?

— Я сёньня еду ў Менск, вучыцца.

У мацеры левая рука мэханічна адшукала ў камешніку ёмку, патрымала і паставіла зноў. Бацька адклаў хамут ад сябе і ня крануўся з месца. Разам запыталі.

— Чаму-ж раней нічога не казала?

— А што казаць яшчэ, хіба ня ведалі, што хочу вучыцца?

— Ведалі. Хто ведаў? Ты-ж, як мармоль той, ходзіш, дома ні слова. Куды гэта ты паедзеш у такі час, прапасьці?

— Пачакала-б трохі...

— Годзе чакаць, насядзелася дома. Можна ехаць зараз, дык і еду, не прападу, цэла буду.

Бацька ўстаў з лаўкі, парываўся нешта казаць, але язык не варочаўся. Маці пачала няўпэўнена адгаварваць.

— Хоць-бы ж ты пачакала трохі, мо' ў мястэчка зьездзілі-б, грошай-бы далі.

— Некалі чакаць, ужо і так позна. А грошы ня трэба, заеду, не прападу, не маленькая.

Нэрвуючыся, завязала клунак, апранулася, як у дарогу. Бацька нярухома стаяў на адным месцы.

— У такую пару ехаць! Прапасьці! Голад-жа, грошай няма... Куды гэта ты надумалася? Ня пушчу, не паедзеш ты нікуды!..

— Вучыцца паеду, сказала раз і годзе, не маленькая.

Узяла клунак у рукі, падышла да мацеры.

— Дык іду я, разьвітаймася, мама.

Маці абхапіла за шыю, заплакала, запрычытала...

— Пачакала-б, дачушка, хоць трохі яшчэ, куды-ж гэта ў людзі пойдзеш адна, як кол, голая. Прападзеш, застанься...

— Не паедзе яна нікуды, бацькоў ня пытала...

Падышла да бацькі.

— Не паедзеш, кажу, я, сядзі дома, пасьпееш яшчэ!

Голас нерашучы, дрыжачы...

Моўчкі глянула на бацьку, пакланілася і пайшла з хаты.

— Сказала, еду—значыць еду, не затрымаеце сілай. Няма чаго чакаць, седзячы дома.

*

У памяшканьні павятовага АНА цесна, душна ад людзей. Адны моўчкі ля стала стаяць і вачмі памутнелымі сочаць за паперамі, што пераходзяць са стала на стол... Другія, млявыя ад духаты, сядзяць на лаўках, або бяз усякага сэнсу ходзяць узад і ўперад па цесным пакоі.

Надзя з клункам падышла да стала, падала паперы. Як давала паперы, заўважыла на сабе ўважлівы погляд мужчыны. Апрануты ў чорнае, на шапцы значок нейкі.

— Дайце мне камандыроўку ў рабфак. Уком пасылае,—вось дакуманты.

Узяў дакуманты, пагортаў, падумаў.

— Праз гадзіну зойдзеце атрымаць.

Каб не чакаць дарэмна цэлую гадзіну, пайшла на станцыю даведацца, колькі каштуе білет. Па дарозе разгарнула пачку тысяч, пералічыла. На вакзале, паміж сьпячых на падлозе, прайшла да касы, пастукала ў акенца.

— Колькі білет да Менску?

— 29 тысяч.

— 29 тысяч?!

І адышла. Бяз слова, ні на кога ня гледзячы, выйшла на вуліцу.

«Дык як-жа гэта, дзе-ж узяць чатыры тысячы?».

Калі адышла за двор вакзальны, успомніла, што час ужо ісьці за дакумантамі. Парашыла ў АНА папрасіць і грошай.

У памяшканьні АНА было гэтак сама цесна, душна. На лаўцы сядзеў той, з значком. Надзя ціха падышла да стала, і калі ўзяла ў руку дакуманты, ціха, каб ня чулі другія, запытала:

— Я прашу дапамогі чатыры тысячы. Мне ячэйка 25 тысяч сабрала, а білет 29 каштуе. Я прашу вас дапамагчы.

Паківаў галавой.

— Няма. Ня можам даць. Наступны хто?

— Дык як-жа будзе? Таварыш, я-ж не магу паехаць. Сваіх я ня мела, мне ячэйка сабрала 25 тысяч, а прашу ўсяго чатыры. Не магу-ж я з-за гэтага назад ісьці за сорак вёрст.

— Хоць і адну прасеце, дык няма. Ня можам даць.

Адвярнуўся, пачаў гаварыць з другімі.

— Таварыш, я прашу, зразумейце...

— Не, не, не, магу, ня ведаю ~~я ведаю~~ я нічога.

Яшчэ некалькі сэкунд стаяла на месцы. На яе ўважліва глядзеў той самы мужчына са значком. Яна сьціснула ў жмені нязгорнутыя дакуманты, адышла да дзьвярэй, але спынілася. Мужчына са значком падняўся з лаўкі, падышоў, пачаў пытацца, куды едзе, чаго, ласкава загаварыў.

— Я сам у Маскве вучуся, калега, значыцца. Вучуся і служу, інакш не пражыць студэнту... Вам усёроўна, дзе вучыцца,—у Маскве ці ў Менску. Без знаёмых, без дапамогі вам не пражыць, а ў нас адна сям'я, мы прымем вас у колектыў студэнцкі, едзьце з намі. Я памагу купіць білет і там здолею памагаць,

я многа зарабляю, лічыцца ня будзем.

Не саромцеся.

Надзя пазірала на яго, нічога не разумеючы, ня ведала, што адказваць, дзякавала. А ён не адставаў.

— Вы падумайце, у чужы горад, ні аднае душы знаёмых з студэнтаў, бяз хлеба, без кватэры. А ў Маскве мы, як землякі, жыць будзем, дапаможам усім колектывам.

— Дзякую. Я ня ведаю яшчэ, ці ехаць куды наогул. У Менск я камандыроўку ўзяла.

— Гэта ня важна, мы зробім. Вы з вячэрнім?

— З вячэрнім.

— Я буду чакаць вас, падумайце. З землякамі разам не прападзеце.

— Дзякую.

І не магла зразумець, чаго ён такі добры, чаму, першы раз бачачы яе, прапануе ехаць разам, абяцае дапамогу. Гэта зьдзівіла яе. Каб не стаяць больш, выйшла на двор. За дзьвярыма падышоў да яе другі, у скураной тужурцы.

— Вы вучыцца едзеце? Я стаяў пабоч, як вы прасілі надарогу. Даць яны ня могуць, многія просяць. Вось вазьмеце ў мяне чатыры тысячы.

Гаварыў проста, шчыра, але і гэтыя словы зьдзівілі яе.

— Навошта,—дзякую. Я з дому як-небудзь дастану або ў знаёмых.

— Не дастанеце дома, калі ячэйка зьбірала дапамогу, не адмаўляйцеся. Вазьмеце, на такое дзела, як

вучыцца, ня трэба саромецца, а ў мяне грошы ёсьць, я на заводзе працую. Сам быў у такіх пераплётах, ведаю.

Усьміхнуўся простай добрай усьмешкай, і Надзя ўзяла грошы, падзякавала. А ён нібы засаромеўся, што мала даў.

— Няма за што дзякаваць. Каб чужы хто памог, а я свой чалавек, рабочы—сам усё гэта ведаю, езьдзіў па сьвету. Дый колькі тут грошай... Заедзеце, вучэцеся добра.

Разьвіталіся. Яшчэ раз падзякавала Надзя.

Падыходзячы да вакзалу, заўважыла ідучага насустрач мужчыну са значком. На твары ветлівая ўсьмешка.

— Ну што, надумалі? Паедзем? Ведаеце, я сам аб гэтым яшчэ думаў. Вы можа пужаецеся? ці саромецеся? Гэта глупства. Я ўжо ўсё абдумаў. Пакуль знойдзем вам работу, я памагу і будзеце вучыцца і жыць. Сам я гэта ўжо ўсё перажыў і прапаную, як колегу свайму. Паедзем? Але?

— Дзякую, не магу я гэтага зрабіць, я парашыла ў Менск ехаць.

— Шкода, вельмі шкода, а я гэтак быў-бы рады. Усё-ж землякі.

— Дзякую.

Адвярнуўся і, пацыху пасьвістваючы, адышоў. Ужо выправіўшыся, пачула за сабой яго словы.

— Вось дурніца нейкая,—не разумее!..

*

Зыкнуў, бразнуў стальлю-чыгуном цягнік, уздрыгануў ад натугі, рушыўся, і паплылі насустрач поле, лес, хмары, слупы, зьвязаныя дротам. Пацiху дрыжэў вагон, наганяў дрымоту, нараджаў нейкі, невядомы да гэтага настрой, пачуцьцё поўнага адзіноцтва. Надзя прыліпла да шыбы вагоннага акна, твар рукамі падперла і, гледзячы, як беглі насустрач лес, слупы, як плыла назад зямля, хацела адгадаць, што будзе з ёю заўтра. Пад вагонам ціха гаманілі колы з рэйкамі, і ў гамонцы іхняя чула Надзя нешта бадзёрачае, абнадзейваючае.

Доўга сядзела так, не адрываючыся ад акна, нішто не парушала яе напружанага ўзьнятага настрою.

На другой лаве, насупроць Надзі, сядзіць дзяўчына яе год, хусткай галаву абматала, абапёрлася на клунак локцем і таксама праз акно сочыць вачмі за ўсім, што бяжыць насустрач, і за Надзяй сочыць. Надзі хочацца зачапіць яе, хочацца падзяліцца з ёю радасьцю.

— Вы далёка куды едзеце?

— У Менск. На рабфаку вучуся там. Была дома лета, а зараз на заняткі.

— А я таксама на рабфак, паступаць.

— Позна-ж ужо.

— Я не магла раней. А мо' прымуць, я так хацела ехаць.

І паліліся словы аб мінулым, хатнім, як нарадзілася жаданьне вучыцца, як паехала. Гаварылі абедзьве аб адным. У абедзьвюх так багата агульнага. Усё выка-

залі дружка дружцы. Яшчэ гадзіну таму назад незнаёмыя яны зараз адчулі ў сабе блізкіх прыяцёлак, адна аб другой усё ўжо ведалі.

— Мяне называюць Жэняй.

— А мяне Надзя.

Нясьціхаючыся ручайкам льлюцца словы цёплыя, блізкія, знаёмыя... У абедзьвюх аднолькавае жыцьцё дома, адны жаданьні, імкненьні, надзеі.

— У нас ня было ячэйкі, не ўвайшла яшчэ ў комсамол і ў Менску, бо мяне яшчэ мала ведаюць.

— Табе трэба быць комсамолкай, гэта наша, сваё.

— Паступлю гэтай зімой.

Ужо блізка Менск, апошнюю станцыю праехалі. Зьмяркаецца.

— У цябе ёсьць хто ў Менску?

— Нікога няма. Ня ведаю я, куды зайсьці сёньня, начаваць дзе.

— Ты аб гэтым і не кажы, Надзя, у мяне цётка ёсьць, я на кватэры ў яе, заедзем і будзем спаць.

— А ці-ж прыемна ёй будзе гэта:

— А што ёй? Хопіць месца.

— Яно так, але ці знайду я сабе хутка кватэру? Вось чаго баюся.

— Знойдзеш. Прымуць—і ў інтэрнат, а да гэтага разам будзем.

Выйшлі з цягніка. Праціскаючыся, выйшлі на вуліцу. Камень, камень і камень усюды. Цёмныя дамы-грамадзіны з бакоў вуліцы, цёмная і сама вуліца, міргае лямпачкамі-газьнічкамі са сьцен хатніх. У Надзі

сэрца сьціснулася ў маленькі камячок, пужліва стукае ў грудзёх, і сама яна адчувае сябе камячком маленькім, няпрыкметным. І ў Жэні так.

— Ужо трэці раз прыяджаю сюды, а як зьлезу з цягніка, увайду сюды, дык і здаецца, што вось-вось нешта расьцісьне мяне.

— І мне страшна...

«Мо' і мяне расьцісьне тут, хто ведае. На рызыску я паехала сюды адна, без усяго. Ці-ж я здолею пражыць?

...Страшна, ня ведаю чаму так. Я ніколі нідзе ня была».

Цётка Жэні мела ў горадзе краму, распачынала гандаль, жыла багата. Жэню спаткала проста, потым зьдзіўлена зірнула, як-бы поглядам спытала.

— А гэта хто такая?

— Гэта таварышка мая, паступаць прыехала.

Цётка працягнула Надзі пальцы, глянула на яе яшчэ раз і сказала расьцягнута, нібы так сабе:

— Паначуйце... хутка вы вельмі здружыліся...

А ў Надзі ад слоў гэтых і ад погляду цёткі адразу ў камячок згарнулася радасьць, нарадзілася жаданьне ўцячы адсюль.

Спалі абедзьве на адным ложку. Пасьля дарогі спалася добра, і прачнулася Надзя толькі тады, як застукалі за сьцяною талеркамі і пачулася гамонка.

— Жэня прыехала?

— І сяброўку з сабой прывезла. Добра, што сама жыве, дык яшчэ і сябровак пачынае вазіць. У мяне не заежджы дом, трэба ведаць гэта.

Надзя чула гэтыя словы, і крыўда вялікая поўніла сэрца. У галаве пасьпявала думка.

«Устану, апрануся і пайду адсюль, мо' знайду дзе начаваць».

А як напілася гарбаты, Надзя узьдзела на руку клунак.

— Навошта ты бярэш яго? Хай ляжыць, начаваць-жа тут усёроўна будзем.

— Не, я да знаёмых студэнтаў зайду (зманіла). Дзякую за кватэру.

Зноў гаспадыня падала пальцы пры разьвітаньні. Жэня выйшла правесьці.

— Навошта ты клунак узяла? З ім будзеш хадзіць?

— Нічога. Я адразу да знаёмых. У вас нельга начаваць, навошта турбаваць цётку.

— А якія такія гэта турботы? Хата цэла будзе. Ці мала ў нас дома людзей начуе? Прыходзь і жыві.

— Гэта дома, а ў горадзе людзі ня тыя, цесна тут. Я ў знаёмых студэнтаў пераначую, пакуль інтэрнат дадуць. Падзякуй цётцы за кватэру, а то ня было-б дзе і прытуліцца ноччу.

*

У канцылярыі рабфаку Надзі сказалі.

— Вы надта спазьніліся, усе месцы запоўнены. Але схадзеце да дэкана рабфаку, да прафэсара, пагаварэце з ім.

Моўчкі выслухала, ні слова ня кажучы, выйшла. Болем сьціскала галаву думка.

«З дому чуць вырвалася, грашмі ячэйка дапамагла, усё, каб вучыцца, а тут позна. Што-ж тады, як ня прымуць? Без кватэры, без капейкі грошай».

Назаўтра дэкан рабфаку, стары профэсар, уважліва выслухаў.

— Думаеце, адна вы. Многа хто так едуць, шмат ужо прынялі. А вы вельмі позна, хоць-бы трохі раней, тады-б... А то вельмі позна. Ня можам прыняць, вы ня здолееце дагнаць курсу. Пачакайце да наступнага году.

У Надзі вакол сэрца намотвалася і крыўда, і злосьць.

— Пачакаць? А вы ведаеце, як лёгка мне гэта зрабіць, як лёгка было вырвацца з дому? Чаму аб гэтым ня пытаеце? Раней я не магла вучыцца, а зараз рабфакі для нас збудованы, я павінна вучыцца ў рабфаку, а не чакаць.

— Ведаю, што рабфак для вас, таварыш, вы будзеце вучыцца ў ім, але позна ў гэтым годзе, нельга прыняць.

— А я кажу, што налета мне яшчэ пазьней будзе, не магу адкласьці, не паеду назад.

Захацелася ўсё-ўсё выказаць гэтаму чалавеку, каб ён зразумеў яе жаданьне, каб дапамог. І, перабіваючыся ад хваляваньня, баючыся не сказаць усяго, гаварыла яму:

— ...Дома нікога пісьменнага, адна на ўсю вёску

пісьменная дзяўчына. Я настаўніцам бялізну мыла, грады палола, каб толькі вучыцца. У сэмінарыю ня прынялі, малакроўная я была. Зараз я надумала сваё ўзяць, за мяне ячэйка, ячэйка паслала, грошай на дарогу ячэйка сабрала, каб вучылася я, а не назад ехала. Бацькоў, усяго адцуралася з-за гэтага... Зараз нічога ня маю, ні грошай, ні кватэры і назад не паеду.

Слухаў, угледаўся ў яе. Ківаў галавою.

— Ну, добра, добра. Мы ўсё магчымае зробім, хоць позна, вельмі позна ўжо. Зробім як-небудзь. Я параюся з прэзыдыумам, зайдзеце праз дзень, пакуль я дагаваруся.

Словы—«мы ўсё магчымае зробім»—спарадзілі ўпэўненасьць. Вечарам хадзіла радаснай.

«Немагчымага няма нічога. Усё можа зрабіць чалавек, калі захоча, усяго можа дасягнуць».

Думала гэтак Надзя і не магла ўявіць сабе, што едзе дадому, ня прынята ў рабфак.

Прайшоў цэлы дзень яшчэ. У другі раз прыйшла ў сад на знаёмую лаўку. Перамагаў сон, але спаць легчы пакуль нельга было, бо ў садзе было багата людзей, а ночы ў садзе, на лаўцы, доўгія, марудныя...

Пайшла па вуліцы. Ідучы, хацела адгадаць сваё заўтрашняе, забыцца на мінулае, на сёньнешняе. На вуліцы было цёмна, мала людзей. Вялізныя дамы, аблезлыя, задрыпаныя, глядзелі на вуліцу пабітымі вокнамі. Холадам веяла і жудасьцю ад аблезлых высокіх сьцен. Страшна рабілася, калі ўяўляла сябе адну ў горадзе.

Сярдзітае жыцьцё ў горадзе, цяжкае, ня любіць слабых горад,—завалачэ, расплюшчыць, сьціснуўшы ў каменных грамадах сваіх. Кожнага сьцісьне, зробіць напружаным жыцьцё кожнага.

А вуліца рабілася цямнейшай, і здавалася, што з-за кожнага рогу дому, з-за кожнае брамы выглядае нехта страшны, злосны, мерыцца схапіць кожнага, хто забрыдзе туды.

Вярнулася ў сад.

Сядзела на лаўцы, абапёршыся на свой неадлучны клунак з харчамі, адзежай і пасьцеляю. Стомленасьць і позьні час спараджалі жаданьне легчы, выпрастацца і моцна заснуць.

Драмала... Угары над галавою ціха-ціха шапацела лісьцё дрэў, поўзаў ціхі, роўны гул. І здавалася Надзі, што сядзіць яна ў сябе дома, у лесе за каровамі і слухае, як гамоніць луг, як ласкава ёй шэпчуць лісьцём алешыны пра радасьць дальнюю. Шэпт лісьцёвы і гул ціхі, роўны спараджалі спакой, давалі магчымасьць думаць, успамінаць.

Успамінае Надзя...

Быў дзень, была хмурая восень...

Было... але толькі, як сон...

Старыя высокія алешыны хісталіся верхавінамі пазалочанымі, адпявалі вясну сваю—сьпявалі пра тое, як убіраліся ўвесну зялёнай вопраткай, як красавалі летам, а сьветлая пазалота ўжо казала аб надыходзячай сьмерці.

Гуло ўгары, у гальлі стагнаў лес. Мо' ад холаду стагнаў, мо' ад таго і плакаў і капаў і капаў на зямлю вогненымі сьлязьмі... Скурчыўшыся, на купіне пад елкай сядзела Надзя, рукі за пазуху схавала і дыхала за каўнер, каб цяплей было. Недалёка ад яе грызьлі пажаўцелую мураву каровы.

Неба было ўзлахмачана ўжо цэлыя тыдні і шызым, запыленым лахмоцьцем, як жабрак, трасло, а з лахмоцьця сыпалася сьмецьце—дождж ык часты, дробны. Сыпаў і мачыў. Мачыў і холадна ад таго было Надзі, каровам, дрэвам, а яшчэ халадней, як думала Надзя, было небу, апранутаму ў рызьзё,—дык яно дрыжэла ад холаду і сыпала дажджом.

Гуло ўгары. Шумеў, стагнаў альховы лес. Гэта кроплі частыя, дробныя дажджу на лісьце капалі і шумелі, гэта лісьцё шапталася ласкава з гольлейкам, віталася з ім навекі, навекі.

Слухала гоман лясны Надзя і пазірала ўгару на алешыну. Лісьцік жоўценькі, як агоньчык сьветлы, адарваўся ад галінкі, палятаў ля яе трохі, як-бы жадаючы затрымацца, зьвярнуцца назад да сваёй маткі-галіны, потым захістаўся ў бакі і паціху паляцеў на зямлю. Упаў, заслаў шырынёю сваёю лапінку чорнай зямлі, а на яго зьверху ўпала буйная кропля вады.

«Мо' сьляза матчына, а моя кропля крыві ад суччка, ад якога адарвалі лісьцік вятры дажджавыя»,—думала Надзя і поглядам плавала ў залатым лісьцёвым моры. Наўкола хісталіся алешыны, наўкола адзін

за другім пацíху ападалі залачонымі кроплямі лісьцейкі, наўкола падалі за лісьцём буйныя кроплі.

Трасло лахмоцьцем неба. Гуляў вецер над полем, над лесам. Стагнаў лес, дрыжэў ад холаду, абсыпаў сваю залачоную вопратку, усьцілаў лісьцем зямлю, пісаў па ёй лісьцем, узорамі рознымі ціхія казкі аб пераўжытых, поўных зелені лісьцёвай вясьне і леце. Вясна і лета недзе далёка, а ў гомане лесу чуўся ўжо цяжкі крок зімы доўгай, лютай, марозьлівай... Уяўляла Надзя, як прыйдзе зіма, зусім вытрасе к таму часу неба рызьзё свае, апранецца ў новую, шызую вопратку і пачне на зямлі ўсьцілаць белым пухам дарогі зімовыя. Будзе цесна тады і холадна. І боязна Надзі было, што блізка зіма, і хацелася, каб хутчэй прыйшла яна, бо з зімой той павінна было пачацца жыцьцё яе.

Успамінае Надзя...

Летам яшчэ прасіла бацьку, каб паслаў вучыцца. Адказаў бацька тады: «як выпадзе сьнег, кінеш статак ганяць і ідзе сабе ў вучылішча».

Пасучы кароў пасьля гэтага, з затоенай радасьцю слухала Надзя пужлівы гоман лесу і чакала першага сьнегу. А як убачыла, што пацямнела неба ад густой хмары і паміж галін пачалі лётаць матылькі белыя і асядаць на землю, тады ўсчула яна, што радасна забілася сэрца, усхапілася з купіны і разам са сьняжынкамі закружылася ў іх карагодзе.

Хутка пабялела зямля. Дрыжучы ад холаду, пацягнуліся дамоў каровы. Надзя апошні раз у тым годзе доўга стаяла ў лесе моўчкі, сумная... Шкода было па-

кідаць лес, хацелася, каб як мага глыбей застаўся ён у памяці, у пачуцьцях.

А на заўтра раненька сплёў бацька прыгожыя, новыя лапці... Маці з кубла дастала сарочку белую, кужэльную, паношаную, выдрала з рукавоў дзьве анучкі і, абуўшыся, пайшла Надзя з бацькам першы раз у школу.

У школе ня было ёй прастору ляснога. Чыстыя пабеленыя сьцены ціснулі яе. Зьнікла сьмеласьць, гульлівасьць дамашняя. Стаяла з бацькам у калідоры і слухала—за дзьвярыма, як чмялі, гудзелі дзеці. Слухала і не разумела, а бацька доўга паціху нешта гаварыў настаўніку, які чысьціў сярнічкай зубы і, здаецца, думаў аб нечым другім, толькі ні аб тым, аб чым гаварыў бацька. Скончыў бацька, пакланіўся нізка настаўніку, а той узяў Надзю за руку і павёў у клясу. У клясе разьбегліся вочы Надзіны ў галоўках сьветларусых, згубіліся думкі ў гомане дзіцячым, згубілася і сама. Усё наўкола—і сьцены, і дзеці, і дошка чорная, і настаўнік,—усё расло і расплывалася ўшырні; і захапляла сабой яе. Гэта было ў першы дзень. А потым навыперадкі беглі кароткія дні, тапіліся ў радасьці дзіцячай, у радасьці пачатага жыцьця... шырыліся і плылі ўсё ўперад і ўперад, у далёкі, невядомы тады яшчэ, але прыгожы і вабны горад...

Цёмна ў садзе...

Паўзуць па небе цёмныя асеньнія хмары. Хмары сыплюць дробным частым дажджом. Ад дажджу і наляцеўшага ветру мацней загуло ўгары, мацнейшым

зрабіўся шэпт лісьця, адна за другой пачалі падаць з дрэва на зямлю і на Надзю буйныя вадзяныя кроплі. Кроплі праймалі наскрозь тонкую вопратку, і з кожнай кропляй уздрыгвала Надзя. А ўгары слаўся шэпт лісьця ціхі, сумны, і ў яго ўпляталіся думкамі вобразы перажытага цяжкага дзяцінства. Дождж ня сьціхаў. З дрэў усё часьцей і часьцей кроплямі падала вада, і дрыготка ўсё больш ахапляла цела.

Успомніла, што недалёка, на сярэдзіне саду, ёсьць будка-крама, дзе пад страхой можна схавацца ад дажджу. Пайшла туды.

Доўга, бясконца доўга цягнецца ў садзе ноч. Хочацца спаць і нельга заснуць. Холадна... Трэба альбо хадзіць, тады цяплей будзе, альбо легчы, скурчыўшыся на дошках ля дзьвярэй будкі, і старацца нагрэцца.

Драмала.

Раніцою, чуць сьвет, доўга хадзіла Надзя па вуліцы і сагравалася, пакульісьці да дэкана.

У пакоі з дэканам сядзеў яшчэ адзін. Увайшла і бяз слоў стала ля стала.

— Сядайце. Ну, можам парадаваць вас. Доўга раілі-ся, як зрабіць, і парашылі прыняць вас. Трэба будзе падцягнуцца, дагнаць свой курс. А цяпер ідзеце працаваць. Я скажу, каб дзяўчаты далі вам месца ў інтэрнаце. Цесна ў нас там, але як-небудзь зьмесьцім і вас.

Вечарам яна з дзяўчынай, з якой надоечы пазнаёмілася, прыйшла ў пакой інтэрнату. Невялікі. Ля сьцен і ўсяродку адзін ля другога ложкі. У пакоі цесна, душна... Насустрач падняліся дзяўчаты, загаманілі.

— Вось тут яе зьмесьцім, бліжэй да печы, а Марусю крыху да дзьвярэй—і абедзьвюм добра будзе.

Аднекуль зьявіліся козлы, тры дошкі, салома, а праз дзесяць хвілін і ложак новы.

— Вось і ўсё, пачынай жыць па-буржуйскаму.

— Ха-ха-ха-ха!

Хацелася Надзі сьмяяцца без канца, хацелася чым-небудзь аддзякаваць таварышак, сказаць ім багата-багата добрага, ад самага сэрца.

Пачаліся дні рабфакаўскія, нялёгкія...

*

Гора ўсё можна выплакаць, можна сьмехам рассыпаць яго, можна выпяяць песьнямі, можна згубіць па старонках у кнігах.

Надзя прыйшла ўзлаванай. Кінула кнігі на ложак, лягла,—рукі пад галаў. Погляд упіўся ў адну хропку на столі. Не хацелі вочы аглядаць пакою. Ведала, што на вокнах кнігі, сшыткі, што ля ног яе тумбачка, дзе часам хлеб ляжыць, а зараз засохшыя крошкі. А ад усяго пакою, ад абадраных сьцен, аблупленай столі, разьбітай шыбы ў акне аддае холадам, пустэчай....

Пустэча, пустэча заўсёдышняя,—і хоча яна часамі запаўзьці ў Надзіну душу...

— Ха-ха-ха!

Таварышкі глянулі на Надзю.

— Ты чаго гэта?

— Так сабе.

І зноў з паўгадзіны ўсе маўчаць.

— А ведаеце, чаго мне хочацца сёньня?

— Ну?

— Сыракквашы міску з бульбай паранай, або варыва ды хлеба скібу... Э-э-х!

— Бач, чаго захацела! Таму і сьмяялася?

— Не.

— А чаго-ж?

— Я ўрокаў шукала сёньня.

— Ого! Сама шыбка граматная, урокі даваць сабралася.

— А чаму-ж, рабфак канчаю... Зайшла да аднаго нэпмана, тоўсты, чуць дыхае, два сынкі-здараўцы. Я аб уроках спытала, а ён гарбату пасадзіў піць, добры які, ды распытвае ўсё. Як жывяце?—пытае, а я яму: добра. Як з харчамі? Добра, кажу,—хлеб сьвежы заўсёды, чорствага ня бывае. А чаму? А таму, што не пасьпявае зачарствець. Пачаў расказваць, як сам вучыўся, шкадаваць нас, дык я ўзлавала, ды такое з яго запрасіла, што ён аж устаў, а я і кажу: калі шкадуеце, што цяжка нам, дык не шкадуйце плаціць.

— Ха-ха-ха!

— І што-ж?

— Нічога ня выйшла... Есьці хочу.

— Чакай. Сьцёпка пайшоў згаварыцца на станцыю, каб нам далі вагонаў пяць дроў пагрузіць, зробім і зажывем.

Зноў ціха ў пакоі. Кожная з кнігай, са сваімі думкамі. Надзя ведае, што ў куце, на ложку лежачы, кусае зараз сабе губы Ганка да крыві і ўздрыгвае ад болю

нутранога. Хворая яна. Да рабфаку на запалкавай фабрыцы працавала, ня лепш жыла, як і тут. Ведае Надзя і тое, што пры ўсіх Ганка самая вясёлая дзяўчына. Калі сышоўшыся, часам пачнуць яны лаяць усё на сьвеце,—і жыцьцё сваё, і вучобу, і скардзіцца, што няма хлеба, што стыпэндыяй і пацука не прахарчуеш, тады Ганка пачне апавядаць пра які-небудзь выпадак з жыцьця,—аб сваім не гаварыла ніколі,—так раскажа, што ўсе пачынаюць сьмяяцца і забываюць на сваё жыцьцё, над бядотамі яго сьмяюцца...

А цяпер Ганка моўчкі ляжыць. Вясёлая яны тады, як усімі апаноўвае смутак.

Надзю з першага дня да Ганкі пацягнула. Адразу сышліся, блізкімі сваімі сталі. Зараз Надзя думае аб ёй.

Ціха. Нехта стукае ў дзьверы.

— Можна.

— Кацялок у вас, дзяўчаты?

— У тумбачцы, а навошта?

— Гароху купілі, гушчу варыць будзем, запрашаю ў госьці.

— Абавязкова прыйдзем, варэце хутчэй толькі.

Сьценка адна ў пакоі з фанэры. Чутно, што робіцца ў суседнім. Там гоман, спрэчкі. Нехта пытаў.

— А па-твойму не?

— Не!

— Дык чаму-ж так, усё-ткі? Учора прадналог завялі, сёньня гандаль вольны, новых буржуяў напладзілі, а заўтра яны нас і за горла сьцісунуць.

— Ня пужайся толькі, ня сьціснуць.

— А ты ня спужаешся? Лепш скажы, чаму гэта так? Навошта было нам учора гаварыць аб роўнасьці, а сёньня пладзіць буржуяў, плаціць сотні рублёў у месяц спэцам?

— Калі трэба,—заплоцім і тысячу.

— Заплоцім? Разумею... Дык навошта было гаварыць, замазваць вочы?

— Хто замазваў, калі?

— Мы. самі.

— А ты ня ведаў, што каб была матэрыяльная роўнасьць, трэба мець нешта, на чым-бы ўгрунтаваць яе, а ў нас гола, пуста. Спэца трэба купіць, а значыцца і плаціць яму. Не заплацім—машыны стаяць будуць, бо ты-ж яшчэ не навучыўся з імі абыходзіцца. Будзем мець сваіх спэцаў, тады купляць іх ня трэ' будзе.

Крыху сьціхлі. Але той самы голас яшчэ бурчэў.

— Біліся, крычалі, што ўсё па-новаму будзе, новае жыцьцё, лепшае, комунізм, а на справе з голаду пухнем самі, абарваныя, усё разбурана...

Нехта стукнуў кулаком па стале, вылаяўся.

— Чаго лаешся, хіба ня так?

— Ды ня лаяць цябе трэба, а... Стралялі на фронце такіх, перапалох наводзіш. Каб хто яшчэ другі казаў, дык ня крыўдна было-б, а то свой. Ты, ты сам не гаварыў хіба аб роўнасьці, аб комунізьме, ці мо' цябе ашукалі таксама, мо' чакаў, што новае жыцьцё табе на сподачку пададуць.

І льлюцца адно за другім словы, здаецца, што нехта

хоча ўсё выказаць, каб нічога ў душы не засталося, каб толькі зразумеў другі.

Разам са сьвежым паветрам у пакой уліваецца гамонка вясёлая. Ёй насустрач сыплюцца запытаньні:

— Ну як, што новага?

— Паваявалі, і ня пяць, а цэлых сем вагонаў грузіць даюць нам. Заўтра пасьля абеду трэба пачаць нам.

Слухаючы спрэчкі за сьцяной, Ганка хвалявалася. Яна адразу стукнула ў сьценку кулаком і закрычаал.

— Навіна, таварышы, кіньце спрачацца, сюды хутчэй!

Паднялася з ложка.

— І ў мяне навіна. Умову з ЦРК сёньня ад профкому зрабіла, узяла—лапіць мяшкі, грошы ў чырвонцах, за кожны дзесятак.

— Ха-ха-ха! Ну, чым ня жыцьцё? Знай жыві і вучыся.

— І ў мяне навіна. На тым тыдні дадуць нам з фінаддзелу акладныя лісты разносіць нэпманам. Прыдземо і скажам: вось вашай мосьці за сытае існаваньне, каб ня вельмі разьядаліся, неспадзяванка.

— Значыцца, неспадзяванкі разносіць будзем.

— Ха-ха-ха!

---

Па Мачулках папаўзьлі плёткі.

Раніцой ля калодзежу сказала Гарпіна Маланьні:

— Ці ня чула? Прыехала дачка Язэпава з Менску, больш двох год, як ня была дома, пахудзела, прось-

ценька гэтак апранута, горш за нашых дзяўчат. Кажа—вучыцца, а хто-ж яе ведае, там-жа голад такі, і бацькі нічым не памагалі, а трэба-ж было і пад'есьці, і надзець што...

— Дык як-жа яна жыла?

— А хто яе ведае, маладая яна, усяк можа жыць.

— Мо' комуністка яна?

— А то-ж як? І тут-жа была з комсамольцамі...

Словы, кінутыя нібы так сабе, нарадзілі плётку, і папаўзла яна па вуліцы, ад прызбы да прызбы.

— Шу-шу-шу... Язэпава Надзя ў Менску... без капейкі грошай ухітраецца жыць... Шу-шу-шу... Маладая, здаровая дзеўка, дзе-ж у горадзе такая пражыве бяз гэтага... Шу-шу-шу... А сёньня, як паабедала, дык з-за стала, як нехрысьць, устала... Хі-хі-хі... Ці-ж дзіва, што да гэтага дайшла, калі ўжо на бога забылася... Шу-шу-шу... Дык кажуць-жа, у іх так і заведзена. Шу-шу-шу... Каб гэтак мая дачка, дык і ў хату яе ня пусьціла-б, адраклася-б ад такое дачкі... Шу-шу-шу...

Коціцца плётка ад хаты, намотваецца ў кожнай хаце, у кожным куце што-небудзь новае на яе. Расьце клубок, павялічваецца, пагражае заблытаць, задушыць Надзю.

А на загуменьні ў Язэпа, дзе бярвеньне ляжыць, сабраліся дзяўчаты і хлопцы і ўважліва слухаюць словы Надзіны, з гораду прывезеныя, і самі гавораць.

— ...Раней ня вучыліся такія, як мы, дый школы такой ня было. Вучылі купцоў ды буржуяў, а зараз трыста чалавек на рабфаку і ўсе—ці з гораду, з заво-

даў, ці з вёсак, як я. І вучаць нас, і стыпэндыю даюць яшчэ, на харчы, а як нехапае, дык зьбярэмся—ды на вакзал дровы грузіць, ці яшчэ возьмем якую працу, і жывем.

— У вас усе, мусіць, комуністыя?

— Не, ня ўсе, але як пабудзеш там, дык зробішся комуністым.

— Дружна жывуць... А ў нас, што ні сьвята, дык вечарынка, самагон, і ніводнае вечарынкі ня было бяз бойкі. У тую нядзелю Мікіту галаву разьбілі, а Зьмітру Мікалаеваму нехта нажом руку парэзаў... Нічога няма ў нас...

— А вы самі чаму нічога ня зробіце?

— Ды мы-ж ня ведаем нічога, газэт нават няма.

— Газэт? А вы-б падгаварылі Васіля, каб пайграў вечар адзін на газэты і—глядзі, колькі-б сабралі.

— Вось, дык праўда! Васіль адразу згодзіцца, ён з намі лепш як з другімі жыве. Давай у суботу наладзім вечарынку.

— І п'яных на вечарынку ня пушчаць.

— Нікога.

Праз два дні сабраўся сход. Душна ў хаце, цёмна, цесна, пахне кіслым, пахне дымам тытуновым. Надзя ля стала паміж старых. З-за стала сельсаветчык гаворыць сходу:

— Зьбіраецеся вы ўжо колькі раз. Трэба вырашыць, як зрабіць, ці ў колектыў пойдзеце ці ўсе за хутары сваі крычаць будзеце 'шчэ.

— Чаго парашаць, парашылі ўжо.

— Вядома, на хутары.

— А хто-ж гэта парашыў, а мо' ў колектыў?

— Ідзі сам у колектыў.

— І пайду, і ты пойдзеш.

Потым разам хата закрычала, замахала рукамі, загаманіла па кутках, на палацях. У Надзі вочы па-даўняму вугальком на людзей, на сельсаветчыка, выраз твару якога казаў: мне ўсёроўна, што хочаце.

— Ці можна мне сказаць?

— Грамадзяне, слова хоча Надзя Язэпава. Ціха!

— Ціха, ну чаго раскрычаліся?

Надзя пачала гаварыць, стала ціха ў хаце.

— Жыцьцё будаваць—ня простая рэч. Толку мала што ты крычыш за хутар. На хутары ты адзін, як дзічка ў полі, а ў колектыве вас многа; вось і разумей, дзе каму лепей.

— А як-жа, па-твойму?

— А па-мойму, табе, дзядзька Яўмен, у колектыве будзе лепей.

Ззаду закрычаў нехта:

— Навучы свайго бацьку...

— Навучу і цябе, ня больш, здаецца, за яго ведаеш.

— А па-мойму, хутар.

— Давай палічым.

Друг супроць дружкі сталі: Надзя з алоўкам і паперай і стары Яўмен. Да стала паперліся ўсе, глядзець, што будзе.

— ...Чатыры дзесяціны, выйду—уся зямля пад бокам... Жыта пасею, бульбы, крыху ільну, як-небудзь і на каня ўзаб'юся.

— Не ўзаб'ешся на каня адзін на хутары. Пажывеш—і сыны ў парабкі пойдуць. Ну, колькі ты жыта пасееш? Колькі з дзесяціны зьбярэш? Ну, і лічы. Тут на харчы не хапае, прыкупіць трэба, а на каня дзе?

— А ты ўраджай надбаў, нізкі ў цябе.

— Падбаўлю. Ну і глядзі, што выйшла?

— Дык як-жа?

— А так, што адзін ніколі каня ня купіш. Калі-ж сойдзецеся вы ў колектыве, дык лягчэй купіць і ні каня толькі, а і трактар, а зямлі ў вас—акурат на трактар работы. І другое купіць што.

— А як ня сойдземся?

— Сыйсьціся можна. Памагаеце-ж вы адзін другому цяпер.

— Дык яно-то так, чаму не паможаш...

Яўмен стаяў ля стала, вачмі шукаў чагось у хаце.

Ззаду зноў закрычаў нехта.

— Грамацейка! У свой бок падлічыла, за сваё цягне. Колектыў!

На хутары я больш зьбяру, чым у калектыве тваім.

А ў Надзі вугалькі ўваччу не патухалі. Гарачымі словамі абуджала ў густых бародах усьмешку спачуваньня і згоду.

— Глядзі ты на яе, але-ж—праўда!

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

*

Камень на марозе стыне. Холад праз камень у пакой прабіраецца, і глытае астылы камень цяплыню. Ля групкі днявальная па пакою сядзіць, падкладае дровы. Калі дровы гараць, цёпла, прыемна ля групкі, а ноччу будзе холадна ў пасьцелі.

У пакой прыйшла Ганка, трохі пастаяла ля печы моўчкі.

— Свалата... прасіла кніжак даць, не даюць, а сэмінары падрыхтаваць трэба... А тут холздна... Хутчэй-бы лета зноў, хутчэй-бы адсюль...

— Хутка пройдзе зіма, і так ня надта ўжо яна лютая.

— Лютая... Каб лютая, дык і зусім-бы прапалі, а тут яшчэ і клапы кусаюць.

— А я супроць клапоў надумала добры сродак.

— Які-ж гэта?

— А вось пабачыце.

Адкінула з ложка падушку, сяньнік. У шчыліны на ложку, дзе кучкамі сядзяць клапы, насыпала пораху, к пораху паднесла запалку.

— Вось так, узарваць іх.

— Фугасам.

Нехта пастукаў у дзьверы.

— Заходзьце.

На ложку з дзірак пыхае полымя язычкамі. У дзьвярах зьдзіўлена спыніўся профэсар, выкладчык рабфаку.

— Што гэта вы робіце?

— Ваюем з клапамі. Парылі вадой, нічога не памагае, дык мы порахам іх, ня вытрымаюць, апаліць.

Сеў. Вочы поглядам ловяць твары дзяўчат, угляддаецца ў твары іхныя, погляд не адрываецца ад шасьці ложкаў, стала. Вочы старыя часта міргаюць.

— Як жывяце вы?

— Дасканала, толькі холадна трохі, але хутка вясна і сонца будзе ўволю. Ну, а клапы задумалі наведаць нас, дык мы іх, як бачыце, порахам. Весела ў нас, добра.

— Дасканала?

Пытае зьдзіўлена профэсар.

— Як-жа гэта дасканала?

Зьдзіўлена на яго пазірае дзьве пары вачэй.

— А што-ж, хіба дрэнна нам? Да рабфаку жылі горш, мо' цяплей крыху, дык затое брудней, цямней было, а тут...

Што тут, гэтага і недаказала Надзя...

Профэсар гаворыць нешта сабе пад нос. Не разумее ён, як такое жыцьцё можна назваць дасканалым.

— ...Дасканала!.. Холадна, цесна і... дасканала. Клапы і... дасканала.

У хату ўвайшла рабфакаўка і палажыла на стол кавалак чорнага хлеба.

— Ну, павячэраем,—купіла цэлых тры фунты хлеба і селядзец.

Мацае профэсар вачыма чорны хлеб з асьцюкамі, глейкі, пазірае на вясёлыя твары дзяўчат.

— ...Дасканала?.. Такі хлеб і дасканала?..

— Налета бялейшы будзе, а зараз і гэты добры.

— Налета? А ці варта дзеля налета есьці сёлета хлеб з асьцюкамі?

— Па-нашаму, варта. Сёньня—горш, затое заўтра—лепей.

І маўчыць профэсар, разьбягаюцца вочы ад зьдзіўленьня.

— Не разумею, не разумею я, як можна вучыцца ў такіх умовах, трудна мне зразумець гэта, хоць і бачу, што так. У мае часы ў унівэрсытэце ня так жылі і то губілі сілы, а...

— У вашы часы нас ня было ў унівэрсытэце, а зараз ёсьць.

Усьміхаецца профэсар, ля ложкаў ходзіць, аглядае. У пакоі холадна, пасінелі рукі ад холаду. Трэ адну аб другую, углядаецца ў твары дзяўчат.

— Такі холад і... дасканала! Не разумею.

А за ім сочаць з усьмешкаю тры пары маладых вачэй.

*

Надзя два разы прайшла паміж крэслаў, хацела закрануць Жэню, пагаварыць з ёй. Жэня заўважыла, загаварыла першая.

— Надзечка!

— Жэня!

Добра апранута. Твар напудраны, ад пудры ружовы. Нафарбованыя губы. Гаворыць цягуча, ломана.

— Я ведаеш, пазірала, пазірала, чуць пазнала цябе. У мяне столькі знаёмых тут. Надакучылі... Я так рада табе. Хадзі сядзем, пагаворым.

Надзя доўга ўглядалася ў Жэню. Хацела знайсьці ў ёй што-небудзь блізкае, сваё, ад рабфаку, але знаходзіла толькі голас знаёмы, даўнейшы,—другое ўсё-ўсё было чужым, далёкім.

Сядзела ў цёмным кутку. Цэлая куча пытаньняў. Жэня трымае рукі Надзіны ў сваіх, ціскае іх і гаворыць-гаворыць без канца, сьпяшаючыся, каб усё сказаць. І ў струмені слоў зьнікла Жэня напудраная, нафарбованая, паўстала Жэня даўнішняя, якую яна ведала першы год у рабфаку.

— ...Я была простай, з раскрытай душой, думала, і тут такія людзі, як у нас, думала, у кожным можна знайсьці чалавека свайго, блізкага. Ты-ж ведаеш, якой даверлівай я была... А горад падмануў мяне, падманулі людзі, і цяпер я ня тая, што раней была.

— Так, я гэта бачу.

— Жыву, як і тады, у цёткі. Чаму ты не зайшла да мяне? Не схацела? А ў мяне заўсёды так весела. Прыходзіць багата моладзі, хлопцаў і, ведаеш, я помстую ім усім, бо я ім верыла, у іх шукала чагосьці... Хай ведаюць цяпер. Я хоць трошкі, але кожнаму з іх зраблю балюча. Мне ў цёткі добра. Я добра задаволена матэрыяльна, сытая, толькі сум грызе мяне заўсёды, не здаволю сябе я нічым, месца сабе не знаходжу ніяк. Ведаеш, абрыдзелі ўсе знаёмыя, хочацца часам вылаяць-вылаяць і выгнаць усіх вон, за

дзьверы. Я-ж ведаю, чаго яны прыходзяць, чаго шукаюць мяне, чаму комплімэнты гавораць, словы розныя. Ні адзін з іх не кахае мяне па-сапраўднаму, а так, да часу. Я верыла калісь ім, кахала, а яны... Затое цяпер так брыдка ўсё... Цяжка, цяжка, каб ты ведала. Надзечка!..

— А навошта ты робіш усё гэта, калі цяжка, калі абрыдзела? Ты выбачай мяне, не мая гэта справа, але хіба можа наша студэнтка рабіць усё гэта, закінуць лекцыі, усё і аддаваць час увесь гэтай тваёй «помсьце»?

— Я сама ня ведаю, чаму раблю так. На рабфаку, як была, ня было гэтага, я кахала тады, і зусім нешта другое было, а ў унівэрсытэце пачалося. Там зусім і людзі нейкія другія. Ды яшчэ-ж і жыву я ў такіх. Зацягнулі, прывучылі да ўсяго гэтага... Ой, як хочацца не даваць ім.

— Так. Але нашто ўсё гэта табе? Цяпер ты вучышся,—а скончыш, дык там будзе праца, новае жыцьцё. Кінь! Сама ты кажаш, што абрыдзела ўсё, цяжка, дык чаму-ж ня кінуць?.. Ведаеш, Жэнька, я сур'ёзна, кінь усіх, і цётку, і тых, бо гэта-ж старое, гэта балота, яно зусім зацягне цябе, калі ня вылезеш зараз,—кінь! І ў нас моладзі багата, і ў нас весела, у нас сапраўдная вясёласьць, ад сэрца, а там усё для выгляду толькі, для другіх. Пераходзь да нас у інтэрнат, будзем разам жыць, працаваць.

І пачала Надзя гаварыць пра жыцьцё рабфакаўскае. Жэня слухала, лавіла словы Надзіны, нібы ча-

лавек, які мучыўся ад смагі доўгі час, потым дарваўся да ручайка з чыстай сьцюдзёнай вадой і ніяк ня можа адарваць ад яе губ засмаглых.

— Мне так добра сёньня, я так рада, што спаткала цябе,—хоць на адзін вечар пазбавілася іх... Вы лепш за мяне жывяце, лепш.

— А можна і назаўсёды пазбавіцца ўсяго гэтага, толькі-б ты захацела сама.

— Я падумаю. Цяжка мне... Я кіну, усё кіну і пайду да вас. Толькі падумаю...

Разышліся познай ноччу. Перад Надзяй усю дарогу паўставалі два вобразы Жэні. Адзін—простая шчырая дзяўчына, якую пазнала ў цягніку, якую ведала год у рабфаку, і другі—дзяўчына, у капялюшыку, апранутая паненкай, зусім другая.

«Чаму гэта так? Што яе прымусіла зрабіць гэта? Яна магла быць чалавекам, працаваць, а цяпер, калі хто ня выратуе, яна, як чалавек, для нас прападзе... Яе зацягнула балота, у якім жыве ўвесь час, адна яна з ім управіцца ня здолее».

Па небе паўзьлі хмары, хавалі месяц і ад таго па зямлі плылі чорныя цені.

Дома Надзя ўсё расказала Ганцы. Расказала аб Жэні даўнішняй і цяперашняй. Ганка слухала, потым гаварыла сама.

— Я даўно, даўно ў жыцьці шмат нацярпелася, добра пазнала яго. Жыцьцё шліхавала мяне і часам з надзвычайным болем зразала з мяне розныя лішнія,



[library stamp]

непатрэбныя наросты. Часта не хацелася гэтага болю, часам думалася, што ў жыцьці лягчэй ісьці заплюшчанымі вачыма, куды павядзе яно, але заўсёды я неяк не паддавалася гэтаму і, здаецца, добра зрабіла. А цяжка, ой як цяжка спачатку. І ты, памятаю, таксама прыехала сюды простая, з адкрытай душою, гатовыя ўсё ўзяць ад гораду, што ёсьць у ім.

— Так, так. Мне хацелася як мага больш узяць ад гарадзкога жыцьця, ад яго культуры.

— Ты і бярэш, бярэш і жыцьцё, і культуру. Бярэ іх і Жэня, але зусім інакшае жыцьцё і другую, гніючую культуру яна бярэ. Горад неаднолькавы, неаднолькава і жыцьцё ў ім. Новае жыцьцё вядзе барацьбу са старым. Калі ідзеш па вуліцы, гэтае барацьбы ня відаць. Сад, дамы, вуліцы—усё нібы таксама як і раней, а вазьмі кожную вуліцу, кожны дом, паглядзі ў іхнае нутро—і будзеш бачыць гэтую барацьбу на кожным кроку.

Дзьве вялізныя сілы змагаюцца. Адна сіла маладая—толькі, толькі-што нараджаецца, другая—адмірае і тут, як кажуць, мёртвы хапае жывога. Старое хапае ўсякага, хто даверыцца яму, і зацягвае сабой. У старога сіл становіцца з кожным днём меней. У новага большае сіл. Кожнага чалавека клічуць да сябе гэтыя сілы, яны падносяць на паказ усё, што маюць, і чалавек хапаецца ці за новае, ці за старое, бо трэцяга няма. Трэба стаць на бок аднае з гэтых сіл,—ці тут, ці там: або памагаць старому, грузнучы з ім, або—жыць новым. А пасярэдзіне станеш, дык расьцісьне.

Ёсьць такія, што і старога ім шкода, і новага, лепшага хочацца, яны хочуць прымірыць новае са старым. Такія людзі ў нашы часы гінуць задарма, нічога не зрабіўшы для новага жыцьця, яны толькі перашкаджаюць тым, хто з новым. Ёсьць багата такіх расьціснутых, іх цісьне з двох бакоў, і расьцірае... Жэня, мне здаецца, яшчэ ня зусім пагрузла ў старое. Калі яшчэ ня позна, трэба выцягнуць яе адтуль. Няхай ідзе ў наш кацёл, за год выварым усё нягоднае! Любай дзеўкай стане.

Надзя слухала-б Ганку без канца, добра ёй на душы ад слоў Ганкі і яшчэ больш шкода робіцца Жэні.

— Яна пойдзе з намі. Ведаеш, бывае ў чалавека такі момант, калі ён стаіць на раздарожжы, калі яшчэ не абраў сабе цьвёрдай дарогі, не наважыўся, куды пайсьці. У такі момант патрэбен толькі маленькі штуршок, і чалавек пойдзе, куды яго штурхануць. Вось і з Жэняй так. Яна цяпер на раздарожжы. Трэба толькі пайсьці, узяць за руку і павесьці,—яна пойдзе да нас ужо назаўсёды.

У гаворцы неўзаметку прайшлі гадзіны кароткае летняе ночы. У пакоі з двара паглядала ўжо шэрае раньне. Праз шчыліны між шыб аконных і рам сыплецца ў пакой дробным белым пясочкам сьвятло і чым болей сыплецца яго, тым сьвятлей у пакоі.

— Як хутка разьвіднівае.

— Хутка. Толькі-што зусім, зусім было цёмна, на зямлі панавала яшчэ ноч, а зараз дзень нібы паглынуў

яе, яна зьнікла. Гэтак і ў жыцьці. Усё старое зьнікне, як зьнікае адыходзячая ноч, і аб ім застануцца толькі цяжкія ўспаміны. Дзіўнае жыцьцё, цікавае.

— Ты праўду, Ганка, кажаш. Бязумоўна, так. Хіба-ж ня праўда, што яшчэ толькі-што панавала ноч? І я, і ты блукалі ўночы, нічога ня бачылі, ня бачылі ніякага выйсьця. А цяпер ноч зьнікла, зьнікла назаўсёды ўжо, назаўсёды... А як добра, Ганка, жыць зараз! Я ніколі-ніколі ня думала, нават ня марыла, што пазнаю новае жыцьцё. Мае мары былі аб тым, каб хутчэй дадому з лесу, каб хутчэй сагрэцца, зьесьці што-небудзь, паспаць да раньня, і потым— зноў гнаць кароў. А падросшы-б, марыла-б аб тым, каб выйсьці замуж. Можа пакахала-б каго, а можа і так, каб толькі замуж, каб мець магчымасьць хоць як-небудзь пражыць. Усё жыцьцё пражыла-б так, думаючы толькі аб адным, аб сабе толькі. А калі-б і магла думаць аб другім чым, дык гэта былі-б толькі мары нязбылыя, бескарысныя. Цяпер-жа мне здаецца, што няма чалавека, шчасьлівейшага за мяне. Перада мной такі шырокі прастор жыцьцёвы! Жыві, працуй, вучыся! Мы скончым рабфак, пойдзем працаваць, на наша месца прыйдуць адтуль, з фабрык і вёсак, новыя і зноў будуць вучыцца, каб працаваць. А працы! Так багата працы, такое багатае жыцьцё. Цяпер толькі можна жыць па-сапраўднаму, у поўным сэнсе гэтага слова «жыць», можна зрабіць да краёў поўным сваё жыцьцё, зрабіць яго прыгожым.

Надзі хацелася сказаць усё, усё...

— Я не разумею, як можа той, хто хоць крыху бачыць новае жыцьцё, стаяць ад яго ў баку... Скончу, паеду ў вёску і ўсё-ўсё зраблю, каб і там шырэйшымі сталі прасторы жыцьцёвыя. Ды яны і зараз шырацца. І работа інакшай патроху робіцца, і кніжка там дзе-ні-дзе ўжо ёсьць, і газэта... Там, ведаеш, яшчэ досьвіткі толькі. У нас, у горадзе, раньне ўжо, мы ўжо ўсё добра бачым, а там толькі досьвіткі яшчэ... Але і ў нас, і там хутка будзе дзень—сьветлы, яскравы дзень. Як добра жыць цяпер і як хочацца жыць без канца такім жыцьцём!

— Пекна жыць, я ведаю гэта, добра ведаю. На дзесяткі год жыцьця самага сытага нэпмана не праменяла-б я дзесятка дзён перажытых галодных гадоў і сёньнешніх дзён.

За акном прайшоў нехта ў вопратцы з чырваньню, сыпануў праз акно пук яскравых праменьняў, пырскнуў імі ў Надзін твар, і разам з ёй засьмяяўся радасьцю бязьмежнай новага жыцьця.

Ліпень 1927 г.
г. Менск.

## КНАК

У трынаццатым годзе Пабокавічы разьбілі на хугары. Цэлае лета пабокаўцы хадзілі за каморнікам па полі, сенажацях, хмызьняку балотнаму, а ўвосень ля Пракопавай хаты ўжо цягнулі з шапкі Пётры «Трыгубага» нумары.

А да гэтага зраньня, разьлёгшыся ў садзе на мураве, жартавалі і дружна рагаталі, слухаючы крыклівыя словы Маўры аб тым, што яна да самага губарнатара дойдзе, а даб'ецца праўды, калі Міхалю крывому за мёд дадуць хутар на сялібішчы, а яе адтуль выселяць.

Жартавалі, а па сабе кожны думаў з трывогай аб тым, куды-ж ён сам выцягне: хоць-бы ж ні на «Палашкава», а каб у сялібах... І калі, зьбіўшыся ля ганку, пачалі цягнуць «шчасьце», дык у кожнага ад напружанага чаканьня дрыжэлі ногі, пачынала сьвярбець цела, кожнаму хацелася, як найхутчэй падыйсьці да ганку, засадзіць руку ў глыбокую Пётраву шапку і выцягнуць сабе нумар на добрае месца. Якаў цягнуў на-ўдалую, хоць і раіў цесьць не сьпяшацца, цягнуць сярэднім, тады абавязкова добры пападзе.

А ён пацягнуў раней. Яму боязна стала, што другія выцягнуць лепшыя нумары і, апынуўшыся ля ганку, яго рука неяк сама датыркнулася да шапкі і залезла ў самае яе нутро. У шапцы пальцы доўга перабіралі маленькія паперкі і хацелі намацаць нешта такое, каб адчуць—куды гэты нумар... Але з-заду пачалі лаяцца, што ён надта доўга цягне,—прыйшлося адразу вынязь руку з нумарам. Нумар быў у «Ляды».

Вечарам ведалі ўсе ўжо, што Мікалай «Галуза» пойдзе ў «Селішчы», Кузьма «Верасаў»—на «Адмену», Максім «Тамашоў»—у «Кунаведзь», а Якаў «Патупчык»—у «Ляды».

Калі Якаў з гразкае вуліцы ступіў на такі самы гразкі двор і на яго праз акно ўпала з комінка міргаючае сьвятло, нейкая цяплыня агарнула цела і нават нізкая крывая хатка здалася прыгожай, а бульба ў шалупінах з сольлю—найсмачнейшай стравай.

Ці-ж дзіва? Ляды! Хутарок у Лядах! Гэта-ж самае лепшае поле, гной адзін; чыстыя, роўныя, расьцярэбленыя паплавы, і недалёка перабірацца. Гуляючы, жыць будзе.

Прыйшоў, моўчкі сеў ля стала і, лупячы бульбу, паглядаў на жонку; потым не сьцярпеў.

— Гу... Не заусёды-ж і дрэнна жыць, бог дасьць і лепш пажывем, у багацьці, у сыці, а?..

— Чаго гэта ты, напіўся ці што?

— А калі-б і выпіў, дык што, а? Гэта-ж сьвята!

— Якое ў цябе сьвята?

Яна ўстала з зэдліка і ад комінка падышла да стала.

— Нумары цяглі сёньня...

— Ну?..

— У Лядах выцяг.

— Хто?

— Хтокала.

— Няўжо? Гэта-ж...

— Якое-ж тут дзіва, пацяг і выцяг.

Потым, лежачы ў ложку, яны цэлую поўнач ласкава гутарылі паміж сабой, меркавалі аб тым, як навесну перабірацца на хутар, дзе зробяць сялібу, горад... А ноччу сьнілася Хадосі, што яна поўнымі жменямі зжынае буйнае жыта і жмені з цяжкімі калосьсямі да зямлі хіляцца, а па загонах, дзе ўжо зжата, густа-густа ляжаць тоўстыя снапы, капа напэўна дасьць восем пудоў—ня меней.

Назаўтра Хадося ўзьнялася чуць сьвет і, з затоенай недзе глыбока радасьцю, увіхалася каля печы, каб хутчэй пайсьці ў ток абіраць пустыя дробныя галоўкі ільну. Зьявілася надзея, а з ёю бадзёрасьць,— акурат, як тады, калі яна толькі-што выйшла замуж за Якава і пачала гаспадарыць. Дні цягнуліся доўгай зрэбнай ніткай, намотваліся на шпулю пражытых Хадосяй трыццаці з лішкам гадоў і ніклі ў змроку доўгіх зімовых вечароў... Вясной, як толькі зьлізалі туманы з поля сьнег і ўгары зацуркалі жаўранкі, заварушыліся пабокаўцы, пачалі хадзіць на хутары, і прымяркоўвацца. А як зусім падсохла, дык той або

гэты пачаў перавозіць ужо хлявы і гумны. У Лядах ужо ляжала бярвеньне Іванчыкава, Кандратава, Саўкава. Чакаў хутар і на Якава; там чакаў, а тут ня пускала: кабыла на гвозд ногу прабіла, кульгае, няма як запрэгчы.

Думаў летам пераедзе, як кабыла паправіцца, аж...

Позным ліпеньскім вечарам прынёс з воласьці староста загад, а яшчэ праз колькі дзён разам з другімі «ратнікамі» і «апалчэнцамі» Якаў зьнік у няведамай далі за станцыяй—тупым грукатам колаў разьвітаўся цягнік з кучай заплаканых баб. Пад самае раньне прыехала з гораду Хадося і, распрогшы кабылу за хлявом, на бервяне доўга цапіху чмыхала, уздрыгваючы плячыма, сморкала ў фартух, закрывала твар.

*

Восень.

Сумна.

Голае неўзаранае поле. Дзе-ні-дзе ў полі хата, хлявы, гумно—двор цэлы таго, хто пасьпеў перабрацца. Найчасьцей-жа адна хатка ці хлеў, а то проста толькі бярвеньне, зьвезенае ў кучу ад раскіданага будынку, змоклае, пасінелае... А за Лядамі, на банеўскім полі, як мурашкі, капошацца людзі, бесьперастанку езьдзяць падводы то з бярвеньнем, то з пяском, то ўлегцы.

Акопы капаюць.

Цэлыя дні, ужо цэлае лета, сышоўшыся з усіх суседніх вёсак, з усяго павету, людзі доўбнямі заганяюць у зямлю хваёвыя калы, аблытваюць іх дротам калю-

чым, капаюць залязьнякамі і псуюць жоўтую, пескавую зямлю банеўскую.

Вайна блізка.

Напалоханыя пабокаўскія хаты прыціхлі, толькі яшчэ больш неяк асунуліся ў лужынах гразі—дварох і не глядзяць больш у поле, згубілі надзею выбрацца туды. А пабокаўцы самі закінулі поле, закінулі гумны і, прызапасіўшы доўгія глыбокія драбінкі, як у бежанцаў, зараблялі пакуль ля акопаў з залязьняком, сякерай, канём. Кожны дзень цэлымі сем'ямі ішлі на акопы, кожнае суботы атрымлівалі ў канторы новыя паперкі—ружовыя, чырвоныя.

Хадося цэлае лета зарабляла. Сама з фурманкай пясок на бліндажы вазіла, а Сьцепаніда з Таццянай (дочкі)—з залязьнякамі. За зробленае з дапамогай бацькі і выбралася на хутар.

Кожную суботу пералічвала Хадося новенькія непакамечаныя яшчэ, нязьмятыя паперкі, дакладвала іх другімі і, хаваючы далёка на самае дно ў скрыню, думала, як-бы яшчэ больш іх прыдбаць... Дочкам казала:

— Кончыцца вайна, бацька прыйдзе, дык новую хату паставім і пасаг вам будзе, як у людзей.

І зноў вазіла пясок аж да каляд, калі, прастудзіўшыся, зьлегла.

На каляды прыйшоў зусім дадому Якаў—контужаны. Сорак гадоў меў ён, а на выгляд можна было даць ля пяці дзесяткаў, і на руцэ левай ня стала трох пальцаў.

На другі дзень вечарам дастала Хадося з скрыні грошы, падазвала Якава да ложка і пералічыла яму. Доўга яны меркавалі, што зрабіць: ці варта ставіць новую хату і купіць лепшага каня, ці мо' пачакаць, пакуль вайна сьціхне?

— Дык хто-ж яго ведае, што будзе яшчэ?

— Што будзе? Нічога, скончыцца пад весну і ўсё будзе...

— А як не і ўцякаць, барані божа, прыдзецца,—дый што ты—хату з сабой возьмеш?.. Тады-ж, ня дай бог,—голад, холад, чужына, а будуць грошы, дык не прападзем... Пачакаем...

— Ага, ага, трэба пачакаць!

Ашчадліва грошы склалі ў кучку, абвярнулі чвэрткаю чыстай паперы, завязалі ў рукаў ад старой кашулі і схавалі іх назад на самае дно ў скрыню, што калісьці прывезла Хадося ў пасаг, і пачалі чакаць...

А вясной, калі дыхнула надвор'е цёплым сырым паветрам, ня ўстала з ложка Хадося, памерла... Якаў, як і пры ёй, усё чакаў канца вайне і меркаваў. Ён меркаваў па-свойму, меркаваў, што, вось, пад восень абавязкова скончыцца вайна і тады ўсё добра будзе. Аднак «нехта» ня лічыўся з гэтымі меркаваньнямі і меркаваў па-свойму—вайна цягнулася. Потым, праўда, яна скончылася, але пачалася другая і з ёй разам пачалося незразумелае для Якава жыцьцё. Бальшавікі, палякі, немцы, зноў бальшавікі, зноў палякі... Не разьбярэш... І грошы розныя зьявіліся: «думскія», «керанкі», «кнак», савецкія, і не зразумееш,

якія лепей, якія хавацъ. «Кнак» ішоў і пры саветах, і пры паляках, і пры немцах, і таму парашыў Якаў, што ўсе іншыя грошы—гэта ня грошы, а так сабе, а сапраўдныя грошы—гэта мікалаеўскія, «кнак». Ён бачыў, як суседзі хавалі «кнак», і таму не чапаў з скрыні рукавок, толькі час-ад-часу глядзеў, ці ляжыць ён там, і часамі дабаўляў туды новыя паперкі соцельныя. У такі час ён заўсёды нэрваваўся чамусьці і чамусьці радаваўся, бо ў галаве прыкідаў даўно запомненыя лічбы: на каня добрага, на хату, на пасаг...

*

Якаў Патупчык... Так завуць яго ўсе.

Нізенькі, дробны з твару, маленькая русая бародка. Заўсёды (і ўзімку, і ўлета) у шэранькай сьвітцы, падпяразаны прывезенай з войска папругай. Ногі кароткія і тупае імі ён часта-часта, тупае, ідучы і стоячы, тупае заўсёды, ад таго мусіць і празвалі «Патупчыкам». Гаварыў гэтак сама хуценька і праз кожныя некалькі слоў устаўляў з асабістай вымовай і асабістыя слоўкі «а-а-а, гэць, гэць»,—яшчэ-ж больш перасыпаў імі гаворку, калі быў п'яны. Сьмешным тады ён рабіўся: занадта прасьцяком і падатлівым; з п'яным ім можна было зрабіць, што захочаш... Апошнія дні, вось ужо тыдзень амаль, як гасьцюе ён у суседзяў, а яны ў яго—сватаюць дачку.

— Гэць, які хітры! Дачку яму дай, карову дай, сьвіньню дай, дый яшчэ тысячу рублёў дадай! Дзе-ж

ты гэта знойдзеш такую ласку? а-а-а, гэць, хітры які! Ці-ж табе другі хто дасьць такі пасаг, а?

— А што-ж мо' і Сяргею не дадуць? Усякі дасьць, у каго дачка, бо Сяргей—хлопец, як хлопец: не прап'е, не прагуляе, і не валочыцца нідзе, як другія, сваё толькі ведае!

— Э, чаму не дадуць,—знойдуцца людзі! А дачка—што? ці твая, ці другая, усёроўна! Грошы таксама невялікія, дый сама яна іх зарабіла,—ня ласку робіш, даючы іх... Адно толькі—сена, сам ведаеш, не хапае ў мяне, яшчэ дзесяціна патрэбна, а без дзесяціны—на чорта мне і дачка твая!..

— Гэць, гэць гэць, які ён, а? Сват, сват, ты чуў? Дык ты не дачку, значца, бярэш, а дзесяціну? Гэць, які!

— Кінь сват, дык і дачку-ж ён хоча.

— Дзе-ж дачку, калі дзесяціну! Каб-жа ён сказаў: вось, Якаў, бяру я дачку тваю па каханьню, але жыць таксама трэба; а сена ў мяне мала,— дык дай, тата, дзесяціну! Тады-б мо' і даў: бярэце, дзеткі, жывеце на здароўе! А то бач, бач, а-а-а! На чорта дачка без дзесяціны! А чаму не дзесяціна на чорта без дачкі, а, а? Ну, дзе-ж ты бачыў гэтакае сватаньне, а?

Цэлую ноч з суботы на нядзелю таргаваліся Якаў з Сяргеем, адзін запрашваў пасаг, другі ўпіраўся. Якаў, таргуючыся, увесь час трымаў у галаве думку аб рукаўчыку, што ў скрыні... Ён прыкідаў: «Дзесяціну, гэць! Але—тысяча рублёў! За яе ён, браце,

не адну дзесяціну з часам купіць, дый хай падзякуе за тысячу». Сяргей думаў гэтак сама, але ўпіраўся і на дзесяціне, бо пакуль купіш—сёньня сена трэба, а потым гэтую дзесяціну, і назад аддаць можна. Гаврылі аб каровах, аб сьвіньнях, авечках, аб дзесяціне, аб усім—толькі не аб вясельлі, бо яно павінна было быць толькі вынікам гэтае доўгае гутаркі. Усе трое— і Якаў, і Сяргей, і сват былі п'яныя.

— Якаў, Якаў! Дык кончыць-жа трэба, ці не?

— А-а-а, ну, а чаму-ж не? чаму-ж ня трэба? Давай кончым, ці-ж хто не дае канчаць, а?.. Я сваё кажу, вы—сваё! Дык чорт вас ведае, чаго вы ад мяне хочаце!

— Нічога мы ад цябе ня хочам—дасі дзесяціну і ўсё будзе!

— Дзесяціну, гэць?!

— Адну дзесяціну...

— А няўжо-ж дзьве яшчэ захочаце! Ведаю я ўжо гэта,—ну дык давай канчаць, толькі навошта дзесяціна? Я бацька, ці не а-а-а? Ты разумееш гэта,— я бацька свайму дзіцяці ці не?

— Бацька!

— Вядома, што бацька!

— Во, во! А калі бацька, дык хіба-ж я кіну дзіця сваё, хіба магу пакрыўдзіць?..

— А хто там цябе ведае...

— А-а-а, гэць! Як гэта—хто ведае? І ты ведаеш, і я ведаю, і сват ведае. Аддаў я Таццяну,—пакрыўдзіў? Сказаў, што дам сена—даў: косіць, ужо колькі год косіць і без дзесяціны, і ні слова—касі на здароўе;

а табе, вос, абавязкова, каб дзесяціна, а-а-а?.. А калі скосіш сёлета больш трохі як дзесяціну або меней, дык што—згібееш? А то, гэць, захацеў, дзе-е-сяціну-у!

— Ну добра, дык дай сенажаці! Будзем казаць проста сенажаць, а колькі—потым згаворымся...

— Не, не сваце, я ня хочу! Я прашу дзесяціну,— хай скажа, што дае дзесяціну, тады і лад будзе.

— А чаму ў дачкі ня спытаеш, колькі яна хоча ад бацькі ўзяць, а-а-а? Сьцепаніда!

— Сьцепаніда, хадзі сюды! Хай яна скажа...

— Ну чаго вам,—мо' гарэлкі шчэ мала?..

— Ты сядзь, дачушка, паслухай. А-а-а, гэць, які ён зух! Дзе-ж гэта бачылі—дай яму дзесяціну, а аб дачцы зусім і не гаворыць...

— Калі кажу аб дзесяціне, дык разам і аб ёй.

— Дачушка, рассудзі: скажы, колькі ты хочаш сенажаці? а?

— Колькі? Я гаварыла, колькі ён хоча...

— Дык гэта ён, але ты колькі?

— Значыць, калі я дзесяціну, дык і яна дзесяціну.

— Вядома-ж, дзесяціну...

— А-а-а, бач, бач, згаварыліся, як абіраць бацьку! Дзесяціну... Ну, дык няхай дзесяціну,—хай дзесяціну... У мяне хопіць і для сябе, хопіць і для Ільлі яшчэ, хай жыве толькі, ажэніцца... Хай дзесяціна, хай...

— Дык дзесяціна?

— Ага, ага, няхай так!

— А якую-ж ты мне дасі?

— Як якую? Якую захочу, тую і дам,—вось!

— Не-е-е! Ты захочаш «ціпец» аддаць мне, а я ня хочу,—ты словы дай цяпер...

— А-а-а, гэць, гэць,—а мо' я ад лесу дам, ты адкуль ведаеш?

— Ото-ж і ведаю! А я ад Раманавай мяжы хачу...

— О-го! Ад Раманавай мяжы! Бач, чаго захацеў, а-а-а, бач,—а ад Юркавай мяжы ня хочаш? Я-ж аддаў ад Раманавай мяжы Тацяне; ну, а ёй—ад Юркавай дам.

— А чым я горшая? Тацяне даў тамака і мне там давай!

— Гэць, гэць, згаварыліся! Мусіць раней згаварыліся, як дурнога бацьку абабраць, а-а? Дзесяціну дай, ад Раманавай мяжы дай, ды яшчэ ад самага лесу, а?

— А няўжо-ж ад поля?

— Ну, во, а адкуль-жа?

— Сам зьеш ад поля, не патрэбен мне «ціпец».

— Ня трэба,—не бяры, сам скашу. Гэць, дачушка!

— Кіньце сварыцца. Дае бацька дзесяціну, дасьць і ад Раманавай мяжы, і ад поля трохі,—праўда, Якаў?

— Ну, а чаму-ж не, а-а-а? Будуць добрыя дзеці, дык ад Раманавай мяжы дам і ад лесу дам, а не,— дык дзе захочу, там і дам, я гаспадар! А ня хочаце, дык і зусім ня дам...

— Так, пэўна, што твая воля! Бацька заўсёды аб дзецях клапоціцца... Дзеці ля бацькі добрыя,—бацька ля іх у дзесяць раз... Так...

— Во, во, а то, бач... ну, як-жа гэтак можна, а-а-а, ну як?

— Ды я нічога, вядома так, твая воля, бацькава: але-ж ты сам ведаеш, што ў мяне сена няма, а калі дзіця сваё аддаеш жыць, дык трэба так, каб ня мучылася, а каб жыло.

— Праўда!

— Ага, ага, праўда. І я гэта кажу. Ці-ж я свайму дзіцяці вораг, хай жыве, і таму дзесяціну даю... У мяне дзеці роўныя. З мяне хопіць. Дзесяціна, дык хай дзесяціна, хай і ад Раманавай мяжы... А-а-а, добра, сват, а?

— Добра, дык згода? вып'ем?

— Значыць, кончылі, вып'ем...

— Ага, ага, кончылі... Але як-жа я? Дачку забярэш, а хто-ж мне зьесьці зварыць, хто абмые, а-а-а? Сын-жа ў мяне, карова, сьвіньня... Як-жа, а?

— Жаніся сам, будзем адразу два вясельлі гуляць.

— А ўжо-ж, ага?... а то як-жа жыць? Дык жаніцца, кажаш, а?

— Ага, жаніцца, а то як-жа!

— А-а-а, дык хіба будзь і маім сватам, а-а?

— Добра, хадзем хоць сёньня, недалёка тут.

— Ну? Хадзем, а куды?

— К Тодарысе.

— Ага! яй-богу, добра, Якаў, у самы раз!

— К Тодарысе, няхай к Тодарысе, ат! Я стары ўжо і яна старая баба, абы хаты даглядзела, ды есьці зварыла. А-а-а, гэць, значыцца, два вясельлі гуляем, а?

*

Жыта сьпелае каласамі буйнымі нізка-нізка хіліцца да зямлі, засланяе полагам залацістым вузенькую дарожку, шэпча густому трыпутніку апошнія дзіўныя казкі лета. А дарожка вузенькім зялёным паскам—ня відаць каляін, уросшых трупутнікам,—лягла ад хутара да хутара сярод поля жытнёвага.

Зьмяркаецца.

Прасторы жытнёвыя хвалююцца, нібы хілячыся пад нябачным сярпом. Ціха ў полі і ў хутарох ціха, і нейкая сьвяточнасьць сьцелецца навокал і ўсё, здаецца, прыбіраецца ў сьвяточныя адзеньні, каб адгуляць вясельле лета з восеньню. Здаецца ў цішы вячэрняй, што ўсім добра, што ўсе радуюцца, і боязна, каб што не парушыла гэтую ціхую радасьць.

— Куды ты, Параска?

— Да Якава, вянок-жа завіваць Сьцепанідзе будзем, хадзем разам!

— Хадзем, заўём, а потым цябе заўём.

На дварэ ля хаты Якавінай цэлы гурт дзяцей. Яны і ў хаце, і ў сенцах, і на прызбах стоячы, падглядаюць у акно. І ў хаце на ложку, на печы згрудзіліся. А вакол стала дзеўкі маладыя, таварышкі, з якімі адгуляла

дзявоцтва сваё Сьцепаніда, шыюць вянок, сьпяваючы, адпяваюць яе дзявоцтва. А сама маладая за сталом з дзеўкамі то часам і ўсьміхнецца і сама падпяе, а часам хустачкай вытра вочы...

Каля ляжанкі ў куце стаіць вялізная сіняя скрыня. У скрыні-ж нешта капаецца Паўліха, па мацеры родная баба Сьцепаніды.

Як зьмералі дзеўкі вянок і пачалі доўгую вясёлую песьню, Паўліха паклікала маладую.

— А грошы-ж як?

— У скрыні!

— Ці-ж багата?

— Ды, мусіць, тысяч з чатыры...

— Ты-ж ведаеш, дзе яны ляжаць, ён не перахаваў?

— Не, ведаю, пад свойчыкам у рукаўчыку ўсе.

— А ён засватаў сабе гэтую?..

— Але, засватаў Гарпіну: дачка ў яе—гадоў з дзесяць ужо...

— Ну, дык бач! У той дзіця сваё, дык яна свайму прыгорне ўсё, чаго ня возьмеш зараз! Тады і ты з зубоў ня вырвеш, і Ільлі нічога ня дасьць, мачыха-ж...

— Дык узяць грошы, ці што? Я і сама думала.

— Вядома ўзяць; а што-ж ты, дурная, ёй кінеш? Маці крывёй зарабляла, а ты кінеш чорту лысаму... Ня маці, дык хоць ты спажывай, а не яна...

— Вядома. А ці-ж я мала пацягала?.. Ён-жа нічога не зарабляў.

— Дык ты пастой; як выйдзе на двор, дык вазьмі, ды за пазуху, рукаўчык кінь, каб не заўважыў пакульшто... А я—павартую...

І адпаўзла старая, згорбіўшыся, ад скрыні ў другую палову.

Якаў бегаў, як шалёны: то ў стопку, каб памагчы бабам падрыхтавацца назаўтра, то ў гумно, каб прынесьці сена прыехаўшаму на вясельле госьцю; то на гару, каб дастаць сала або гарэлкі.

Бабы-ж ля печы завіхаюцца частай і ветлівай гаворкай рассыпаюцца, цукрам пампушкі салодзяць, квашаніну разьліваюць у міскі са ўсіх хутароў.

— А га-а-лу-у-б-ка-ж мая, дзе-ж ты бачыла, каб родны бацька ды не шкадаваў...

Якаў з стопкі поўны кошык сала панёс на гару,— будзе складаць у кублік: доўга займецца. Паўліха падалася назад, кіўнула галавой Сьцепанідзе, шапнула:

— Не спажыла маці, сканала праз іх, дык хоць ты спажывай, Сьцёпка. Вазьмі іх і не кажы, што брала, твае яны, кроўныя...

Хутка зусім цёмна стала—і ў хаце, і на двары.

Ужо канчаюцца сьпевы, хутка будзе гатоў вянок, а тады прывядзе Сяргей музыкаў і вечарынка пачнецца.

На двор да Якава зьяжджаецца сваяцтва з далёкіх вёсак: дзядзькі, цёткі, брацельнікі, ля вазоў стаяць, кураць, гутараць.

Пашылі дзеўкі вянок, прымералі на Сьцепаніду, перасьпявалі ўсе песьні, потым на лавах ля сталоў селі, а сама маладая разносіць па чарцы гарэлкі ўсім, а закуску Паўліха падае.

Жартаўліва-іскрыстым сьмехам перасыпаюцца дзяўчаты, дражняць праз вокны хлопцаў, што стаяць на двары...

А ў другой палавіне бабы скупчыліся гуртам ля печы, нешта кожная хоча перад другімі паказаць сябе гаспадыняй, але языкамі ўсё больш робяць, чымся рукамі.

— А га-а-лу-у-б-кі-ж мае, ці-ж гэта багата! Агей-жа, як аддаваў Сьцепаніду, дык дзесяць пудоў перагнаў...

— Цьфу, цьфу, цьфу,—вось ты што на гэткія гаворкі зрабі; слухай толькі, што людзі кажуць...

Мужчыны ля вазоў. У іх другая гаворка: хто і сколькі скасіў ужо, хто і калі колькі выпіў на вясельлі ў суседа...

— Бывала пілі, а цяпер...

— Дык і гарэлкі-ж было, а цяпер...

— Уперад, дык і дня бяз соткі ня быў, а зараз...

Недзе далёка ў полі зыкнула гармонь і сьціхла. Дзеці кінуліся ў хату.

— Вечарынка! Музыка ідзе!

Гучней загаварылі бабы ля печы, дзяўчаты апошні раз бразнулі талеркамі.

Якаў на гары над кублікам стаяў, а перад вачыма скрыня і рукаўчык з грашыма.

«Ці-ж доўга з ёй, ведзьма тая навучыць»...

Ужо гармонь у хаце абазвалася і рассыпалася частымі зыкамі填 полькі.

Якаў, зьлезшы з гары,—проста да скрыні. Расчыніў, падняў свойчык. Рукаўчык ляжыць, хацелася яго падгарнуць трохі глыбей на дно, але пальцы неяк пустэчу абмацалі ў рукаўчыку—і толькі некалькі паперак. Нібы апёк руку, ён выхапіў разьвязаў рукаўчык, пералічыў, пацёр вочы рукой, яшчэ раз пералічыў.

«А-а-а, дык вось якая ты,—дачушка,—доб-ра-ж!»

І, не зачыніўшы скрыні, з рукаўчыкам і трыма «кацярынкамі» ў пальцах Якаў пастаяў на хаце перад зьдзіўленымі дзяўчатамі і хлопцамі, потым пайшоў у другую палову.

— Дык так! а-а-а, гэць, гэць, бачыце, людзі добрыя, дык так, а?

Паўліха ўсьлед.

— Чаго гэта ты, і скрыні не прычыніў?

— Чаго? Хіба-ж гэта дзеткі, а-а-а, бач ты, бач, што пакінула бацьку на старасьць?

— А-а?

— Шанаваў, гадаваў, а цяпер як ад бацькі, дык і ўсё забраць трэба, гаспадарку зьнішчыць...

Увайшла Сьцепаніда, на бацьку глянула і дагадалася, але пайшла да дзяўчат.

— Дык гэта так, дачушка, ты аддзякавала бацьку, а? як ён на гару, дык ты і ў скрыню... Мо' і кашулю ўжо апошнюю забярэш, а?

Бабы кучай з тае палавіны ў дзьверы ўсунуліся... Чакаюць... Сяргей з лавы падняўся, стаіць зьдзіўлены.

— Што ў цябе іх хто ўкраў?—чаго гэта ты?

— Чаго? Ня ведаеш ты? Абірайце бацьку, губеце!..

— Якія грошы, калі?

— Ня ведаеш ужо, схавацъ пасьпела!.. Дзе грошы дзела? А?

— Якія грошы? Ня брала я тваіх грошай!

Старыя сьцішаюць іх.

— Хто іх там браў? Мо', капаючыся, як-небудзь там у скрыні выкінуў, знойдзеш...

— Дзе-ж знойдзеш, калі яна ўсё пачысьціла. Чатыры тысячы было... Дзе грошы, кажы!..

— Задушыся ты з сваімі грашыма, ня брала я іх!

— А хто-ж узяў, укралі хіба? Хто-ж, апрача цябе, у скрыню лазіць, а-а-а?.. Бачыце, што зрабіла, а-а-а? гэць, дачушка?..

Ніхто не адазваўся, маўчалі... Сяргей толькі буркнуў:

— Які ў цябе чорт краў, мо' сам захаваў дзе?..

— А-а-а? сам ад сябе хаваць буду?.. Рады абгалоціць бацьку? Ты ўзяла грошы!?.

Хата ўся загаварыла, зашушукала.

А Якаў, зьбялелы ад злосьці і жалю, падыходзіў усё бліжэй да Сьцепаніды, махаў перад тварам дзяўчат і хлапцоў рукаўчыкам пустым з трыма «кацярынкамі» і крычаў.

— Дык так, зладзейкай бярэш, так? На гэта я выгадаваў цябе?

Усхваляваная Сьцепаніда стаяла сярод дзяўчат. У яе нарастала злосьць і крыўда. Пасьля апошніх бацькавых слоў усё прарвалася.

— Зладзейкай мяне абзываеш, за тое, што я абмывала цябе... Ну, дык я-ж узяла грошы і—хваробы, не аддам, бо ня ты, а я з мамай зарабляла іх, я і спажыву, а ня тая погань, што бярэш сюды...

— Во, во, бачыце, а яшчэ і адпіралася, а-а-а! Давай грошы, а ня то, дык я цябе з хаты выганю, як суку тую.

— Не аддам!.. Ня выганіш!.. Сама зарабіла, кроў маміна на іх...

— А я не зарабляў, знацца, а?

У кутках чуліся шэпты і кпіны.

— Прапіваў ты, а не зарабляў!

— І прапіваць буду, а табе ня дам, бо пакуль-што, дзякуючы богу, я гаспадар тут, а ня ты... Давай грошы сюды, а-а-а!..

— Сказала раз, што не аддам, і не аддам! Мае яны, а не твае!

— Ага, дык так! ідзеш на рызыку? не дасі?

— Ня дам!..

Загаварылі хлопцы.

— Ды што вам з тых грошай, здурнелі вы ці што! У сьметнік іх трэба выкінуць ці кут вылепіць імі, цяпер-жа савецкія ўжо, лепшыя!

— І праўда, што з іх? не бяруць-жа іх.—І Мікалай ужо ня вернецца... Дык знайшлі завошта сварыцца!

Але ў дзьвярах баба рыпнула старым голасам.

— Ня ідуць сёньня, дык заўтра пойдуць, во!

Зьбялелы Якаў зноў заміргаў пасалавелымі вачыма і, трасучы рукаўчыкам з «кацярынкамі», крыкнуў:

— Аддасі!?

— Не аддам!

— Добра! Парызыкуй з бацькам, парызыкуй, калі хочаш! Я гаспадар у хаце, а ня ты... Не аддасі—ня трэба! Атрымала-б і карову, і сьвіньню, і авечак, і дзесяціну, а цяпер... хваробу дам табе, мая дачушка!.. Ідзі, ідзі...

— Не аддам! А пасаг сышчу праз суд!

— Скулу сышчаш, а не пасаг... Парызыкуй!

Асалапеўшы Сяргей стаяў з разяўленым ротам. Шкода было пасагу, хоць і думалася, што за чатыры тысячы дзесяць такіх пасагаў можна будзе купіць, але і боязна было, каб ня прыйшлося на сьметнік выкінуць, бо колькі гадоў ня ідуць ужо.

— Не аддам я,—пры людзях кажу,—не аддам!

— І я пры людзях кажу! Чатыры тысячы ўзяла, абабрала бацьку і ні саломінкі больш з двара ня дам... Пры людзях кажу!

Сяргей ня ведаў, што лепш: ці пасаг, ці гэтыя тысячы—былі яны простай паперкай і неяк шчымела нутро ад таго, што ў яго будуць толькі тысячы. Ён штурхануў локцем Сьцепаніду.

— А мо' аддай іх, на чорта...

— Не аддам, мае яны!

— І я ня дам: рызыкуй!

Сяргей ня вытрымаў.

— А пры сваце ты што казаў мне, а? Я ведаць ня ведаю, хто ў цябе грошы ўкраў, і ці ў цябе былі нават грошы, але пра пасаг ты сам гаварыў, што дасі!

— Ня дам я пасагу, хай грошы аддасьць!

— Не аддам я грошы, мае яны, маміны...

— А я пасагу ня дам, ні крошкі з двара ня дам! Скулу, а не дзесяціну!

Сяргей яшчэ крыху пастаяў, азірнуўся...

— Калі так, дык на чорта мне і дачка твая, бяры яе з грашыма сваімі, удавіся... Найду такое шчасьце! Хадзем, матка!

Аслупянелі і змоўклі ўсе,— Сьцепаніда, і бабы, і Якаў. Сяргей, валюхаючыся, выйшаў з хаты, за ім музыкі, хлопцы, дзяўчаты. Толькі старыя ды дзеці чакалі канца.

Якаў стаяў з рукаўчыкам пасярод хаты, паглядаючы навакола...

А ў хаце ўжо запахла чадам падгарэўшых пампушак і зашыпела ў печы страва, выбегшы з гаршкоў.

— А-а-а, гэць, гэць, дык што-ж гэта?..

Дзіка крыкнула, кінуўшыся на ложак, Сьцепаніда, мятнуліся ў дзьверы дзеці, паціху пачалі выпаўзаць лішнія бабы.

— А-а, ма-а-м-ка-ж мая, га-лу-у-бка!

У полі зарагатала гармонь чыстым срэбным сьмехам.

Ніжэй схіліліся змочаныя расой жытнія каласы, захавалі дарожку на Якавін хутар. Ноч густым змрокам чорным абматала Якавін двор, будынкі, захавала яго ад вачэй людзкіх.

Сорамна было.

Сакавік 1927 г.
г. Менск.

## СУСЕДЗІ

*Апавяданьне*

*

Ледзь-ледзь прыкметна, далёка ў полі, дрыжэла ў серабрыстых пералівах паветра. Угары паслаўся цёмна-сіні прастор, рабаваты месцамі ад кавалкаў пушыстых хмар.

Паліла сонца. Ад сьпёкі застыла ўсё: і далёкі сіні лес, і поле, і хаты, і самі людзі...

У полі ляніва грае пастух. Дзесьці ўгары моцна просіць піць коршык,—на дождж. Шырока пазяхае, ідучы за гуртом сьвіней, хлапчук,—цягне па зямлі за сабою пугу. Усюды мёртвая санлівая цішыня...

На Юшкаўскай вуліцы пуста. Людзі—або ў дварох пад павецямі, або ў хатах. Халімон паціху ішоў вуліцай, цуглямі аброці зьбіваў верхавінкі паросшай ля плоту крапівы, сумысьля растоптваў закарэўшую камякамі гразь і думаў пра зямлю... Думы былі лянівыя, цяжкія, як сама зямля.

«Калі-б мне яшчэ валоку, тады-б ужо і даволі. Тады-б і парабка наняў. Хату-б новую і каня яшчэ аднаго хоць... У людзі выбіўся-б».

Думы гэтыя сьпелі даўно ў галаве Халімона і заўсёды яны былі аб зямлі, аб хаце новай, аб кані. Далей ня ішоў круг думак—на гэтым замыкаўся. Халімон нават і ня думаў, якая будзе хата, як ён павядзе гаспадарку, калі прыбудзе яшчэ валока. А ў апошнія дні ў горадзе ён злавіў сябе на яшчэ аднэй думцы, сьмелай занадта,—да якое баяўся варочацца,—ня верыў у яе рэальнасьць. Думка была аб тым, каб разжыцца, «плян» у горадзе купіць і адчыніць заежджы двор.

У Панаса ля калодзежа рылася сьвіньня, масьцілася купацца... Халімон нагнуўся, узяў камяк сухое гразі і кінуў у сьвіньню...

— Аюць, аюць, каб цябе, брыда... ля калодзежа самага...

Пры гэтых словах успомніў, што трэба накрыць нанава і свой сьвінушнік. За сьвінушнікам успомніў, што і ў клеці страха цячэ...

«Куплю гонтаў, накрыю клець і хату перакрыю».

У двары ён пайшоў ня ў хату, а пад павець і сеў на парозе стопкі. Пад павецьцю, крывулямі, разрыўшы яму, ляжаў кормны кабан... Ля яго, разграбаючы пясок, масьцілася курыца. Кабан, учуўшы гаспадара, падняў лыч, зарохкаў, і пачаў часта і часта дыхаць. Халімон устаў, прынёс вядро і абліў яго вадою. Спалоханая пырскамі, курыца з кудахтаньнем адскочыла, але не ўцякла і стала піць ваду, што затрымалася на пяску.

«Пудоў сем будзе. Прадам яго, яшчэ адтуль-адсюль наскрабу трохі і дам задатак».

Уяўленьне малявала вялізны, пакрыты густой зеленьню збожжа, кавалак зямлі. Халімон прыжмурыў вочы,—хацелася адразу і адным поглядам абняць цэлую валоку.

«І будынкі туды перавязе. Хата і вакол зямля, уся пад бокам...»

Вуліцай ішоў сусед, з якім ён быў у горадзе. Захацелася пагаварыць з ім.

— Хадзі ў цянёк!

— Да ўжо-ж!

— А я вось сяджу і думаю, як цяжка нам жыць і як зайздросна на другіх глядзець,—хоць-бы ўзяць гарадзкіх...

— А я і не зайздрошчу,—чорт іх бяры!..

Халімону сусед патрэбен быў, каб мець слухача. Самому-ж хацелася разважаць і карцела, каб хто-небудзь чуў гэтыя разважаньні і згаджаўся з імі.

— Я так думаю. Каб мець валок дзьве зямлі, дык патроху мо' і разжыўся-б... Тады ў горадзе плян купляй, хоць маленькі, хай толькі хата ды дворык,—а ўсё лепш жыў-бы. Адчыніў-бы, напрыклад, заежджы двор. І ні табе цяжка, ні табе горача, ні табе дождж. Усё пад рукамі. Дзень пражыў і лічы грошы. Залатоўку схавай кожны дзень, дык і то вунь колькі зьбярэш!

Думка аб заежджым доме надта спадабалася Халімону, і ён, хоць нясьмела, смакаваў яе... Сусед-жа быў больш рэалістым, і не згаджаўся з ім.

— Яно можа і так, толькі дзе там чорта купіш валоку, калі трэба баяцца, каб хоць сваёй дзесяціны ня згубіць. Унь падатку ніяк не заплаціш!

— Купляюць-жа людзі. Гэта толькі тад здаецца, а каб грошы, дык...

— Дык каб-жа ж грошы, а то дзе-ж іх узяць?

— А я думаю прыкупіць трохі зямлі!

— Чаму-ж не! калі ёсьць завошта, мо' і купіш.

— Задатак зараз дам, а рэшту патроху...

— Купляй на здароўе, а я баюся, каб сваёй хаця не прадаць...

Сусед толькі-што вярнуўся з салдат і думаў толькі аб тым, каб хоць трохі падняцца на ногі, каб мець хоць крыху свайго хлеба. Ён слухаў Халімона, згаджаўся ці пярэчыў яму, а ў самога ня было ні зайздрасьці таму, што вось разжывецца сусед, ні крыўды на сваё няўдалае жыцьцё... У яго было агульнае нездавальненьне вясковым жыцьцём, гразкім, тупым, збудаваным на клопатах толькі аб сабе,—нездаволеньне, прывезенае ім з гораду, дзе служыў у салдатчыне... Гэтае нездаволеньне, калі ён слухаў разважаньні суседзяў аб іх дрэнным жыцьці і зайздросныя гаворкі аб тых, хто жыве лепей,—перарастала патроху ў злосьць на ўсіх за тое, што ня ўмеюць жыць лепей, і на сябе... У яго і зараз было жаданьне—сказаць Халімону неш-

та такое, каб разбурыць яго мары, але ён абмежаваўся толькі кароткімі словамі:

— Чаму-ж не, калі ёсьць за што—купіш...

А Халімон, пад уплывам сваіх разважаньняў, цьвёрда наважыў заўтра-ж пайсьці ў маёнтак умовіцца, каб на днях даць і задатак. Уяўлялася багатае жыцьцё, магчымасьці купіць плян. Зрабілася весела.

— А і табе, Хвядос, каб толькі жаданьне, можна-б было жыць...

— Можна-б...

З вуліцы гуртам увайшлі хлопцы. Халімон спаткаў іх ветліва, загаварыў, паказваючы на Хвядоса.

— Мы дома сядзім, а куды годны! Во дзе хлопец, дык хлопец,—як вол, і салдатчына яго не сагнула.

— Салдацкі хлеб моцны.

— А вы паспрабуйце, дзядзька, мо' ён і не такі ўжо здаровы!

Халімон усьміхнуўся.

— Давай пабораемся, любіў я бараццa.

— Не бярыся Халімон, зломіць.

— Ня зломіць,—Халімон на сале рос.

— Давай!

— Давай. Калі я буду на табе, знацца, з цябе,— паўбутэлькі: ты будзеш наверсе—я стаўлю.

Узяліся накрыжкі, затупалі, ладзіліся, каб спрытней узяць друг дружку. Вакол абступілі хлопцы, дзеці.

— А ну, хто каго?

— Халімон, вядома,—ён здаравей!

— Дый Хвядос ня зломак,—на казённым хлебе, нябось, ад'еўся!

— Куды там!

А Халімон з Хвядосам вытапталі цэлы круг, водзячы адзін другога, ажно ўзьнялі на дварэ пыл. Не паддаваўся ні адзін, ні другі. Раптам Хвядос «вузлам» націснуў плечы Халімона, і той, выгнуўшыся, абсеў на зямлю.

— Вось табе і на! Не казаў я, што—казённы хлеб!

— Яно заўсёды так: хто ходзіць, у таго і сілы больш водзіць.

— А няхай цябе, плечы зламаў.

Халімон абтрэсваў пясок, усьміхаўся. Вакол рагаталі. Было весела і ня крыўдна, што яго зборалі.

— Налятай яшчэ хто, ён усіх зломіць.

Пякло сонца. Паціху асядаў узьняты пыл. Стоячы на сонцы, ад сьпёкі шырока пазяхалі дзеці, чхалі ад папаўшага ў нос пылу. Пачалі разыходзіцца. Халімону яшчэ хацелася гаварыць аб сваіх плянах, і ён сказаў да Хвядоса:

— А ведаеш, братка, ня варта і масьціцца на зямлі, калі яе толькі пад капусту ё. Жыць, дык жыць—чалавекам, а ня парабкам.

— І парабак чалавек. Ты, здаецца, і добра жывеш, а ўсё ня ўрымсьцішся,—табе заўсёды мала будзе; а я, ёсьць з чым пад'есьці, дык і маўчу.

— Ня хочацца жыць горш, чым другія. Каб мне яшчэ валока, не сядзеў-бы я тут. Ведаеш што́, куплю я такі зямлі, гэтымі днямі і задатак дам, а там... ня я буду, калі пляну ня мецьму!

*

Прайшло пяць год...

Сьвежа, лёгка. Над поплавам носіцца пах сьвежа згрэбенага сена. Мяккасьцю сакавітай пахне густы мурог. Хочацца кінуцца ў сена, паволі закінуць голаву і рукі, ляжаць і марыць...

Халімон утыркнуў граблі ў зямлю, пальцамі пасчышчаў з зуб'я мох, павесіў на граблі пустую завязаную торбу і, азірнуўшы палоску навакол, сеў.

З бакоў палосы густымі сьценамі высокі зялёны алешнік. У доле, мяккі ад густой муравы, ад сьвежасьці лугу і ад надыходзячага зьмярканьня, поплаў. У канцы паласы, дзе старыя голыя тры алешыны, поплаў крута спускаецца ўніз, стварае яму. На дне ямы ў хуткім цячэньні, хаваючыся ў спляценьні муравы, чысты халодны раўчук. А высока ўгары над поплавам, няпрыкметнымі пераліваміі ўдзень і ціхімі халоднымі дрыжэньнямі ўночы, паслалася блакітная навесь нябёс. Начамі пералiваецца яна сіньню цёмнай сваёй з бляскам яскравых зорак, злучаецца муцьцю ночы з зямлёю, поўніцца і чаруе глыбінёй неразгаданых таямніц, поўніць думы чалавечыя шырокімі марамі.

Халімон пацягнуўся і лёг. Мацней запахла сена. У галаве паплылі нэрвуючыя думы.

Усе, пакінутыя ў мінулым, гады Халімон жыў толькі думкамі, каб прыдбаць яшчэ валоку зямлі і, разбагацеўшы, купіць у горадзе «плян». Думкі-мары рабіліся рэальнасьцю. У першы год вайны ён даў задатак і пачаў лічыць сваімі ўжо дзьве валокі зямлі. На трэцім годзе вайны ўцякалі галодныя людзі з гораду, прадавалі дабро сваё, хаты. У вайну грошы сталі танейшымі, і Халімон за дзьве тысячы рублёў купіў у горадзе хату і маленькі гарод. І зрабіўся Халімон напалавіну гарадзкім, напалавіну вясковым. З рэволюцыяй—уцёк кудысь уладар маёнтку, і за валоку ня трэ' было болей плаціць. І зямля, і плян дасталіся лёгка, зьдзейсьніліся неспадзявана мары.

Халімон уваскрашаў у памяці жывы малюнак сваіх нядаўніх, не адышоўшых і зараз, імкненьняў. Усё было так блізка, так магчыма. Потым з часам прыйшло нешта непажаданае, вялізарнае, стала паміж зямлёй, «плянам», і Халімонам, засланіла сабою зямлю і «плян» і пакінула яго ў няведаньні, у безнадзейным чаканьні.

Зараз на поплаве і пах сена сьвежага, і ціша надыходзячай ночы налівалі душу спакоем, адсоўвалі троху ўбок сапраўднасьць, абуджалі і ўзмацнялі веру ў тое, што жаданьні спраўдзяцца.

«А мо' яшчэ мінецца ўсё гэта,ператрэцца і зноў будзе, як было. Чорт яго бяры, хоць і вернецца пан,

БССР імені Леніна 61бл

зямлю ўжо выплачу ўсю, няхай... Абгараджу новым частаколам двор, гарод падчышчу... Трэ' будзе памост новы ў кухні пакласьці і сьцяну паправіць. Групку можна будзе да часу і не чапаць, а потым новай кахлі даць, ці зусім перакласьці...»

Халімон супакойваўся. Цела ахапляла салодкая млявасьць. Роўна і ціха плылі думы, погляд застываў у небе. Потым уздрыгануў. Нечакана перабльггаліся думкі, нешта ўнутры злосна шапнула, што зараз і яго зямля—не яго, валокай купленай карыстаюцца другія, што ў яго гарадзкім доме жыве хтосьці, а ня ён, што прапалі задарма грошы. Чамусьці ўсплыў у памяці сусед—міліцыянэр Хвядос, і ўсю сваю злосьць Халімон накіраваў на яго.

«Усё яны вінаваты. Каб ня погань гэта, жыў-бы даўно ўжо, як чалавек. Надумалі парадкі новыя, басякі, гультаі,—комуну заводзяць».

Злосьць расла і расла. Было нейкае хваравітае жаданьне распальваць яе, і Халімон сумысьля стараўся ўявіць, як яго выкідаюць з гарадзкога дому, як у яго забіраюць усё дабро і апошнюю валоку ў якуюсь комуну. Палыхнуў ў сэрцы кіпучы боль...

«Адабралі, зьнішчылі... Пакуль будуць яны, нічога ня будзе... Маёй зямлёй, мазалём маім будзе карыстацца хтось, задарма... Але ні дажджэ ён! Лепш сьмерць, лепш няхай заб'юць, чым Хвядос ці Ахрэм які будуць дабро маё спажываць».

Нэрвуючыся, устаў і пайшоў хуткім крокам дахаты.

*

На пляцы ля валасьці стаяла куча людзей. У сярэдзіне міліцыянэр Хвядос і царкоўны сторож Максім. Горача спрачаліся.

— Зьем.

— Лопнеш, кішкі парвуцца.

— Зьем. Ідзем у заклад.

— Зьясі дванаццаць яек з шалупкамі? Ды ні дажджэш ты!

— Зьем. А прайграю—твае грошы.

— На колькі?

— На пяцьсот тысяч.

— Кладзі.

— І ты.

Хтосьці зьняў шапку. Хвядос і Максім паклалі ў шапку грошы. Усе змоўклі. Хвядос браў адно за другім звараныя яйкі і, ня лупячы, кусаў іх і еў, глытаючы пажаваныя шалупайкі. Шалупайкі ў роце хрумсьцелі.

Халімон ішоў з валасьці і прыстаў да кучы. Калі Хвядос заўважыў яго, дык ня стрымаўся.

— Ну, як-жа, сусед, ці хутка ў горад жыць паедзеш?

І Хвядос падміргнуў стаяўшым вакол яго.

— А табе што да гэтага?

Адказаў са злосьцю, хоць у запытаньні Хвядоса ня было кпіны.

— Чаго ты сярдуеш? Я проста хачу ведаць. Бачыў твой гарадзкі дом, жыве ў ім нехта. Гляньце, які дзіў-

ны чалавек! Усё жыцьцё думае, як-бы купцом стаць і ня ўмее, дык на мяне злуе, а за што? Я-ж усё жыцьцё таксама думаю, каб кавалак хлеба мець, і табе ня шкоджу. А што валоку адабралі—глупства, яшчэ-ж адна засталася. У мяне ніводнае няма і то я ня плачу... Нічога, Халімон, я адслужу: арганізуем у Юшкаве комуну, цябе старшынёй зробім, і ўсе будзем багата жыць.

Вакол зарагаталі.

А Хвядос ужо зноў кусаў яйкі і з шалупкамі еў. Аб Халімоне забыліся. Ён пастаяў крыху і моўчкі адышоў. Абудзілася крыўда моцная, даўняя.

«Ён, гэты басяк, нада мной кпіны строіць. Над гаспадаром і я маўчы!

Чакай-жа я табе пакажу! Ня я буду, калі дарую табе гэта! К-у-пец... Будзеш ты памятаваць!..»

*

Прымоўкла сяло. Наўкола поўзалі страшныя чуткі аб бандытах. Вакол хтосьці нападаў на вёскі, мястэчкі, рабаваў, паліў воласьці, забіваў комуністых, комсамольцаў, настаўнікаў, яўрэяў. Лес за Юшкавам памохмурнеў, стаяў страшным. Ноччу лесам баяліся ехаць зусім, удзень ехалі па некалькі фурманак разам.

Хвядос з групай комуністых і комсамольцаў і атрад ЧОН'у ўжо цэлы месяц вартуюць начамі воласьць, абходзяць суседні лес, вёскі. Хвядос заўсёды злосны, маўклівы, насьцярожаны.

А Халімон таксама хадзіў насьцярожаным, кожны дзень зьбіраў па суседзях чуткі аб новым нападзе, аб новым забойстве, зробеным бандытамі, рабіўся весялейшым і больш ветлівым. Ён часьцей наведваў горад, каб глянуць на свой дом, часьцей праходжваўся ля купленай валокі.

«Пачакайце! Ня згіне праўда, будзе маёй мая зямля. Не пацяшайцеся».

Аднаго разу ён вечарам прыбіраў у таку. Раптам да варот падышлі двое мужчын, неяк дзіўна, не пamясцоваму апранутых. Угадаўшы хто гэта, Халімон крыху спалохаўся нечаканасьці такога спатканьня. Старэйшы, з рыжымі, тырчачымі ў бакі вусамі, паздароўкаўся і сказаў:

— Ня пудзься, свае людзі.

— Ды я нічога. А чаго вы хацелі?

— А хацелі-б мы паесьці і спытацца пра сёе-тое. Прынясі-тка хлеба з малаком.

— Пасядзеце, я зараз.

— Не кажы толькі нікому,—папярэдзіў рыжы.

Бягучы дахаты, Халімон неяк нечакана для сябе парашыў.

— Нагавару ім на Хвядоса, папрашу,—хай управяцца з ім, няхай ведае. І комсамольцаў нашых каб прыпалохалі...

Праз пяць хвілін мужчыны сядзелі на падваротніцы, смачна жавалі хлеб і запівалі сьвежым малаком. Халімон стаяў, абапёршыся на шула.

На гумно з поля напаўзаў змрок, надыходзіла ноч. Рыжы выцер хустачкай губы і загаварыў.

— Ну, як у вас?

— Няма дабра. Усё дай ды дай,—зараз сарочку апошнюю зьдзяруць.

— Ну, а езьдзяць?

Рыжы павёў наўкола рукою.

— Кожны дзень, усё шукаюць.

— Бандытаў?

— Самі горшыя за бандытаў.

Рыжы і яго сусед зарагаталі. Усьміхнуўся і Халімон.

— Прагоняць іх хутка, к восені...

— Каб-жа даў бог.

— ... тады вальней будзе. Сілы багата ў нас, невядома толькі, як мужыкі?

— Мужыку што,—рады будуць.

— Як што? Ты рад, а другі і не.

— Яно гэтак.

Рыжы ўзьняўся.

— Нам патрэбны некаторыя весткі з воласьці. Паможаш—заплацім, не шкадуючы. Сустракацца будзем у алешніку. А як скажаш каму, тады брат...

Рыжы гаварыў тонам, не дазваляючым супярэчаньня, і Халімон успрыймаў гаворанае, як заданьне людзей, якім ён даўно падуладны.

— Што вы, што вы, ці я іхны, ці што? Я зраблю!

І ціха, сагнуўшыся да рыжага і азіраючыся па баках, па зьмяінаму зашаптаў:

— Ёсьць у нас міліцыянэр такі,—Хвядос, ён галоўны начальнік тут. Каб ня ён, усё-б у воласьці добра было. Ён людзей са сьвету зводзіць. З кім-бы і добра зрабіў, дык ён ня дасьць, выкрые. А з ім комсамольцы і наша там басота, юшкаўская... пужануць-бы іх трохі...

— Папужаем.

Гасьцей Халімон правёў аж да лесу, дарогай усё нагаварваў на Хвядоса і комсамольцаў. Нагаварваць было неяк прыемна. Ноч і прысутнасьць гэтых дваіх надавала сьмеласьці.

Разьвітаўшыся, ён вясёлым варочаўся ў двор, песьціў у думках надзею.

«Міне ліха, буду жыць зноў, нічога! Маё не прападзе! Трохі можна і пачакаць».

А ноччу доўга ня мог заснуць, было жаданьне нешта зрабіць, каб прысьпешыць ход падзей, каб хутчэй адчуць сябе поўным гаспадаром. Халімон моцна заплюшчваў вочы і ў думках маляваў яскравыя вобразы будучага гаспадараньня.

*

Апошнія дні летнія ўдаліся сонечнымі. Увесь час стаіць сьпёка.

Сторож Пракоп цэлыя дні праседжваў пад таполямі на ўслончыку, заўсёды ў дрымоце, ляніва ганяючы мух, якія поўзалі па яго зморшчаным твары, па зжаўцеўшай лысай галаве. І заўсёды Пракопу было сумна, хацелася гаварыць з людзьмі.

Халімон падсеў на ўслончык, выняў капшук і пачаў вярцець папяросу.

— Мо' закурыш?

— Давай. Ты ўсё ў воласьць ходзіш, мо' за зямлёй усё?

— Дзе там — зямлю ня вернеш, прапала ўжо, мусіць...

— Прапала.

— Так хаджу,—то газэтку тут вазьму, а то і справа якая, бяз гэтага нельга. Дый недалёка.

— А як жывецца?

— Ды што жывецца, усё, як на іголках: ні-то рабі што, ні-то чакаць чаго. Аб вайне ў нас усё гавораць. Як у вас тут,—ты-ж пад бокам, ня ведаеш?

— Хто іх ведае? Вайна—ні вайна, але вось з бандытамі, дык валэнданіны хапае. Ï ўчора злавілі аднаго, ліварверы нёс, аж пяць штук. Білі, ставілі расстрэльваць к папоpower дубу, каб прызнаўся і нічога,—сабе, кажа, купіў... У горад адаслалі. Па другіх мясцох усё воласьці паляць, б'юць. Разьвялося іх, і мы самі баімося. Ці доўга?

— А чаму-ж атрад ня прышлюць у воласьць?

— Прасілі і атрад, дык адмовілі, а тут усё чуткі ідуць, што зьбіраюцца і на нас напасьці.

— Гавораць?

— Ага!

— Чаму-ж яны адмовілі? Яно-ж непакойна, могуць бяды нарабіць, сілы тут якія...

— Сілы! Комсамольцаў пяцёра, дый у тых патронаў няма. Пазаморваліся: начамі-ж ня сьпяць, вартуюць,—а ўдзень і дома праца. Прасілі, сам старшыня езьдзіў. Сёньня нанач, казалі, зноў пашлюць кагонебудзь у горад. Паведамленьні якія, мусіць, а мо зноў просяць.

— Няхай-бы ўжо далі атрад, а то дзе-ж там з сваімі сіламі!

Гаварыў Халімон, а ў самога сэрца аж заходзілася ад радасьці, што так лёгка і неспадзявана дазнаў аб вельмі важным. Ідучы дахаты, ён у душы сьмяяўся з Пракопа, з яго шчырасьці.

Дома Халімон сказаў жонцы, што пойдзе вечарам паглядзець ясеня ў лесе; і як толькі пачало вечарэць, ён з сякерай, асьцярожна, па сьцежках, пратоптаных статкам, пайшоў, тулячыся за хвойкі, а праз паўгадзіны ўжо гаварыў з рыжым аброслым чалавекам.

— Быў я ў воласьці сёньня, зусім і ня думаў, але разгаварыўся са сторажам і нештачка даведаўся.

— Важнае што?—гавары!

— Як сказаць вам! Валасныя пільнуюцца ўсё, баяцца нападу. У самых сіл няма, патронаў няма...

— Ну, гэта, брат, пастка.

— Ня пастка! Прасілі атрад з гораду, два разы прасілі, перапуджаныя ходзяць, а атрад прысылаць— адмовілі. Сёньня нанач пасылаюць комсамольца ў горад з лістом, зноў, мусіць, з просьбай. Важнае нешта, можа і варта-б...

— Не дагаварыў, неяк страшнаватым стала слова, якое хацелася сказаць. Рыжы зразумеў недагаворанае, разьвіваў яго думку далей.

— Зрабім, пярэймем. Ты толькі пакажаш нам яго... А ты, дальбог, дагадлівы чалавек, спрытна выпытаў... Возьме наша—не забудзем!

— Мне нічога ня трэба, мне абы жыць толькі добра.

— Добра! Не забудзем! Я пайду паклічу яшчэ двaіх сваіх, а ты зараз таксама падыйдзі. Толькі пакажаш, а мы самі ўжо ўсё зробім.

— Толькі, каб не пазналі, што я...

— Не пазнаюць.

Халімон памаўчаў трохі, потым нясьмела зьвярнуўся да рыжага:

— Зьвязаўся я з вамі і, усё можа быць,—неяк боязна; з голымі рукамі жыву. Можа ў вас што знайшлося-б?

— Абрэз?

— Абы што.

— Абрэз я сёньня з сабой прынясу туды,—добры абрэз... Ну, дык будзь на месцы, ды каб ніхто...

*

Вечар.

Росна.

Ільля выкасіў нанач каню атавы і, павячэраўшы, выйшаў у горад.

Ішоў хутка. Стараўся да ночы прайсьці хвойнік, дзялянкі, бо далей поле,—сьмялей... Насустрач, схаваныя ў ценях змрокаў, паўзьлі адзінокія палосы нязжатае грэчкі, парослыя кустамі алешніку межы, а за імі, здалёку, цёмнай, нямой сьцяною набліжаўся лес. Дзесьці далёка застаўся ціхі брэх сабакі, згубіўся ў полі нечы голас, што гукаў зблудзіўшую карову, і наўкола немая цішыня. І ў цішыні чорнай гадзюкай падпаўзаў усё бліжэй і бліжэй, шыпеў тысячамі начных галасоў, хвойнік. Ільлі нібы пачуліся: нечы сьвіст, гамонка ціхая, пераклікаиьне. Ён уважліва прыслухоўваўся да гукаў, стараўся нячутна ступаць нагамі, каб усё чуць самому, а ў галаве расла трывога, і рука час-ад-часу абмацвала схаваны за пазухай маленькі ліст. Каб расьсеяць трывогу—ён думаў аб сенажаці няскошанай, аб вечарынках... Патроху зьмяншалася трывога, думы сталі раўнейшымі, спакойнымі.

У лесе было зусім цёмна,—хоць вока выкалі. Ногі асьцярожна ступалі, каб не зачапіцца за карэньні, шуршэла пад нагамі ўсланая ігліцай зямля. Шапацеў тысячамі гукаў лес, і ўвага зноў кружылася наўкола лісту.

Уперадзе нехта ціха кашлянуў. Забілася ў грудзёх спужанае сэрца. Прыпыніўся.

«Схавацца»?

Чутно, як стукае сэрца. Плечы ахапляе холад. На галаве пад шапкай страх варушыць валасы. Пачаў супакойваць сябе.

«Мо' чалавек які ідзе, хіба мала людзей па дарозе ходзіць».

І пайшоў пацıху ўперад. Вачыма абмацваў дарогу, але нічога ня бачыў. Уперадзе, узьнімаючыся з зямлі, стаялі тоўстыя хвоі. Набліжаючыся, ён адрозьніваў іх ад густа абступіўшага хвойніку і тады рабілася крыху сьмялей. Успаміналіся да дробязяй гэтыя, бачаныя ня раз удзень, хвоі.

Але зноў пачуўся кашаль і говар.

«Людзі ідуць, чаго баяцца».

І хацелася хутчэй спаткацца з людзьмі,—было сьмялей..

Раптам убачыў дваіх з вінтоўкамі. Зразу дагадаўся, хто гэта...

«Уцякаць? Позна».

Ногі дрыжаць. Дрыжыць ад незнаёмага холаду ўсё цела. Ведае, што калі бегчы, дык недалёка ўцячэ,— або падстрэляць, або проста дагоняць і будуць біць, а так мо' яшчэ і нічога. Адзін загарадзіў дарогу.

— Куды ідзеш?

— Дахаты!

— Чаго брэшаш? У горад? Комсамолец?

— У які горад? Дадому іду я, у Хацінава.

— А што з табой ёсьць?

— Нічога,—глядзеце.

Разьвёў у бакі рукі.

— Нічога?—паглядзім.

Чыесьці рукі палезьлі ў кішэні, перамацалі ногі, плечы, жывот, і адчувае Ільля, што вось-вось дакранецца яна да грудзей—тады ўсё прапала.

Вось рука намацала, спынілася на хвіліну, потым рванула за каўнер. Вырваліся гузікі, пахіснуўся Ільля.

— Ня-а-ма? А?

Ільля маўчаў. Бандыт стаў махаць кулаком перад тварам.

— Гэта пробаваў? Кажы, з чым пасланы, што думаў гаварыць?

Падышоў други з наганам.

— Ну-ну, нічога, ліст наш. Пусьціць цябе ці не?

Хацелася прасіцца, але ўжо зусім чамусьці ня было страху, што могуць забіць. Усё выйшла так хутка, нечакана, і ён ня думаў, ня мог уявіць, што яны могуць яго забіць.

З кустоў падышоў яшчэ адзін. Ільля адразу пазнаў Халімона, і ад таго, што ўбачыў свайго вяскоўца, якога ведаў зусім спакойным чалавекам, думка аб небясьпецы зусім зьнікла.

Халімон маўчаў. Маўчаў і Ільля.

— Калі пусьцім, скажаш ім, га?

Памаўчаў.

— Не.

— А як скажаш?

— Зловіце, тады...

Бандыт зьвярнуўся да Халімона. Той усё стаяў моўчкі, нярухама, думаў аб тым, што здарылася. Неяк няёмка зрабілася, што ён у такім выглядзе

сустрэўся з сваім добра знаёмым вяскоўцам. Аб забойстве Ільлі ў яго ня было і думкі; каб яна зьявілася ў гэты момант, яна спудзіла-б яго сваёй дзікасьцю. Але няёмкасьць зьмянялася страхам, што Ільля пазнаў яго, выкажа, а за страхам, ціха падпаўзала абуджаная нянавісьць.

«Гэта яны, усё яны вінаваты, і ў зямлі маёй, і ва ўсім жыцьці маім».

Абудзілася моцнае жаданьне схапіць і самому расправіцца з ім. У гэты момант бандыт запытаўся.

— Як ты? Пусьціць яго? Выкажа?

— Выкажа... Трэба, каб другія памяталі...

А Ільлі ўсё ня верылася, што могуць забіць, што ён,—жывы і зусім здаровы,—праз некалькі хвілін будзе сьцякаць крывёй ноччу ў лесе.

«Заб'юць?»

І ня мог адказаць сабе.

Халімон, захоплены страхам і злосьцю, падступаў бліжэй.

— Чужое дабро спажываць любіце... зямлю адабралі, усё, усё адабралі, зусім зжыць са сьвету рады. Маёй зямлёй жыць хочаш... У-у-у!

Далонь узьнялася і моцна пляснула да крыві па твары.

— Чаго ты, дзядзька, на мяне?

— Годзе з ім, адыйдзі ну!

Перад самым тварам убачыў руку бандыта і ў цемры чуць-чуць бліснуў кончык нагана. У памяці адразу ўсплыў дом, ліст. Задрыжэлі плечы. Далонямі

рук засланіў твар ад бандыта. Хацелася прасіць літасьці, але замест слоў з языка сыйшліся глухія гукі.

— У-у-м-ма-у-у-м...

Наган бліснуў паскай гострага полымя, апаліў рукі, шыю, і цела абсела на зямлю, а рукі схапіліся за шыю, пальцы пачалі коўзацца па шыі ў нечым сьлізкім, цёплым. Адчуў пах зямлі сухой, грудзям было мулка і балюча ад корня. Усе болей і болей сьціскала грудзі смага, паліла губы. Зубы грызьлі запылены пяском трыпутнік.

Перад вачыма іскаркамі густымі зьяўляліся, расьлі, расьлі і адплывалі вогненыя кругі—чырвоныя, сінія, чорныя...

*

Раніцою ў гэты-ж самы дзень да Хвядоса ў пакой прыйшоў старык селянін і ціхенька, азіраючыся навокал, паведаміў, што гэтай ноччу прыйдзе дадодзьверы, паведаміў, што гэтай ноччу прыйдзе дадому бандыт Буглак. Удзень Хвядос выбраў сямёра хлапцоў, а вечарам, як добра зьмерклася, паціху, нікім не заўважаныя, яны крануліся ў дарогу.

Былі каля самага Юшкава, калі счулі адзін за другім два стрэлы ў хвойніку.

— Стой, хлопцы, нешта ёсьць.

Прыслухаліся. Болей ні гуку.

— Варта-б туды...

— Мо' каго забілі ўжо, акурат на гарадзкой дарозе, такі гушчар там.

І, не згаварваючыся болей, пайшлі каля канавы, і завярнулі на гарадзкую дарогу. Ішлі ціха і слухалі.

У лесе вуха лавіла тупат сваіх ног і ног таварышоў, ды ўгары ціхі шолах ветру і хвой.

Потым нешта трэснула ўперадзе. Чуцен топат ног. Халімон, як упаў Ільля, са страху кінуўся ў лес разам з бандытамі, потым апамятаваўся крыху і пайшоў ад іх на дарогу. Ішоў асьцярожна, палохаўся сваіх крокаў і чуць ня ўскрыкваў ад страху, калі пад нагою гучна трашчэла сухая галінка хвоі. Адразу зьявіўся страх, што яго пазнаюць, арыштуюць. Падумаў, што мо'варта-б пайсьці і адцягнуць Ільлю з дарогі ўбок куды, каб не знайшлі. Але ад гэтае думкі зрабілася яшчэ страшней. Пад уплывам страху забыўся, што ў руцэ абрэз. Нэрвова дрыжэлі ногі, ступалі часта і часта пападалі пад ногі сухія галінкі, гучна трашчэлі. Ад нэрвовасьці сьпяшаўся, забыўся, што па дарозе могуць спаткаць, пазнаць.

— Ш-ш-ш... ідзе нехта.

Хвядос падняў вінтоўку.

— Стой! Хто ідзе?

— Халімон? Чаго ноччу?

Выпаў з рукі абрэз. Анямелі рукі, абвісьлі. Ногі ўрасьлі ў зямлю.

— Ты страляў?

— Я... я... страляў так сабе... страшна... дадому іду.

— А чаго ў лесе ў такую пару з абрэзам?

— Бандытам, пэўна, нешта насіў. А мо' сам з імі?

— Гавары, з бандытамі быў?

— А то-ж чаго ён тут будзе ноччу?

Халімон дрыжэў і гаварыў, сам не разумеючы сэнсу сваіх слоў.

— Я не вінаваты. Прыйшлі яны і павялі мяне.. Кароў я шукаў, Загубіліся.

— Хто павёў? Абрэз чый?

— Якія там яшчэ каровы? Даць яму, дык прызнаецца. Праз такіх вось ні дня адпачынку! Сволачы...

— Куды вадзіў іх, кажы!

— Не вадзіў... Самі яны... Ня беце...

— Вядзем у хату, дапросім.

Халімон ішоў моўчкі, спатыкаўся. Было страшна, што вось прывядуць у сваю вёску і ўсе пазнаюць, тады, што ён бандыт, а заўтра знойдуць Ільлю і яго будуць судзіць, як забойцу, бандыта. «Уцячы?»

Нехта папярэдзіў гэтую думку.

— Ня думай уцякаць—на месцы ўложым.

Прыйшлі ў другую з краю хату, дзе было сьвятло.

Зьдзіўлена глянулі на ўвайшоўшых гаспадар і ўсе прыхатнія. Халімон стаў моўчкі ў парозе, нават не прывітаўся.

— Што гэта?

— У бандыты паступіў. А такім ціхім здаваўся!

— Мо' так чалавек чаго? Халімон, ці-ж ты?

А Халімон ня можа адказваць. Па яго віне забілі сына, а тут бацька нічога ня ведае і ня верыць, каб ён мог гэта зрабіць, каб мог стаць бандытам, і заступаецца за яго. Хацелася усё сказаць проста, ва ўсім

прызнацца, але гэтае жаданьне перамагла думка, што тады ўжо ўсё прапала, а так мо' яшчэ і не пазнаюць.

Гаспадар стаяў перад ім, чакаў адказу.

— Самі яны. І абрэз далі.

Хвядос, нэрвуючыся ад злосьці, пытаў:

— Гавары ўсё, бяз усякіх. Ну-у!

— Ня ведаю, дзе яны, пайшлі. Я ня вінен.

— Значыць, былі? Кажы! Бандыт!

Абазваўшы бандытам, Хвядос ня стрымаўся і ўдарыў Халімона па твары.

— Кажы, каго абабралі, што зрабілі?

— Яны, ня я... нічога не рабіў я.

— Ня ты, дык хто-ж, кажы?

— Ня ведаю.

— Скажаш?

І Хвядос узмахнуў прыкладам.

— Ня ведаю я іх, ня біся, братка!

— Скажаш! Прымушу! Бяры абрэз у зубы, н-ну!

Трос абрэзам перад Халімонам.

Ложа тоўстая, ня ўзяць зубамі, спрабаваў вырвацца.

— Трымай!

Хвядос далоньню біў па твары, у грудзі.

— Ня бі, братка, дзеці-ж... больш ніколі ня буду...

Хвядос схапіў Халімона загрудкі, трос ад злосьці — і ад гэтага білася патыліцай аб сьцяну яго галава. У хаце заплакалі дзеці, гаспадыня. Гаспадар прасіў ня біць.

— Ня беце, ён скажа. У воласьць трэба, а так-жа — не закон.

Хвядос кінуў.

— Выходзь з хаты, сволач. Вось тут ля стралы прывяжам да раньня, а потым—у воласьць. Ты, Павал, ля яго пастаіш, а мы яшчэ за адным пойдзем.

Пасадзілі на пясок ля стралы калодзежнай, залажылі пад пахі пастронак і, моцна зьвязаўшы вузлом на плячах, абкруцілі пастронак вакол стралы.

— Пайшлі! Глядзі не праваронь, Павал...

*

Утупіў у зямлю вочы Халімон, маўчыць, не варухнецца. Адаляваюць страшныя думкі. Страх пасіляецца разам з тым, як на дварэ робіцца сьвятлей. Збоку, абапёршыся на вінтоўку, босы, у шэрай сьвітцы Павал. Ён з суседняе вёскі і Халімона добра ня ведае. Яму і шкода Халімона,—мо' так сабе ішоў дарогаю, але разам расьце і абурэньне супроць яго, што зьвязаўся з бандытамі, пайшоў ноччу з абрэзам.

На парозе ў сенцы стаяць гаспадар з гаспадыняй і бядуюць. Халімон не пазірае на іх, баіцца, тупіць вочы ў зямлю, але смага паліць губы. Ня стрымаўся, папрасіў:

— Піць хачу, не магу...

— Матруна, падай яму вады.

Гаспадыня прынесла вады. Халімон, трымаючы абедзьвюма рукамі цяжкую, зробленую з гільзы знараду, кварту, смагла піў. Скончыўшы, не падзякаваў, бо баяўся загаварыць з гаспадыняй. Яму здавалася, што

вось-вось угадае яна аб усім і пачне біць яго, грызьці зубамі за сына.

На дварэ пасьвятлела ад узышоўшага месяца. Месяц сьвяціў, прарываючы рэдкую муць пярэстых хмар. З-за іх дзе-ні-дзе праглядаюць рэдкія, на пасьвятлеўшым небе, зоркі. А Халімону хочацца, каб было цёмна, каб ня бачылі яго твару, не пазнавалі. І ён нахіляў голаў да зямлі ўсё ніжэй і ніжэй. Гаспадыня, сагнуўшыся, чакала, пакуль ён аддасьць кварту. Гаспадар моўчкі завярнуўся і пайшоў у хату. Хрыпла зарыпалі дзьверы сянец, бразнула гучна крамка.

Халімона апанаваў страх, што вось зараз гаспадыня пойдзе, і тады, тады ён не пасьпее сам расказаць ёй аб усім. Лягчэй прызнавацца ноччу.

— О-ой!

— Што з табой, баліць? Мо' завязалі цесна?

— Не... Там ён, на дарозе. Мо' жывы яшчэ.

— Хто?

— Ільля ваш. Ільлю забілі. Ня я,—яны забілі.

— А-а-а-ай, ратуйце! божачка!

З хаты выбег спужаны гаспадар. Гаспадыня выпрасталася, схапілася за галаву рукамі, акамянела.

— Што ты, што такое сталася?

— Іль-лю-у забілі, яны!

Халімон парываўся ўстаць, хацеў апраўдвацца перад бацькам забітага сына.

— Чалавеча! Ты забіў, а?

— Мо' жывы яшчэ, ідзеце... яны ўсё, павялі мяне.

Спала вёска. Цішыню ночы парушыў нечалавечы крык мацеры. Яна кінулася праз двор у поле, да лесу. Усьлед кінуўся ў ніжняй вопратцы бацька. Зьніклі яны і зноў апанавала ціша ночы. Паўла агарнуў жудасны страх.

— Ты забіў?

Халімон пазіраў у зямлю, чуў сыты пах зямлі і ўспомніў, як калісьці на поплаве вечарам нарадзілася ў яго думка адпомсьціць комуністым. Успомніў свае тагачасныя мары, але яны не абуджалі ўжо ранейшых пачуцьцяў, толькі пасілілі балючую крыўду за сябе. Губы яго шапталі бесьперастанку:

— Прапаў, прапаў...

— Сам ня ведаю, як пайшоў, як усё здарылася. Зямлю ў мяне адабралі, плян у горадзе, злосьць на людзей была, на ўсіх. А ён—комсамолец, дык хацелася, каб... Братка, сам ня ведаю, як гэта...

— Дык ты супроць нас, комуністых, пайшоў?

— Злосьць была, за сваё дабро, злосьць і праз гэта пайшоў, не падумаў. Ня ведаў, што так выйдзе. Загубіў сябе, дзяцей... Ведаў, што ён ідзе з лістом і навёў, паказаў.

Месяц спусьціўся да самага лесу, схаваўся за будынкамі. На двары стала цямней і халадней. Надыходзячыя досьвіткі зазывалі адпачыць, вольна, лёгка. Зазывала да гэтага і сьвежасьць ночы, і пах хлявоў, двара, поля. У Халімона гэта абуджала ўяўленьне сваёй хаты, гаспадаркі.

— Што скажа жонка, суседзі?

Павал пільна ўглядаўся ў твар Халімона, сіліўся адгадаць нешта.

— І ты біў ?

Страшнымі вачыма глянуў на Халімона.

— Я навёў, паказаў яго.

— Значыць, расстраляюць цябе за гэта. Бандыт ты.

— Расстраляюць? Скажы? Ня страш, братка?

— Расстраляюць, маўчы ты! За кожнага нашага дзесяць такіх трэба, ідалы...

Разьвіднела. Сьпявалі абуджаныя пеўні. Недалёка ў лесе галасіла маці.

Красавік 1928 г.
г. Менск.

## НЯ ТАК

Была вясна.

Моцна пахла зямлёю.

Сузон ляжаў у акопах і часта-часта ўспамінаў далёка кінутую хату, дзядзінец, пустуючыя гоні. І чым больш успамінаў аб іх, тым больш ныла сэрца, нязносна пакоўгу балела, і ўсё яскравей паўставалі ў памяці вобразы далёкіх няўзораных гоняй і змучанай голадам і працай жонкі.

Пахне зямля. Акурат, як у час, калі ідзеш за плугам і яна мяккімі дробнымі кавалачкамі абысыпае ногі. Пах гэты казыча нос, прабіраецца ў самае сэрца і яшчэ болей разіць яго. Варочаецца тады Сузон, седзячы ў акопе, плюшчыць вочы і бачыць неўзараныя гоні, раскрыты хлеў, худую жывёлу і ўсё гэта просіць яго гаспадарскай рукі. Сузон скрыгае зубамі, кладзецца тварам да зямлі і стогне. А зямля пахне ўсё мацней і мацней, кліча да сябе.

І не сьцярпеў.

Ноччу выпаўз з акопаў, нібы за патрэбай адышоў у кусты і, потайкам паціхеньку пайшоў у тыл. За ноч адышоў вёрст пятнаццаць, а далей, прабіраючыся ад

вёскі да вёскі, напаткаў па дарозе часьць нейкую, даў пісару ротнаму тры рублі, а той выпісаў Сузону пасьведчаньне на пабыўку бяз тэрміну. І тады ўжо, не баючыся, ехаў у таварным вагоне аж да свайго павятовага гораду.

У вагоне прасторна было, ніхто не перашкаджаў думкам. З вагона відаць было поле, убранае руньню, і аратыя за плугам. Над полем слалася ціхае неба сьветлае, плылі далёкія хмары каваламі, рассыпаліся песьні жаўранкаў.

І душа поўнілася спакоем і ўпэўненасьцю: прыеду, за зямельку вазьмуся, падпраўлю гаспадарку...

Дадому ад станцыі гасьцінцам дванаццаць вёрст. Прыйшоў, як сьцямнела. У цемры будынкі двара здаліся прыгожымі, цэлымі, форма іх ня была парушана; цемра згладзіла дзіркі ў стрэхах, абломы ў кутох згніўшых. Нават хата старая, ад таго, што гарэла на комінку смоль і ад таго, што з радаснай усьмешкай стаяла ля стала жонка, не адрываючы ад яго вачэй, і ад таго, што аб калены церліся галоўкамі дзеці, здалася прытульнай, цёплай.

Ноччу сьніў акопы і страляніну і вольнага ў фрэнчы, які ўгаварваў салдат змагацца з немцамі да перамогі, за часовы ўрад і абяцаў зямлі і волі.

Назаўтра і яшчэ дзён некалькі хадзіў па суседзях, гасьцяваў, апавядаў пра фронт і не прыглядаўся асабліва да двара, да гаспадаркі.

А потым бліжэй падышоў да гаспадаркі, прыгледзеўся, абмацаў усе куты. Хата з дзіравай страхой, са

згніўшымі шуфлядамі ў вокнах, падлогай. хлявы разбураныя, параскрываныя і пустыя, гумно, клець і стопка;—паросшы муравой, адзічэўшы дзядзінец і полезаросшае—аблог,—усё гэта неяк сабралася разам, абступіла Сузона і пытала: ну, што, як? І чакала адказу.

Глыбока ў самым нутры ціха заныла... Пачалі зьнікаць мэты, надуманыя ў вагоне.

Спадзяваўся перасіліць гэта.

Дранкай заляпіў страху на хаце; накраў у лесе жэрдак і трохі падправіў гумно; пазычыў у суседзяў каня і ўзьняў тупым сашнікам аблог; пазычыў жыта на хлеб і адрабляў за яго. А ўсё па-ранейшаму стаяла наўкола яго, падыходзіла ўсё бліжэй і бліжэй і пытала: ну, а ўсё-ж ткі?

Мучыла, не давала спакою.

Поле патроху ўзараў, пару гоняй засеяў, а на больш не хапіла насеньня. Там, дзе меркаваў ячменем сеяць, —пакінуў пад грэчку. Пайшоў пазычаць насеньня—не пазычылі і поле зноў пачало зарастаць.

Ужо думалася: «Нічога ня выйдзе, ня падняцца аднаму на ногі, ня так трэба рабіць, ня так, па-іншаму». А вечарамі ў хаце, пад ціхія словы жонкі, зноў трохі бадзёрыўся і зноў зьяўлялася жаданьне нешта рабіць, неадкладна, зараз-жа.

Раніцою выганяў з хлява карову з цялём,—худую, замызганую; ногі худыя ў каровы, адна аб другую каленамі труць. Ідучы назад у хату, зьмеціў, што ў клеці згніла падруба і яна ўся нахілілася на бок. Высек тоўсты дубовы кол, каб падперці клець. Упёр кол

канцом адным у зямлю, а другім у шула, стаў абухом па калу біць, каб ячмэй падперці;—ажно шула гнілое, унутро ўламалася, парахня парашком жоўтым паляцела, зачыхаў Сузон.

Стукнуў тады абухам па бервяну ў сьцяне,—глуха адазвалася гніючым нутром бервяно.

Апанавала безнадзейнасьць.

«Ня так, ня так трэба, аднаму ня ўправіцца, гэтак усё жыцьцё тут пылам пойдзе, парахнёй».

А клець пахілая, хата са згніўшымі шуфлядамі і падлогай, крывыя хлявы з дзіравымі стрэхамі, пустыя гумно і стопка, худая жонка і замурзаныя плаксівыя дзеці і на крывых нагах карова,—усё гэта абступала Сузона ўсё шчыльней і шчыльней і, ні-то насьміхаючыся, ні-то з жалем, пытала: ну, дык як-жа?..

Ад гэтага зьнікалі сілы, абвісалі вяла рукі.

У ліпні нядзельным раньнем абвясьціў Сузон жонцы, што пабыўка скончылася і, сабраўшыся, азіраючыся, пакуль ня зьнікла ў даляглядзе вёска, пайшоў назад у акопы.

«Трэба неяк інакш. Так нічога ня выйдзе».

Верасень 1928 г.
г. Менск.

## ПЕРАД КАНЦОМ

*Апавяданьне.*

Стары доктар раз-за-разам уздымаў з-пад акуляраў вочы, неўпапад задаваў розныя пытаньні і, не прыслухоўваючыся, што адказвае хворы, ужо ў дзесяты раз перакладаў з аднаго месца на другое анкеты, на якіх былі напісаны гісторыі хвароб.

— Прыблізна з тыдзень назад пачала хвароба аб сабе так моцна напамінаць. Раніцой аніяк устаць немагчыма, пакуль не разойдзецца кроў, а як расходжуся, дык да другой раніцы нібы і зусім здаровы,-- адказваў ужо ў другі раз, на другі раз заданае пытаньне доктара, хворы.

А доктар, зусім ня слухаючы, што кажа хворы і углядаючыся ў анкеты, пачаў гаварыць.

— Вясна—самая прыгожая пара году. Яна абуджае жыцьцё ў прыродзе пасьля зімовага сну, як і ўсё ў прыродзе; чалавек таксама з вялікай радасьцю чакае вясны. А хворы заўсёды думае: скарэй-бы вясна, тады буду ўжо жыць... Ён радуецца кожны раз, як выгляне з-за хмар сонца, кожнаму маленькаму ручайку на вуліцы, бо яны сьведчаць аб тым, што блізка вясна, поўная жыцьця, поўная прыгожасьці. Але разам з вяс-

ной падкрадаецца да чалавека і сьмерць, і хваробы розныя і больш за ўсё цісннуць людзей... І ўсё за даверлівасьць чалавечую. Чалавек з раскрытымі грудзьмі ідзе насустрач вясьне, а яна ня так, па-другому да яго...

Доктар зьняў акуляры, працёр іх, сеў на зэдлік і ўзяў адну анкету ў руку.

— Пятро Акуліч, так,—вось і знайшоў.—Потым, углядаючыся ў напісанае на анкеце, гаварыў сабе:—сэрца... гм... сэрца, браце, што помпа, перастане працаваць—і кроў не пабяжыць.

Хварэў Акуліч ужо даўно, але з прыходам зімы сьціхла нібы хворасьць і ён забыўся аб ёй, а з адлігай зноў абудзілася, прымусіла ў амбуляторыю пайсьці. І цяпер, калі ўбачыў сябе ў гэтым чысьценькім габінэце, з абведзенымі белай масьлянай фарбай сьценамі, і перад сабой старога доктара, таксама ў белым, пачала расьці трывога.

«А што, калі скажа, што хутка машынка стане? Дрэнна тады. Можа і да вясны не дажыву? Няўжо гэта можа быць?.. У зямлі будзеш гнісьці».

Ад гэтай думкі ўсё цела абдало холадам і ён уздрыгануў. Потым апамятаўся і стараўся адагнаць гэтую страшную думку другой.

«Глупства, гэта пройдзе. Адліга пачалася, застудзіў сябе трохі, ну і абудзілася старое. Вунь-жа і суседзі хварэюць, але папраўляюцца,—гэта пройдзе. Трэба будзе толькі сачыць за сабой ды адпачыць трохі прыдзецца».

І хацелася пачуць ад доктара гэткія самыя-ж словы.

А доктар ужо ў трэці раз задаваў нейкае пытаньне, трымаючы ў руцэ анкету.

— А?.. Выбачайце, замарыўся я здорава.--Пачаў у адказ доктару апавядаць, як пражыў маленства, як служыў часы вайны. А доктар, відаць было, ужо ня слухаў яго, а аб нечым другім думае. Ён водзіць алоўкам па аднэй рысцы па паперы, часам шпарка падымае руку, нібы імкнецца нешта пісаць, потым зноў паціху кладзе яе на паперу—і зноў аловак чыркае па аднэй рысцы. У гэты момант ён устаўляў у гутарку свае звычайнае—так, так.

Калі хворы, ня скончыўшы казаць, спыніўся і пачаў кашляць, доктар яшчэ раз падняў руку, паставіў на паперы кропку і пачаў сам гаварыць.

— Наша мэдычная практыка кажа, што хворым у большасьці, або нават і заўсёды, ня трэба праўды казаць,—гэтым можна толькі горш зрабіць. Калі чалавек зусім здаровы, ён ні на хвіліну не задумваецца аб сьмерці, дый і аб жыцьці ня вельмі прывык ён думаць. І хоць над галавой будзе пагроза сьмерці, усёроўна, куды хочаш палезе, у загрудкі з ёю возьмецца. А як захварэе, дык спужаецца трохі, але цешыць сябе думкай аб тым, што ачуняе. Пачуць яму ў такі момант, што сьмерць ужо за плячыма, ня зусім прыемная вестка...

«Няўжо пра мяне гаворыць?» Хацелася адагнаць далейшыя словы доктара і хацелася, каб яны былі не такімі, да якіх хіліцца думка доктара.

— Такой весткай,—казаў зноў доктар,—можна спужаць чалавека. Ён тады стане ўвесь час толькі аб

сьмерці думаць і толькі паскорыць канец свой. Бывала шмат выпадкаў, калі такі хворы накладваў на сябе рукі, ня вытрымліваў. Гэта думка мучыць, нэрвуе, і чалавек, ведаючы, што ўсёроўна канец, адважваецца на самагубства. Трэба лічыцца з псыхолёгічным момантам у такіх выпадках, ведаць добра таго, каму гаворыш.

«Значыць, мне ўсё гэта кажа», падумаў пра сябе хворы, а потым да доктара сказаў:—Вы мне можаце праўду казаць, мяне-ж вы добра ведаеце, ня з пужлівых я, здаецца. Я ведаю, чым хварэю і які павінен быць канец.—Гаварыў гэта, а сам думаў, жадаў, каб доктар сказаў, што хвароба ў яго хутка пройдзе, што яна часовая. Але нейкі нутраны голас сароміў:—што ж гэта, брат, язык адно кажа, а нутро другое зусім! Не чакаў ад цябе гэтага!

Доктар на яго словы нічога не адказаў. Відаць было, што ён як-бы нечым устрывожаны, што думае таксама ня тое, што гаворыць, і чамусьці баіцца выказаць тое, што ведае,—гаворыць другое, каб не маўчаць.

— Дзіўна жыцьцё наша складаецца. У аднаго даўжэй трохі, у другога карацей, але канец аднолькавы ва ўсіх. Адбыў сваё тут, зрабіў, што трэба было, паглядзеў на прыгожасьць жыцьця—і ідзі, брат, не затрымлівайся, дай месца другому. Кароткае жыцьцё і шмат у ім прыгожага, а чалавек усё нездаволены.

— Гэта нядрэнна. Калі-б людзі адчувалі сябе задаволенымі ўсім, тады ня было-б таго, што штурхае жыцьцё ўперад, ня было-б стымулу ў разьвіцьці...

Жыцьцё ня ішло-б уперад, не разьвівалася-б, а пачалася-б абломаўшчына. А так чалавек незадаволены тым, што ёсьць, большага хоча, да лепшага імкнецца, перамагае прыроду, перарабляе грамадзкі лад і дасягае лепшага... Першабытны чалавек нічога ня ведаў, зямлю палкай калупаў, а ў нашы часы—трактар уздымае глебу, трактар, які зроблены такім-жа чалавекам. Ад палкі да трактара—які гэта доўгі шлях і па гэтым шляху, каб разлажыць яго перад намі, выразна можна было-б прасачыць гісторыю чалавека. Трудны і прыгожы шлях. Шмат зрабіў ужо вось гэткі маленькі чалавек, а колькі яшчэ зробіць? І гэта ўсё ў імкненьні да лепшага... Быць усім здаволеным можа толькі абывацель-мешчанін, якому, апрача сваёй хаты, печы, ложка і кіндзюка, да нічога іншага справы няма.

— Вы ня зусім мяне зразумелі: я хацеў сказаць, што адзін чалавек можа і мала гадоў пражыве, але прыгожа і карысна, бо многа зробіць для грамадзтва, а другі доўга жыве і ўсё неўзаметку, усё ў душы сваёй калупаецца,—праказаў доктар.—Хто жыве ня толькі для сябе, той больш захапляецца жыцьцём і бачыць у ім больш прыгожага. Цяжка прыйсьці да гэтага чалавека і сказаць: ну, браце, рыхтуйся, табе ўжо трэба адсюль ісьці.—З гэтымі словамі доктар палажыў руку на плячо хворага. Зрабіў ён гэта мэханічна. А хворы пачуў, нібы да яго голага пляча дакрануліся кавалкам халоднага жалеза, і ад гэтага пачуцьця несьвядома адхіліў плячо. Доктар заўважыў гэта і зьняў руку.

— Значыць?..



БССР ... імені Леніна

— Баюся засмучаць вас, але вынікі такія... вы хваробу сваю ведалі, у вас сэрца цьвярдзее. Працэс гэты цягнецца больш чатырох год. На курорт паехалі вы позна і толькі трохі адсунулі тое, што павінна было быць. Цяжкая праца прысьпяшыла гэты працэс.

Гэтыя словы абдавалі хворага нібы халоднай вадой,—пасьля кожнага слова ён ўздрыгваў. Ён чуў, што цяжэе і прырастае да зэдліка, на якім сядзіць. Здавалася, што ён ужо чуе, як з перабоямі б'ецца сэрца і па жылах бегае халодная ўжо кроў. Вочы самі ўсё шырэй расчыняліся і пазіралі на доктара, пыталі: значыць, хутка перастане працаваць? А доктар узяў яго за руку і гаварыў халодныя выразныя словы.

— Гэты працэс можа яшчэ зацягнуцца самае больш на некалькі месяцаў, а там сэрца адмовіцца працаваць. Рана яно спрацавалася ў вас. Толькі ня думайце над гэтым. Рана ці позна канец павінен быць. Вы—сёньня, я—заўтра, а хто-небудзь—пасьлязаўтра. Вы шмат зрабілі за сваё жыцьцё.

Відаць было, што ён хоча хоць чым-небудзь пацешыць хворага, шукае лепшых слоў для гэтага. А хворы ўжо апамятаваўся, пра сябе думаў. «Чаго-ж я раскіс, нібы ня ведаў, што другіх вынікаў быць ня можа?

— Я гэтага чакаў, нічога, усёроўна... Толькі шкода, што гэтак хутка. Хацеў усьміхнуцца, але чуў, што губы крывяцца і ўсьмешка не ўдаецца. Устаў.

— Дзякую. Бывайце.

— Усяго добрага. Заходзьце да мяне—пасядзець, пагутарыць. Старайцеся больш сярод людзей быць, ня сумуйце, ня думайце аб гэтым.

— Дзякую, зайду да вас. А сумаваць ня буду.

Доктар на разьвіганьні моцна сьціснуў руку, і ад яго рукі нейкая цеплата пайшла па руцэ ў цела.

*

Пад вечар, пасьля дзённае адлігі, узяўся марозік. Вуліца сустрэла Акуліча няпрыветліва, абдала холадам. Цела ахапіла дрыготка. Хацелася хутчэй зайсьці ў цёплае памяшканьне, нагрэцца. Да кватэры далёка, а крыху ўніз па вуліцы завод свой і клюб. У клюбе цёплы пакой чытальні. Там заўсёды хто-небудзь ёсьць.

Работа толькі-што скончылася і ў заводзе ціха, толькі рухавік ня сьціх яшчэ, не супакоіўся, пыхкае чагосьці. У асьветленых цэхах нярухома стаяць блішчучыя варштаты... Ня відаць, як заўсёды ўдзень, схіленых над імі людзей. Акуліч стаў ля сьцяны заводу каля акна такарнага цэху, адшукаў свой варштат, сярод шэрагу другіх, прыглядзіўся і прайшоў у памяшканьне клюбу.

У пакоі чытальні некалькі чалавек, групкамі. У аднэй рагочуць.

— Вось дык маладзец, даў чосу. Любата—газэта. Не расходзься занадта. А папрабаваў-бы гэта раней зрабіць, дык, брат, вароты шырокія.

— Раней і газэт такіх мы ня ведалі.

— А каб і ведаў, дык напісаў-бы хіба на гаспадара.

— О-го!

— І як ён толькі гляне на сябе зараз! Ну і вывеў-жа, каб яго... Вось табе і фабком, рабі як сьлед. Ха-ха-ха!

— Яна ўцякае, а ён пальчыкам вабіць і з рота сьліна цячэ. Ай, каб яго-ж...

І заліваліся рогатам.

Акуліча сустрэлі ветліва.

— Ну і зьехаў-жа ты, браце! Занадта ўжо працуеш. І завод, і сакратарства ў ячэйцы—аднаму гэта не пад сілу.

А ён, жартуючы, адгаварваўся.

— Нічога, вясна ўжо. Выйшаў я сёньня на волю, як жывёла на Юр'я на сьвежую расу,—значыць, выжыву.

— Жывы будзем—не памрэм.

Зарагаталі. Пачалі перадаваць яму апошнія заводзкія навіны. А ад навін перайшлі да анэкдотаў. Майстрам на анэкдоты быў нізенькі крывы каваль, старшыня шэфскай камісіі. Сядзіць ён на крэсьле, рукі на каленкі палажыў і, хістаючыся крыху ўбок, апавядае:

— ... Дзеліць гэта ён 28 мяшкоў цукру на сем сельсаветаў і загадвае прыказчыку выдаць па трынаццаць мяшкоў на сельсавет. Прыказчык пярэчыць: як гэта па трынаццаць, ня хопіць-жа! А той: вось табе 28, а вось сем—дзялі восем на сем—будзе адзін.

Адзінажды сем—сем. Сем з васьмі—адзін, ды два прыпішы ў доле—дваццаць адзін. Дваццаць адзін на сем—тры. Тры прыпішы к аднаму—трынаццаць... Нічога ня зробіш, давай. Бачыць прыказчык, што бяда, дык ён у рэвізійную камісію, а там таксама дзядзька вылучэнец. Эт, дурні, кажа ён, ня ўмееце праверыць. Дзяленьне правяраецца множаньнем. Трыжды сем—дваццаць адзін, а адзінажды сем—сем. Дваццаць адзін да сем—дваццаць восем, як-жа няправільна? І зноў загадваюць прыказчыку выдаць на кожны сельсавет па трынаццаць мяшкоў. Той бачыць—бяда, дык ён у акругу, у эрсаі, а там таксама вылучэнец. Расказалі яму ў чым справа. Ён усьміхаецца дый кажа: няўжо-ж вы не маглі праверыць гэтага. Сем сельсаветаў, складзеце сем разоў трынаццаць і ўсё. Узяў паперку, напісаў сем раз трынаццаць і лічыць: тры да тры—шэсьць, ды яшчэ шэсьць, ды яшчэ восемнаццаць, ды яшчэ тры—будзе дваццаць адзін, а тут—лічыць адзінкі,—сем адзінак. Дваццаць адзін да сем—дваццаць восем. Значыць правільна дзяліў ён цукар, ня трэ' было і ў акругу хадзіць. І паехаў прыказчык назад...

Усе рагочуць. А каваль ужо апавядае пра вясельле вясковае і не згадаеш, дзе праўда ў яго, дзе прыдуманае. Запрашае Акуліча паехаць разам да падшэфных.

— Люба, браце, на сходзе: як пагаворыш там, ды як возьмуць цябе за жабры, дык сёмы пот праймае.

Глянеш,—чаго дабіліся. Малатарня—любата адна. ды трыер адрамантуем хутка і завязем... Паедзем!

*

— Добра, добра, абавязкова паедзем.

Цалкам захоплены жыцьцём, Акуліч ішоў па вуліцы. Ён зусім забыўся на тое, што сёньня быў у доктара, што ў кішэні ляжыць папера, напісаная доктарам. Неўзаметку для сябе падышоў да месца, дзе жыў, і ўспомніў, што заўтра на заводзе вытворчая нарада, да якой ён павінен падрыхтаваць нейкія матэрыялы.

Вялізны драўляны двохпаверхі дом кідаў на вуліцу праз вокны сьвятло электрычных лямпачак, і толькі яго пакой чорнаю плямаю акна пазіраў у двор. Акулічу паказалася, што там, дзе сьвятло—цёпла, прыемна, а адсюль нібы вее пустэчай і холадам.

У невялікім пакойчыку столік, на ім кніг поўна, ля сьцяны ложак. На сьцену, дзе былі розныя карткі і портрэт Леніна, падала сьвятло з акна суседняга дому праз двор.

Уваходзячы ў пакой, ён думаў адпачыць трошкі, пасядзець, а потым узяцца за работу. Але адразу яго ўвагу зьвярнуў на сябе чыйсьці стогн за сьцяной. Сьцяна з дошчак, паперай газэтнай абклеена і праз яе усё чутно.

Ён чуў, што стогне мужчына, а паміж стогну быў чуцён сьлязьлівы жаночы говар. Жанчыну сьцішаў другі мужчынскі голас.

— Плачам не паможаш. Так госпаду богу трэба, усе ходзім пад яго магутнай рукой... А мо' яшчэ будзе жыць. Не гаруй. Выхоўвай дзяцей у веры божай, боязнасьці, маліся за яго грахі...

Акуліч дагадаўся, што стогне за сьцяной стары шавец Якім. Вясёлы быў. Ладзіў боты ўвесь дзень з песьнямі, а калі Акуліч прыходзіў на кватэру, Якім праз сьцяну пытаў, ці будзе ён што-небудзь чытаць, каб песьняй не перашкаджаць... Часта заходзіў паслухаць газэту і любіў пагаварыць аб сваім, багатым уражаньнямі жыцьці. Цяпер ужо больш месяца, як Якім хворы. Гэта ён стогне, а другі голас—папа: прычашчаць прыйшоў. Сам Якім ня любіў папоў, але жонка надта набожная, яна і паклікала.

«Усё старую песьню цягнеш», падумаў Акуліч, «век аб пакорнасьці да боязнасьці людзям пяеш. А сам рад, што чалавек канае, траячку заробіш... Дык няўжо-ж Якім памрэ?» Разам з гэтай думкай холадам у цёмным пакоі абдалі словы доктара:—вы сёньня, я заўтра... «А мо' і ня некалькі месяцаў засталося чакаць, а толькі некалькі дзён, можа доктар ня ўсю праўду сказаў?» Успомніў доктора, яго словы, і маленькі пакойчык здаўся халоднай дамавінай, нават пачуўся пах сьвечкі, што мерцьвяком даюць у рукі.

«Гэта-ж з-за сьцяны пах цягне», упэўніў ён сябе. «Усё-ткі жыць і ведаць, што праз некалькі дзён канец,—гэта нялёгкая справа, моцную волю трэба мець, каб не звар'яцець», разважаў ён з сабой. «Сёньня жыву, а заўтра мо' канец. Усё так проста, і ў той-жа

час ніяк гэтага ўявіць не магу. Няўжо-ж я, той самы, што вось хаджу, гавару, думаю, праз некалькі дзён буду ляжаць у зямлі, як ні на вошта непатрэбны кавалак мяса».

Уздрыгануў, зубы самі пачалі сакатаць.

«Страшна гэта. Ці-ж дзіва, што людзі прыдумвалі сабе ва ўцеху жыцьцё на тым сьвеце. Яны баяліся проста сказаць сабе, што памрэш, заграбуць у зямлю, згніеш і толькі,—больш нічога ня будзе. Няпрыемна было чуць гэту праўду людзям, лепш было думаць, паміраючы, што там дзесьці яшчэ будзе жыць і ўжо бясконца. Казка была прыемней для іх, чымсьці жорсткая рачаіснасьць». Разважаў гэтак, а сам адчуваў, што ня здолее сесьці за працу, пакуль за сьцяной будуць стогны. Парашыў прайсьціся.

*

Позна ўжо, але на вуліцы яшчэ людзі адзінкамі і гурткамі ходзяць узад і ўперад і нічым вуліца сёньня не адрозьніваецца ад мінулых вечароў.

На рагу стары газэтчык, кожнаму праходзячаму ля яго чалавеку, гаварыў: «Антанта войска ў Кітай выслала... вайна!..»

«Ці разумее ён сэнс гэтых слоў: Антанта, Кітай», падумаў Акуліч. «Стары, зьмёрз ён, мусіць, гаворачы аб Антанце і Кітаі; думае аб тым, як-бы хутчэй залезьці на цёплую печ, але стаіць, каб трохі больш зарабіць. А мо' і ён пісьменны, чытае сам газэты і ведае аб Антанце і Кітаі? Разумее сэнс барацьбы гэ-

тых дзьвёх сіл і спачувае свайму сябру газэтчыку-кітайцу, які мо' таксама сёньня крычыць аб Антанце, толькі на другой мове? Як далёка яны адзін ад другога, як мала ведаюць адзін аб другім, а ўсё-ж такі мусіць аднэй думкай б'юцца сэрцы ў абодвух: каб кітаец-газэтчык стаў вольным.

Завярнуў у завулак, дзе ня відаць было людзей, прайшоў трохі і спыніўся.

Памацнеў вецер, чутно было, як лётае ён па гарадзкіх дварох, вязьне і ад цеснаты злуецца, гудзе сярдзіта. З другога боку вуліцы з хаты, праз адчыненую фортку, даносіліся ціхія гукі гітары.

Здавалася, што нараджаюцца гэтыя гукі недзе далёка-далёка, у бяздоннасьці зямлі, вырываюцца адтуль і расплываюцца кругамі ва ўсе бакі, у прастор, нібы хвалі. Вось яны маленькія, ціхія, упрашаюць кагосьці аб нечым, потым ад упрашваньня разам пераходзяць да крыку, пагроз, у якіх чуецца роспач... То зусім сьціхнуць на адзін момант, каб зноў пачаць упрашваньне, і ўжо ня чуваць пагроз, а плач, сьлёзы. Разам з гукамі струн гітары чуецца, сьпеў. І ў гуках струн і ў песьні—безнадзейныя просьбы заблудзіўшай душы, якая не знаходзіць выйсьця, згубіла ўсякую надзею на гэта і плача цяпер, а з плачам вылівае ўсю маркоту, усю гаротнасьць збалелага ў адзіноцтве, у бязмэтным блуканьні чалавека. Здаецца, што там б'ецца чыёсьці спужанае, хворае сэрца, разрываецца на маленькія часткі—і ад болю страшэннага стогне чалавек. Здаецца, што гэта чутны ня гукі струн

і песьні, а крык, безнадзейны крык чалавека, гібеючага пад цяжарам бязьлітаснай рукі жыцьця, крык, які вырываецца з самага нутра чалавека і ляціць на вуліцу, шукае водгуку ў сэрцах другіх людзей і, не знаходзячы яго, гіне ў пустой цішы гэтай халоднай вуліцы, і ўжо чуецца толькі сярдзітае завываньне ветру, зблудзіўшага ў цесных дварох гораду.

«Можа і «яна» таксама чакае блізкага канца, як і «я», падумаў Акуліч, «толькі зусім ня мае сілы і ад таго так шкадуе пражытага. Стала шкода «яе», шкода і жыцьця.—Жывеш, пазнаеш жыцьцё, а ўперадзе ўсё больш непазнанага застаецца; імкнешся ўперад... і на ўсім хаду цябе схопіць за горла—стоп, годзе табе,—і ня спытае згоды. Для чаго-ж тады чалавеку імкнуцца ўсё жыцьцё ўперад; навошта рабіць, ведаючы, што так блізка канец? Можа лепш гэты кароткі час жыцьця думаць і клапаціцца толькі аб сабе?.. Але не! «Гэтая», мусіць, жыла толькі для сябе і ад таго цяпер так мучыцца, не знаходзіць сіл. Чалавек робіць для сябе і для другіх. Калі сёньня ты штонебудзь зрабіў, дык заўтра гэтага ня прыдзецца рабіць другому,—ён пойдзе далей. Так ідзе разьвіцьцё грамадзтва. Кожнае пакаленьне ўпісвае ў кнігу жыцьця свайго старонку. Усе багацьці навукі, тэхнікі,— усё гэта дасягнута чалавекам. Кожнае пакаленьне рабіла сваё, а гэта, зробленае ўсімі пакаленьнямі, зложанае ў адно, дало ўсё гэта багацьце. Адзін чалавек— нішто, разам—магутная сіла, якая ўсё можа зрабіць. Наша пакаленьне таксама зрабіла нямала, яно пачало

новую эпоху ў жыцьці, раскрыла будучым пакаленьням шырокі, сьветлы шлях»...

Раптам ён пачуў нейкія дзіўныя гукі. Нешта аднастайна паціху гудзела, а ў гэта гудзеньне ўрываліся другія адрывістыя гукі, як-бы чалавечыя галасы.

Прайшоў уперад трохі і ўспомніў, што тут блізка ў двары завод, гудзе мотор, а галасы—сьпеў моладзі, перад сходам, пэўна.

Тут прастарней было ветру ў гэтым вялізным заводзкім двары. Ён залятаў сюды, круціўся па ўсіх куток і потым вырываўся зноў на вуліцу, разносіў бадзёрыя словы песьні і кідаў іх кавалкамі жалеза, адсякаючы ад аднаго вялікага кавалка.

Гудзе завод, а праз гудзеньне, здаецца, чутны стукі вялізнага малатка, якія словамі песьні рвуцца ў сэрца, уздымаюць чалавека.

...Мы ня дарма згубілі сілы,
Ня дарам сталью мы грымім.

— Ня дарма трацім сілы, ня дарма,—як гэта проста і праўдзіва!

А адтуль ужо несьліся другія словы:

Бо сталь сваім магутным гулам
Рве путы цемры векавой...

Яму, стоячы ў гэтай цёмнай вуліцы сярод завываньняў ветру, здавалася, што чуе ён ня гудзеньне мотора ў будынку заводу і не завываньне ветру, а мачуе, як грымяць і падаюць разарваныя путы. А малады, задзірасты голас імкнуўся ў неабсяжны прастор, хацеў, каб яго ўсе пачулі:

Куём мы шчасьце для народу...

І зьнікаў, заглушаны моцным подыхам ветру, які адносіў словы ў другі бок, потым зноў перамагаў сілу ветру і ўжо, здавалася, тысячамі галасоў выгаварваў:

Мы кавалі ў юнацкім духам,
Куём мы будучыні дні...

У Акуліча ў тахт гукам песьні пачалі ступаць ногі, забілася ў тахт і сэрца, несьвядома імкнуўся ўперад разам з вялікай магутнай сілай, хада якой чулася ў гуках гэтае песьні.

— Сілы ня дарма трацім, ня дарма,—бо з сілы адзінак складаецца сіла, якая збудуе лепшыя дні. Гэта вось чутны ціхія яшчэ, слабыя стукі малаткоў новых кавалёў. Яны гарачынёй сэрцаў сваіх растапілі сталь і пачынаюць каваць, а хутка стукі гэтыя стануць моцнымі, чутнымі ўсім, усіх узбудзяць і прыцягнуць да гэтае кузьні. Людзі—кавалі, воля і моц іх—малаткі, а сталь—гэта вялізны, неаформаваны яшчэ кавалак жыцьця, па ім б'юць малаткі кавалёў і з неаформаванага кавалка сталі ўжо выступаюць рысы, контуры новай, задуманай кавалямі, формы.

Прайшоў далей і ўбачыў п'янага, які трымаўся за жалеза каля акна магазыну і нешта сам сабе гаварыў. Пачуўшы крокі Акуліча, ён пачаў лаяцца. Лаянка гэта нечым дзікім і аджыўшым здалася на гэтай вуліцы. Хутчэй абышоў п'янага і пайшоў уперад, дзе відны былі людзі.

Перад ім ішла жанчына ў паліто і капялюшыку. Не хацелася даганяць яе і Акуліч сьцішыў ход, але ўбачыў, што яна аглянулася на яго і таксама сьцішыла

ход, а калі падраўняліся, глянула ў твар яму і запытала.

— Можа запалкі маеш, закурым.

Ад папяросы адмовіўся, але выняў запалкі, чыркнуў. З-пад капялюшыка відаць быў ужо ня зусім малады твар.

— Чаго ўглядаешся,—не пазнаеш? А мо' і пазнаеш, я ня прыпомню, хіба можна ўсіх, колькі вас бывае...

Акуліч адразу не разумеў, аб чым яна гаворыць, і глядзеў пытаючым поглядам ёй у твар.

— Н-ну і ўпёрся вачмі! што табе няма куды іх дзець?.. Сумуеш? Сорамна мужчыне гэтак, чаго сумаваць, хадзем гуляць! Жыцьцё—адна толькі хвіліна, празяваеш,—ня вернеш,—значыць, лаві, што плыве паколя рук, карыстайся ўсім, што ёсьць лепшага, пакуль можаш.

«Праститутка», зразумеў Акуліч. Захацелася пагаварыць з ёю.

— А хіба гульнёй сум разгоніш, хіба гэтым возьмеш усё лепшае ад жыцьця?

— А як яшчэ?—адказала яна запытаньнем,—дзе дзеўка і бутэлька, там усё для вас, там суму няма.

— Ну, сёньня пагуляеш, пакуль дзеўка і бутэлька ёсьць, а заўтра?

— А чаму заўтра ня будзе? Калі хочаш—заўсёды будзе... А мо' скупы такі, дык я-ж не за грашыма ганюся, напляваць мне на грошы, рубель, чырвонец,—

мне ўсёроўна, я гуляю, каб здавальненьне мець, каб не сумаваць, як ты...

— Ня сум згоніш, а толькі згоніш душу такой гульнёй. Ну, ты сама скажы—ад сэрца,—ты знайшла здаваленьне? Поўнае здаваленьне можна знайсьці толькі ў карыснай рабоце для людзей і сябе.

— Як відаць, ты комуністы. Дык чаго-ж ты валочышся па нашай вуліцы ў такі час? Я папоў ня слухала і цябе слухаць ня стану. А сабе, калі карыснае зрабіць? Што мне людзі зрабілі? Яны мяне малой не пашкадавалі, мной карысталіся, дык і я іх шкадаваць ня буду. Хочу гуляць—і гуляю... Хіба ад мяне вы, вы мужчыны, не бераце карысьці? Яшчэ чагосьці захацелі, апрача самой! Хопіць, і гэтага ня варта было-б!.. Толькі ты вось знайшоўся—ня мужчына, а ануча. Другія толькі і ходзяць, каб узяць, пазьдзекавацца з цябе, ласкі патрабуюць. Лёгка гэта, скажы, усё жыцьцё пераносіць? Лёгка?

— Дык чаму ня кінеш гэтага, за працу ўзялася-б, цяпер можна гэта зрабіць?

— Цяпер за працу? Я расла без яе, расла гуляшчай. Не магу цяпер пакінуць, хоць і балюча часам, крыўдна.—Потым разам зьмяніла голас.—Затое весела, калі гуляю. Ну, ты сур'ёзны, сапсаваў мне толькі вечар. Вунь да яго пайду, гульну, каб на цябе забыцца. Бывай, я гуляшчая, не па дарозе нам.—Пайшла ўбок, дзе быў п'яны.

Паглядзеў усьлед ёй, падумаў.

«Злуе на другіх, шукаючы здаваленьня, і яшчэ больш крыўды, відаць, знаходзіць, а кінуць свайго ня хоча. Кожная крыўда раніць яе сэрца і яна ня гоіць ран, а залівае іх віном, каб ня бачыць, забыцца пра іх, а чуць дакраніся, зьнімі п'яную плёўку з аднэй раны,—усе разам забаляць тады.

Ужо было недалёка да кватэры. Вуліца сьціхла, толькі дзе-ні-дзе пройдзе, сьпяшаючыся чалавек, ды часам вока ўгледзіць гуляючую пару. Наперадзе бялеў мост над рэчкай,—гэта ад сьнегу. Вецер над рэчкай злосна гудзеў і сыпаў ахапкамі сьнегу, а ўнізе ўжо журчэла вада, вырываючыся з-пад лёду.

З мосту відаць асяродак гораду, сьвеціцца агнямі лямпачак, а на сьвятле вырысоўваюцца цёмныя сілуэты дамоў.

«Як скрынкі вялізныя, стаяць гэтыя халодныя камяніцы. Каб падняў над імі дахі і глянуў у сярэдзіну,—убачыў-бы жыцьцё з яго прыгожым і брыдкім, з усім, што толькі ёсьць у жыцьці. Адно нараджаецца, другое адмірае... Адным толькі сваё ўласнае «я» цікава, і ўсё робіцца імі для гэтага «я», да другіх ім няма справы. Жыцьцё—кароткі міг, бяры ад яго ўсё лепшае для сябе, як асобы. Вось іх мараль. Усё жыцьцё—гульбішча, каб здаволіць свае жаданьні, імкненьні не чалавека, а хутчэй жывёлы, кіньдзюка свайго, і ў гэтым для іх усё шчасьце жыцьця.

У другіх «я» зусім маленькае месца знаходзіць, для іх існуе «мы», колектыў, у якім губіцца «я» і ў той-жа час жыве, здавальняецца. Для гэтых жыцьцё—

таксама кароткі міг, і яны стараюцца скарыстаць яго, як можна паўней,—толькі па-другому. Не для свайго ўласнага маленькага шчасьця, а для таго, каб каваць шчасьце для колектыву, для будучых пакаленьняў, для барацьбы за будучыню—вось дзе знаходзіць поўнае здаваленьне іхнае «я», вось дзе шчасьце іх жыцьця: «Мы ня дарам трацім сілы»,—крычыць іх песьня, ня дарам,—і ў гэтым шчасьце, а што жыцьцё кароткае—ня думаюць аб гэтым, бо другія пакаленьні, сьвежыя, на зьмену ідуць. А я чаго гэта раскіс так,—папракнуў сябе Акуліч,—ня змог дома сядзець, працаваць».

Пачаў успамінаць сваё жыцьцё.—Вось перад вачыма маленькая з саламянымі стрэхамі вёска,—у полі за плугам. З семнаццаці год у завод паступіў, а праз тры гады ўцягнуўся ў рэволюцыйную работу. У рэволюцыю пайшоў з упэўненасьцю ў яе перамогу, з галавой кінуўся, як кідаецца добры плывец у рэчку, даючы нырца з упэўненасьцю, што выплыве на верх. Потым фронт, голад. Партызаншчына ў тылу ў белых, цэлае лета ў лесе бяз хлеба, солі, аднэй бульбай жылі. Выкапаеш ямку, бульбы туды накладзеш, зьверху пяску, трэсак і полымя. Распарыцца бульба і добра, смачна... Потым барацьба за новую вёску, і зноў завод. Сьцежка, пройдзеная за жыцьцё, змотаная ў вялікі клубок, цяпер разматвалася ў памяці і клалася перад вачмі прыгожай, цудоўнай стужкай. Колькі жаданьняў, імкненьняў, пачуцьцяў. Колькі прыгожага бачыў, ідучы гэтай сьцежкай. Чорныя маленькія

плямы няўдач зьнікаюць зусім, ня відаць іх. Ну хіба ня шчасьце вось так пражыць сваё жыцьцё. Жыў і патрацiў сілу ня дарма. Клюб рабочы, насьценная газэта, рогат вясёлы, завод з грукатам машын, песьня комсамольская, трыер, малатарня, купленая колектыўна сялянствам, хата-чытальня, дзяўчына—старшыня камітэту ўзаемадапамогі—усё гэта ясна сьведчыла пра тое, што сілы ня дарма патрачаны. І мая частка сілы ў гэта ўкладзена. А гэта варта і сіл, і жыцьця.

Старое, што засталося, адамрэ, як зіма адмірае. Ёй ужо канец прыйшоў. Ужо сёньня ўдзень па вуліцах беглі ручайкі, журчэлі людзям аб тым, што вясна ідзе, аб гэтым журчыць і вада ў рэчцэ пад мостам; толькі к ночы зіма апошнія сілы напружыла, расьпісала ўзорамі марознымі шыбы акон, зямлю бельлю ўкрыла і дзьмухае ветрам, мяцеліцай, хоча спужаць людзей, але яны не хаваюцца ўжо ў каўнер, бо ведаюць, што зіма прайшла, а ўзоры на шыбах, сьнег і мяцеліца—гэта толькі апавяданьні аб пражытай ужо зіме і больш нічога. Так і ў жыцьці. Гітара з енкамі, п'яны, простытутка—гэта таксама толькі апавяданьне аб пражытым ужо старым, мінулым ужо, бо ўжо новае ідзе, яно ўжо тут, аб ім пеў завод комсамольскімі галасамі і голасам мотора. Малатарня, трыер—гэта сьляды новага. Дык чаго-ж журыцца мне, што канец блізка? Я шчасьліва пражыў свой час, барацьбою за новае запоўніў жыцьцё да краеў, убачыў рысы новага, а цяпер трэба рабіць, пакуль ёсьць яшчэ сілы...

*

Пасьля цемры вуліцы яскрава сьвяціла лямпачка, нібы рада была, што прыйшоў ён вясёлы. За сьцяной было ціха, хоць сьвятло гарэла.

— Якім памёр, значыць, і нічога; заўтра жыцьцё ў гэтым доме будзе ісьці, як ішло, ня спыніцца. Я пайду—жыцьцё таксама будзе ісьці ўперад, маё месца зойме другі, ён будзе лепшым і разумнейшым ад мяне, яму ня прыдзецца праходзіць майго шляху.

Думка аб тым, што сэрца скора адмовіцца працаваць, ужо зусім не непакоіла яго, яна не знаходзіла ў ім сабе месца, і Акуліч сам дзівіўся, чаго ён так спужаўся слоў доктара. Цяпер было адно жаданьне— больш пражыць, каб больш зрабіць.

Узоры на шыбах іскрыліся тысячамі маленькіх зорак ад падаючага на шыбы сьвятла лямпачкі. За акном чуўся яшчэ стогн ветру, ды чуваць было, як трэцца аб сьцяну і шыбы сваёй сьнегавой вопраткай адыходзячая зіма. З ласкавай усьмешкай пазіраў з партрэта Ленін.

—... Трубы ёсьць на заводзе, значыць, адпрацаваўшую пару зусім лёгка будзе адвесьці ў халадзільнік, гэта не багата будзе каштаваць, а завод захавае кожны дзень дванаццаць рублёў, значыць, за год цэлыя тысячы рублёў.

Па паперы бегаў аловак, выводзіў лічбы для заўтрага.

17/III-26 г.
г. Менск.

## ДАЛЯРЫ

Халодныя змрокі тысячамі таемных ценяў сходзяцца ў апусьцелым полі і пацІху, разбаўляючы попельнай муцьцю адыходзячы сьветлы дзень, напаўзаюць на горад, уздымаюцца над зямлёй усё вышэй і вышэй.

Растаюць і зьнікаюць угары кавалкі белых хмар і расчыняюцца недасяжна-далёкія, неабдымна-вялікія, ціхія прасторы неба. І адтуль няпрыкметна, бесьперастанна цячэ на зямлю цёмна-сіні сьвет, поўнячы яе цішынёю чаруючай і прыгожасьцю.

Горад нібы вырас, узьняўся вышэй, напоены гэтай прыгожасьцю, ачысьціўся і неўзаметку апранаецца ў сярэбранае, пазалачонае — запальваюцца першыя агні.

На халодныя пліткі тротуараў з дахаў падаюць гучна кроплі вады, растае іней на стрэхах. Гучна, з кароткімі ляскамі, б'е аб каменьні бруку падкова: чок-чок... З блізкай ускраіны з заводу даносіцца ціхае гудзеньне мотору, то сьціхаючы на хвіліну, то пасіляючыся, і раўнамернае чохканьне машыны: чох-чох, чох-чох, чох-чох... Яму ўторыць водгульле вузкае вуліцы. У гудзеньні мотора і чохканьні машыны чуецца

жыцьцё заводзкае, чуецца дрыжаньне нэрвовае сьцен і рух машын.

Заводы горда ўзьнялі ў неба вялізныя чырвоныя коміны сьцелюць бесьперастанку над горадам пасмы чорнага дыму.

Яшчэ далей, з вакзалу, даносяцца кароткія, адрывістыя, нібы нехаця, крыкі паравозных сьвісткоў. І болей нічога. Ня чуваць галасоў людзей—прыціхлі яны, замерлі...

Разношчык-паштальён Прахор Бульбянік у нязьлічоны раз ішоў праз гарадзкі сад на акраіну гораду, у адзін з завулкаў. У гэтых завулках і вуліцах яму даўно ўсё знаёма. У адным з завулкаў ён пазнаёміўся з маладой дзяўчынай. Прыносіў лісты ў дом, сустракаўся, гутарыў з ёю, жартуючы падоўгу, і зараз час-ад-часу сустракаецца з ёю вось тут, у садзе. Абудзіліся ўспаміны.

У садзе пуста. На сьцежках сыры пясок і лісьцё апаўшае, пашарэўшае, шчыльна прыбітае да пяску дажджамі, заплесьнявелае.

Вечар.

Ціха ў садзе і цёпла.

З дрэў—алешын, кляноў, таполяў,—паціху, адзінокія ападаюць апошнія лісты. Адарвецца няпрыкметна лісток, уздрыгане ціхім болем і потым ціха, кругамі, паплыве ўніз і ціха-ціха ляжа на зямлю, каб не парушыць таемнай прыгожасьці вечара. Упадзе і ніколі болей, ні зеленьню, поўнай сілы, ні жаўцізной залатой адміраньня, не пацешыць вока чалавечае.

Прахор сочыць за падаючымі лісткамі, хоча абавязкова ўлавіць, пачуць гукі паданьня іхнага і ў галаве плаваюць думкі харошыя. Ён папраўляе на плячы скураную лёгкую торбу, абцягвае чорную, кароткую форменную куртку і асьцярожна, каб не парушыць і цішы, пануючай у садзе, і думак сваіх, ступае нагамі ў сыры мяккі пясок.

Халодныя змрокі напаўзаюць на горад.

Паціху ападае лісьцё.

За садам у кашарах нараджаюцца і адтуль даходзяць мяккія, хвалюючыя душу, пераліўчатыя, звонкія зыкі гармоні. Нараджаюцца, растуць і разьлікаюцца залачоным лісьцем у апусьцелым садзе, тають за душу, холадам нейкім абдаюць усё цела і зьнікаюць у зжоўклай зьвяўшай мураве, растаюць і зноў нараджаюцца.

У зыкі гармоні ўмяшаўся, прыйшоўшы адтуль-жа, голас песьні. І тады зыкі прывабнае музыкі і гукі песьні астрожнай цесна спляліся, напоўніліся адвагай сьмелай і паплылі, абыймаючы ўсё больш і больш прастор, над садам, горадам...

Пара, брат, па-а-ра-а!..

У Прахора поўніліся грудзі салодкім, ап'яняючым жаданьнем сьпяваць, падтрымаць песьню,—баяўся, што абарвецца яна, упадзе на зямлю і тады прападзе ўся яе чароўная моц.

У завулку гразкім за садам хутка знайшоў ён добра знаёмы дом і пазваніў. За дзьвярыма затупалі мякка ногі. Адчыніла дзьверы жанчына.

— Каму?

— Ці тут жыве Хмарына?

— Тут, але яна цяпер на заводзе.

— Та-ак. Трэба асабіста. Скажэце ёй, каб абавязкава зайшла на пошту—не пазьней трох дзён. Ей паведамленьне ёсьць, здалёку.

— Добра.

Зачыніліся дзьверы, бразнула завала. Бульбянік паправіў на плячы скураную торбу і пайшоў у цёмны завулак.

*

На заводзе было скарачэньне. Зьменшылі лік падручных пры майстрох каля чанаў, і Саламон папаў на склад чорнарабочым. Цэлых восем гадзін насыпае ён з вялізных засекаў у мяшкі ячмень, крухмал, кладзе з другім рабочым, старэйшым, мяшкі на вагу і адтуль на ваганетцы ідуць яны ў завод. За працаю ныюць плечы, ломіць сярэдзіну, мерзнуць пальцы, сінеюць. Холадна і самому. Апрануты Саламон у кароценькую ватоўку. Дубеюць ногі і холад ад ног разьліваецца па ўсім целе. Ад холаду ў Саламона пад носам дзьве сьветлыя цягучыя кроплі. Ён час-ад-часу моцна цягне носам паветра, кроплі зьнікаюць тады на хвілю і зноў зьяўляюцца. Тады Саламон нацягвае рукаў на далонь і, прытрымліваючы яго пальцамі, далёка заносіць перад сабою правую руку і рукавом абцірае нос.

Насыпае шуфлем Саламон у мяшок ячмень, а другі стары рабочы трымае рукамі мяшок і ля мяшка скача з аднае нагі на другую,—зьмерзьлі.

— А няхай ты згары, жыцьцё наша чорнарабочае. Акалееш, як сабака, тут, дык за цэлую ноч не нагрэцца... Мне яно і нічога яшчэ,—я век свой чорнарабочы, а ты-ж такі амаль майстрам быў, вучыўся-ткі, ля чопу працаваў—і на табе!.. Па-а-радкі...

Гаворачы, падміргвае Саламону і злосна хіхікае.

— Чаму цябе скарацілі,—скажы ты мне,—чаму?

— А як не патрэбен я там, лішні,—дык як-жа трэ' было зрабіць?

— Як гэта не патрэбен? Летась патрэбен быў і ўчора патрэбен быў, а сёньня ўжо ня трэба? Рацыяналізацыя! Хі-хі-хі. А ці што зьмянілася ў заводзе?

— Менш рабочых каля чопаў стала і ўпраўляюцца. Менш і выдаткаў.

— Менш выдаткаў! дык за тое больш і прыбыткаў з нашага брата, рабочага. Чудны ты, Саламон, далібог чудны! Завод наш—рабочы і мы рабочыя, а каму прыбыткі? Усе мы роўны і сабе, здаецца, робім, а нябось, мы з табою па трыццаць сем рублёў выганяем, а дырэктар—па дзьве соцельныя. Во!..

— У капітал ідуць, на будоўлю? ды чорт яе бачыў тую будоўлю! Чакай, малойчык, таго лепшага, а сёньня аднаму добра, жыве ў раскошы, а другі з хлеба на квас перабіваецца, у лахманох ходзіць.

Кожны дзень слухае Саламон гэткія размовы свайго сябра па рабоце, змарыўся, з ім спрачаючыся,—цяпер

найбольш маўчыць або толькі час-ад-часу дражніць таго наўмысьля.

— А ведаеш, дзядзька,—упакоўшчыкам-жа павялічылі плату, я паперку ў канторы бачыў.

— А што-ж ты думаеш? і павялічаць, а нам—хваробы!

— Бо нам і няма за што.

— Як гэта няма?

— А так, бо колькі ні давай табе, дык усё мала! Прывык ты, дзьдзька, у сваю кішэню цягнуць усё, дык і завод увесь хочаш туды. Ня варты мы, каб плацілі болей!

Стары стаіць, сагнуўшыся трошкі над мяшком, трымае ў руках канцы мяшка і маўчыць. А як скончыў Саламон, дык ён сплюнуў злосна ўбок, чмыхнуў носам.

— Ну, годзе! разумею ўжо; інтарэсы агульныя... насыпай лепш. А там убачым...

Пасьля работы Саламон, сьпяшаючыся, зьбіраўся і ішоў на кватэру. Любіў Саламон быць на кватэры вечарамі, хоць і не кватэра ў яго, а толькі кут, у агульнай са старой гаспадыняй хаце, дзе стаяла яго паломаная канапка.

Дома ён садзіўся на канапку, якраз насупроць вялізнае рускае печы, і грэўся. У печы ясна палаюць сухія, тонка паколатыя дровы. Цяплыня з печы даходзіць аж да канапкі і прыемна грэе. Вочы сочаць за агеньчыкамі жоўтымі і сінімі ў печы, а ў галаве скачуць роем думкі вакол аднае, самае вялікае думкі.

неадчэпнае: аб сваім месцы ў заводзе. Завод вялікі, многа рабочых, кожны нібы на сваім месцы. У заводзе растуць і выходзяць з заводу кожны дзень скрынкі поўныя дражджэй з прыемным пахам. Саламон ведае, з чаго робяцца дрожджы, ад пачатку да канца ведае, але толькі вонкава; нутра-ж самога, чаму выходзяць дрожджы, а ні другое што і чаму столькі-та фунтаў дражджэй, а ня болей з пуда сыравіны,—гэтага ня можа зразумець. А пра гэта ўсё яму і хочацца ведаць, да болю ў сэрцы хочацца... Здаецца, што тады толькі ён можа знайсьці ў заводзе сваё належнае месца і зробіць тое, што хоча зрабіць, але чаго,—пакуль-што добра яшчэ ня ўцяміў.

Гэтаму перашкаджала і праца на складзе. Ён ня крыўдзіўся на тое, што ад чопа і самае вытворчасьці перавялі яго ў склад, разумеў, што калі-б ні яго, дык трэ' было-б старэйшага рабочага перавесьці, але баяўся, што гэта перамена пашкодзіць зьдзейсьненьню яго самага таемнага жаданьня.

Пад канапаю ў скрынцы ляжаць у Саламона невялічкія кніжкі аб дражджах,—на рынку выпадкова купіў. Ён уважліва перачытваў гэтыя кніжкі, шмат думаў над імі. Пасьля кніжак завод і ўсё, што рабілася ў чопах, трубках, катлох, засеках станавілася больш блізкім яму. Але адных кніжак мала,—патрэбна большае. Хочацца чытаць кніжкі і хочацца, стоячы за плячыма ў майстра Супрона, сачыць за прабіркамі, шклянкамі, дазнацца, што робіцца ў іх.

І цяпер, хоць Саламон і сагрэўся каля печы, пад носам ў яго дзьве сьветлыя цягучыя кроплі. Ён пахвілінна шморгае носам і рукавом сарочкі падцірае яго. Адпачыўшы-ж, дастае кніжку «Производство дрожжей» і, сагнуўшыся над ёй, дачытвае.

Гаспадыня скончыла працу, падгрэбла жар у печы і села на зэдліку супроць Саламона, цешыцца з яго і чакае, калі то ўзьніме ён вочы ад кнігі. Тады ўспомніць яна, як была калісьці ў Варшаве ў пляменьніка, як той вельмі любіў чытаць кніжкі і праз іх у астрозе з сухотаў памёр. Успомніць, раскажа і сьціхне... Памаўчыць, а потым зноў успомніць, што бачыла ў Варшаве палацы над сажалкамі, чысты прыгожы сад і ў садзе шмат лёкаяў у вопратцы бліскучай.

Саламон уважліва слухае яе і думае аб сваім, аб прачытаным, а яна, задаволеная пакорлівым слухачом, робіць што-ні-што і гаворыць бесьперастанку. Тады дрыжаць рукі ў яе, дрыжаць высахшыя, выцьвіўшыя шчокі і вочы то заплюшчваюцца, то расплюшчваюцца. Але раптам нечакана перарве яна сваю гаворку, памаўчыць хвілю, і адразу ўсхопіцца.

— А бадай яно! Вось старасьць, забылася і пачаставаць цябе!

І ўжо нясе на зэдлік цёпленькія, падсмажаныя на масьле аладкі або яблыкі захаваныя ад восені.

— Паспытай, пахвалі старую!

Дзякуе Саламон старую, частуецца, а яна зноў, пазіраючы, як есьць ён аладачкі, успамінае мінулае...

У яе ўсё жыцьцё ў мінулым, а сучаснае—толькі вохканьне ды чаканьне сьмерці блізкай.

Познымі вечарамі ціха ў хаце і цёпла. Гаспадыня спрасоньня стогне на ложку за печкай або шэпча нешта сама сабе. На комінку курыць газьніца, і скупа кідае сьвятло на радкі дробнага, густога шрыфту. У Саламона самі зьліпаюцца вочы,—баляць. Але ён цьвёрда ўпэўнены, што ўся яго будучыня—ў гэтых радкох чорнага шрыфту, і падоўгу праседжвае над кнігай.

*

За плотам, дашчатым, шэрым, вялізны белы будынак заводу. Дыміць ён у неба круглыя суткі чорнымі густымі клубкамі смалістымі. Без перапынку і перабояў б'ецца сэрца заводзкае,—чохкае рухавік, дрыжаць нэрвова сьцены, аддаецца дрыжаньне гэтае ў зямлі на дварэ.

На доле самым,—рог будынку заводзкага,—пакавальнае аддзяленьне. Дваццаць пяць работніц у шэрагі месьцяцца над доўгімі вузкімі сталамі. У самым куце нізкія шырокія сталы, на іх скрыні дражджэй. Рабочыя забіваюць іх цьвікамі і адсюль на ваганетках коцяць у склад для гатовага тавару.

Соня на заводзе ўжо восьмы год. На стале перад ёю пачкі гатовых, сьвежых дражджэй і слупкі паперак. Крыху сагнуўшыся, стаіць яна над сталом і пакуе. Спрытна выцягваюцца ў адзін час левая рука і тры пальцы правай: тоўсты, паказальны і вялікі; левая

асьцярожна бярэ кавалачак мяккіх дражджэй, а пальцы правай—паперку, і хуткімі нязьметнымі рухамі пакуюць. Рукі сам-сабою, з прывычкі, выцягваюцца, мэханічна згінаюцца і разгінаюцца пальцы, загортваюць кавалачкі дражджэй у паперкі, прыгожа загінаюць рожкі абгорткі, наклейваюць бандэроль і складаюць дзесяткамі. І ва ўсіх так, хто стаіць над сталамі. Штохвіліны неўзаметку, быццам ні да чаго не датыкаючыся, рухаюцца над сталамі рукі. Шамацяць у руках паперкі, мякка кладуцца ў скрынкі дзесяткі пачак дражджэй. Дзяўчаты-ж падлеткі бяруць гэтыя скрынкі і адносяць іх рабочым. А тыя, мернымі стукамі лёгкіх малаткоў, забіваюць скрынкі.

Над сталамі то ціш пануе сумная, то рогат вясёлы, то гаворка шумлівая.

— Бачылі ўчора?

— Што?

— Маньку з камандзірам нашым.

— Ну?

— Шпацыруюць сабе, нікога не заўважаючы, а ён каля Манькі і так, і гэтак—толькі шпорамі лясь ды лясь...

— А яна, нябось, з гонарам!

— У-га! ды з якім яшчэ! Ідзе і нібы не заўважае яго.

— Апрацоўвае яго?

— Ваенізуецца!

І рассыпаецца аддзяленьне рогатам. Рагоча і Манька.

— А бачылі, як размалявалі Пятрука з бутэлькаю?

— Эт! Насьміхаюцца...

— Не насьміхаюцца, а так яму і трэба. Сорам п'янстваваць. У лапленай сарочцы ходзіць, а прапівае. Я-б яго яшчэ і ня так праняла, каб умела!

— Таму-ж і ня ўмееш!

— Дарма! За мяне другія пастараюцца.

А на тым канцы гаворка сур'ёзная, крыху нават злосная.

— Каб-жа час быў, а то прыйдзеш з заводу, дык зразу і ляці, як звар'яцелая, у чаргу,—а чарга ўжо на паўвярсты. Дый яшчэ, бывае, пастаіш і ня хопіць,— няма з чым вячэраць!

— І ці за адным хлебам так?—устаўляе другая.— Чарга і чарга. Пакуль выстаіш усюды—вечар пройдзе, ажно самлееш, з сіл выб'ешся...

— І хто гэта вінават тут? Дзе ўсё падзелася? Гэта-ж у дваццатым годзе лепей было. Ані масла, ані млека, анічагусенькі табе,—як у ваду канула ўсё!

— Усё цэрабкоп наш! Чытала ў газэце, што з маслам зрабілі? У самых няма, а яны куплялі ды другім прадавалі...

У гаворку патроху ўмешваюцца ўсе. Пытаньне аб хлебе, чарзе, масьле трывожыць усіх і ўсім хочацца гаварыць пра гэта.

— У людзей капярацыя, а ў нас спэкуляцыя, дый хочам, каб было што. Яно і ёсьць усё,—ды не клапоцяцца. Каб паставіў у чарод яго, ды паганяў па

рынку з кошыкам, дык тады-б мо' і лепей клапаціліся-б аб пайніках.

Апавядаюць адзін аднаму пра сваё жыцьцё, успамінаюць выпадкі, калі ў каго ў хлебе запалка знайшлася, цьвік або шкла кавалак і лаюць коопэрацыю. Горача пярэчаць комсамолкам, а тыя за коопэрацыю заступаюцца...

— Самі знаем, самі мы за капярацыю! Ты не расказвай мне, як трэба, а паслухай, паглядзі, што ёсьць, ды папраў, а тады хвалі!

— А ты ня хочаш папраўляць? Каб усё мы?

— Ты-ж комсамолка! Твая справа за парадкамі наглядаць і нас вучыць.

За сьцяною блізка чохкае бесьперастанку рухавік, ад машын ідзе па заводзе гул аднастайны. Гул гэты заспакойвае... Соня рада цішыні. Ёй успамінаецца дзяцінства, школа, сяброўкі... Даўнія гады, колькі аб іх успамінаў прыемных! Успаміны—сьляды дзяцінства і юнацтва, нясьцёртыя бегам часу. Прыемна! Хочацца Соні, каб пажыць гэтак яшчэ крыху. А на заводзе праца стамляе, праца даўняя, аднолькавая. І Соня больш думае аб сваім жыцьці па-за заводам, хоча зрабіць яго крыху інакшым, чым яно ёсьць,—больш рознастайным... А яно ня так лёгка зрабіць, ці ня ўмее Соня, яна і сама ня ведае, толькі ўсё адно і там: пакой маленькі, пустэча і больш нічога! А чаму-б ня інакш, чаму-б не па другому неяк жыць, ну хоцьбы ж...

Плывуць ціхія думы. Чохкае бесьперастанку за сьцяной рухавік, гудзяць машыны, дробна-дробна дрыжаць сьцены заводзкія, ціха шамацяць паперкі-абёрткі ў пальцах.

«... Цёплыя вялікія пакоі. На дзьвярох порт'еры ўзорныя з дарагога зялёнага сукна. На вокнах прыгожыя, вышытыя фіраначкі. Мэбля ў пакоях мяккая, аксамітам абітая, і ў пакоях ад гэтага ўсяго спакой ціхі, ласкавы, запрашае сесьці, адпачыць. Сесьці, закінуць на сьпінку крэсла галаў і ня думаць аб цяжкім дні за працай, а марыць аб другім нечым, лёгкім і радасным. У пакоі зьбіраюцца суседзі і цераз сьценку з другога памяшчаньня чутно, як яны час-ад-часу заліваюцца рогатам. Дагадваешся, што аб нечым вясёлым гавораць яны і тады хочацца да іх, хочацца парагатаць разам.

Увойдзеш, а на канапе сядзіць дачка гаспадара і суседка Ядзя: абедзьве ў дарагіх убраньнях; шэпчуцца адна з другой і прыцішна рагочуць. Ядзя-ж, калі рагоча, абавязкова сьцісьне кулакі і стукае сябе па каленах... А на крэсьле-качалцы, насупроць іх, раскачваецца ўзад і ўперад сын гаспадара—прыказчык унівэрмагу; а па пакоях і ў кухні хуткімі крокамі, у падбежку, ходзіць гаспадыня... І ніякіх у іх клопатаў аб жыцьці...

Чуецца і густы рогат гаспадара. Ён служыць у нейкім трэсьце... Хутка пап'юць яны гарбаты або кавы і пойдуць у кіно ці ў тэатр, а заўтра, пасьля абеду, зноў зьбяруцца і зноў будуць гэтак-жа весела га-

варыць, сьмяяцца. Невясёлае, нездаволенасьць сваю яны ад другіх схаваюць у пакоях, у цемры, каб ніхто і ня бачыў... А мы чуць гутарка, дык усё аб дрэнным, усё нездаволены.

Спакойна круціцца калясо іхных дзён, невялічкае, праўда, яно, але даволі памерам, каб умясьціць у сабе ўсе імкненьні, жаданьні, патрэбы іхныя. І часамі, адчувае гэта Соня, зайздросьціць яна ім.

«Чаму-б ня так?..»

Хутка гудок. Выпрастаецца заныўшая за дзень сьпіна, разагнуцца адзеравянелыя пальцы і Соня з другімі ідзе ў харчэўню. А потым або на сход, або ў школу, або яшчэ куды. Нават не памятае добра Соня ўсяго,—да таго томіць праца.

Напружыў грудзі завод, дыхануў яшчэ раз цяжка і раптам запяяў густа, працяжна гудок. Прыціхлі паперы, заварушыліся людзі, сыйшлі са звычайных месц, парушылі лад дзенны, загаманілі ўсе разам. Групкамі і адзінкамі выходзілі за вароты і губляліся ў канцох цямнеючай вуліцы.

*

Зімнія вечары доўгія і адну ў пакоі сумота заядае. Злосьць і на пакой халодны, неабсталяваны, і на людзей... А за сьцяной галасы цягнуць сумную песьню.

Нехта пастукаў у дзеры. Увайшла гаспадыня.

— Адны вы заўсёды, Соф'я Навумаўна,—чаму ня зойдзеце да нас? Мы-ж людзі свае! Я сумысьля

прыйшла запрасіць вас: гарбаткі вып'ем, на картах я вам паваражу... І муж мой кожны раз пытаецца: чаго гэта Соф'я Навумаўна да нас не заходзіць? ці не пакрыўдзілася чаго? спытай, запрасі. А і праўда-ж, вы так даўно былі ў нас, дый то на адну хвілінку. Хадзеце, мілая,—у нас там госьці, хадзеце...

І хочацца Соні пайсьці і быццам ня зусім добра.

— Дзякую, дзякую! Я мо' другім разам. У вас госьці, а я-ж зусім мала знаёма з імі, дый апранута проста...—Нават паднялася з крэсла, навакола павярнулася, паказала вопратку.

— Вельмі добра! Просьценька і добра. Кіньце... Па адзежы сустракаюць, а па розуму праваджаюць. Хадзем, хадзем, Соф'я Навумаўна! Госьці і мы будзем вельмі рады.

І за рукі павяла Соню за сабою.

Насустрач з пакояў ветлівыя пахілы галоў, усьмешкі, ад усіх запрашэньні садзіцца. А лісьлівая гаспадыня дадала:

— Пустэльніца наша ўсё аб сур'ёзных, дзяржаўнае значнасьці, пытаньнях думае, чытае і... сумуе часам. Я чуць упрасіла пайсьці да нас, аддаць нам хоць хвіліначку часу. Сядзем тут, Соф'я Навумаўна, а Дорачка падасьць нам гарбаткі. Вось так! А вы, госьці, да стала бліжэй, да стала!

На стале ў талерках піражныя свайго печыва, сухарыкі салодкія, стаяла варэньне, гарбата... Гарачая пара над шклянкамі ўздымаецца і прыемна казыча ў носе, абагравае. І думаецца ад гэтага, што ў хар-

чэўні гарбата не такая; а мо' і такая, але толькі п'еш яе заўсёды сьпяшаючыся, не ў такім пакоі, на брудным стале, засьмечаным.

Довід, сын гаспадарскі, малады, ветлівы... Сядзіць якраз супроць Соні і то сухарыкі, то піражныя ёй падстаўляе, або варэньня ў сподачак падкладае і ўсё гэта з прыказкамі ветлівымі, добрымі. Соня з усьмешкай саромлівай дзякуе яго, асьцярожна пальцамі бярэ піражныя і думае сама сабе:

«Людзі яны, як і другія ўсе; нават куды лепшыя за многіх маіх знаёмых—нічога ў іх я ня бачу асаблівага, чужога».

А раней думала, што якраз ёсьць у іх нешта гэтае чужое, што адразу кідаецца ў вочы і не дае магчымасьці сыйсьціся з імі, што заўсёды павінна супярэчнасьцю стаяць паміж імі і ёй. А тут—звычайныя людзі, як і другія.

Гаспадар таксама ўсю ўвагу ёй аддае. Ён мае такі прыемны выгляд твару—мяккі, добры. Ён апавядае, як у трэсьце з нейкім грамадзянінам з Ч. умовы складалі і злавілі таго на злоўжываньні. Яго нават шчыра абураюць паводзіны нясумленнага грамадзяніна.

— Я разумею, чалавек хоча больш зарабіць, больш прыбытку, лепей жыць—гэта натуральна; але гэта трэба рабіць з сумленьнем. Сумленьне—галоўнае ў справе. Бяз сумленьня нельга весьці справы. О, я гэта добра разумею! Каб мне столькі здароўя, колькі я ўмоў рабіў на сваім вяку і з прыватнымі асобамі, і з дзяржаваю... Усе на слова верылі Абраму Кантаро-

вічу, дальбог, на слова. І цяпер верацъ. Сумленьне! Нічога Соф'я Навумаўна, што я, можа, і нэпман па-вашаму, па сучаснаму паняцьцю, але я сумленны чалавек, я, чым магу, пасабляю дзяржаве. І не таму, што і для свае карысьці гэта, не. Цьфу—для сябе! навошта для сябе! Я справай магу пасобіць сваёй дзяржаве і пасабляю! Паверце мне!

І Соні хацелася сказаць яму ў адказ нешта прыемнае.

Неўзаметку бег час... На стале зьявіліся ігрушы, яблыкі, вінаград, карты.

— Соф'я Навумаўна, вам, толькі вам гэтую галінку «дамскіх пальчыкаў». Вазьмеце.

І Довід асьцярожна за кончык трымае галінку, дае яе Соні.

Жартуючы, зьняла Соня карты. Гаспадыня раскідала іх па стале і вываражыла Соні—чарнявага валета, прыемныя весткі ў блізкім часе і нечаканае вялікае шчасьце ў будучыні. Ах, гэтае шчасьце! Зэлда Язэпаўна добра ведае шчасьце. Год дваццаць таму назад варажыла ёй старая цыганка ў мястэчку—збылося многае з прыварожанага і з тае пары цьвёрда верыць яна ў карты. Угаварвае верыць і Соню...

Соня сьмяецца, нібы жартуючы, згаджаецца, а ў самой недзе далёка, у нетрах душы хвалююцца нясьмелыя жаданьні і думкі.

«Няхай-бы і збылося... а мо' і сапраўды будзе так, як карты паказваюць, чаму-ж...»

І жаданьне, і думка надзеяй аформляліся ў прыгожую вярозу аб нечаканым шчасьці.

Пасьля карт—на стале лёгкая, смачная вячэра. Гаспадар дастаў з шафы бутэльку лікёру і малюсенечкія пекныя чарачкі.

— Мне, старых звычаяў чалавеку, цяжка бяз гэтага, не магу. І вас запрасіў-бы, Соф'я Навумаўна, але баюся, баюся...

А сам падміргвае і налівае ўсе чарачкі,—налівае і ёй.

— А што тут нядобрага? Чарачку віна да вячэры і мы з Со'яй Навумаўнай вып'ем, ці-ж ня праўда? Вось з гэтых...

І Зэлда Язэпаўна паставіла побач дзьве поўненькія чарачкі. Віно ў іх пераліваецца сьветлае, пахучае. Гаспадар чарку ўзяў, з Соняй чокнуцца хоча.

— Саграшэце, Соф'я Навумаўна, са мной, з старым... Гэта ня грэх!

У Соні думка.

«Адмаўляцца? Якая ў гэтым патрэба? Адну чарку, жартуючы,—гэта-ж не правіна?»

І з усьмешкаю ўзяла яна двума пальцамі чарку, чокнулася з усімі, выпіла.

Вячэралі доўга. Пілі яшчэ па чарцы. І яшчэ варажылі...

А ноччу Соня курчылася пад ненагрэтай коўдрай і адганяла прычэплівыя думкі аб чарнявым валеце. Перад вачыма выплываў яго ласкавы твар і рука жаночая белая з галінкай «дамскіх пальчыкаў».

*

Праз пяць месяцаў Саламона зноў перавялі на работу да чопу. Але за гэтых пяць месяцаў, што ён прабыў на складзе, ранейшае жаданьне знайсьці сваё месца ў заводзе,—усё ведаць, усё зразумець,— вырасла ў жаданьне зрабіць для заводу нешта вялікае, карыснае, чаго яшчэ ніхто не зрабіў. Літаратура, якую ён перачытаў за гэты час, упэўніла яго ў тым, што пры ўмовах напружанай вучобы і практыкі ў ляборатрыі, ён што-ні-што здолее зрабіць. Гэта зараз стала галоўным у яго жыцьці, у думках, стала адзінай яго мэтай.

Завод зрабіўся для Саламона невычарпальнай крыніцай ведаў і ўражаньняў. Дома, на кватэры, ён бывае цяпер рэдка. Там пануе жорсткасьць жыцьця неразумная, там яно губіцца ў дробязях бытавых; там няма людзей, з агульнымі для многіх мэтамі... Гэта балюча раніла яго душу.

Саламон жыў ужо на другой кватэры,—у рабочага-будаўніка. Ранейшая старэнькая гаспадыня памерла. А сучасная гаспадыня—чалавек злосны, жыве з ранку і да вечара охамі і гаворкамі аб суседзях, суседках, або чуткамі, якія ходзяць па рынку. Гэта— асалода душы яе.

Як толькі прыйдзе Саламон дадому, дык яна і пачне аб тым, што ў шостай харчэўні кухара ноччу зарэзаць хацелі, што ўчора на Камароўцы атруцілася маладая перад самым вясельлем, што ля разьніцы людзі ад

злосьці, стоячы ў чарзе, разбурылі, разьбілі коопэратыў і што рабочыя з разьніцы пабілі іх за гэта. І ўсё охкае, охкае...

— Ох-хо-хо, ох-хо-хо,—што-ж гэта будзе? што гэта будзе? Нацкавалі людзей адзін на аднаго, б'юцца людзі, а хто вінаваты, хто вінаваты...

Цягнецца яе плаксівая, дакучлівая размова і нікуды ад яе не ўцячэш; яна прытупляе мазгі, аблытвае думкі.

— Ой, ніколі мы ня ведалі жыцьця такога! Хлеб па сем рублёў пуд, а казала на рынку знаёмая яўрэйка (яны-ж усё ведаюць), што ў другіх мясцох ужо і па дзесяць... гэта-ж, ня дай бог! А на рынку сёньня бульбу ў чалавека адабралі, што дорага запрасіў, і ўсю расьцягалі, раскідалі...

Ведае Саламон, што дзевяць дзесятых з яе слоў— гэта хлусьня, плёткі абывательскія, перапалох, але як слухае, дык ня можа спакойным быць, бо яны глушаць думкі, прытупляюць мазгі...

А вечарамі прыходзіў з суседам п'яны гаспадар. Зімой ён мала зарабляў: з сякерай па рынку хадзіў— дзе дроў наколе, дзе што іншае невялічкае зробіць, але акуратна прапіваў значную долю і гэтага заробку. Зараз вясна, працы многа, больш грошай і ён п'е больш...

Саламона гаспадар,—як хлапца з заводу, крыху баяўся, глядзеў на яго ў некаторай ступені—як на прадстаўніка ўлады; але кожны вечар быў злосны, усю злосьць пераносіў на ўладу і выліваў яе Саламону.

Заходзячы п'яным у хату, ён заўсёды насьмешліва неяк кланяўся Саламону і пытаў:

— Як жывеце, маецеся, ваша мосьць?

Саламон прызвычаіўся да гэтага і адказваў адным словам.

— Добра!

— Добра? Чаму-ж не, добра? А ці ня чуў штонебудзь новага па горадзе, людзі вы адукаваныя, фабрычныя? Ці ня ведаеш, чаму людзей морыць улада ваша, маць яе растак!..

І плявузгаліся словы агідныя, злосныя. Гаспадар стаяў, варочаў зрэнкамі вачэй, махаў кулакамі ў Саламона перад тварам і бясконца гаварыў. Ад яго несла прыкрым пахам гарэлкі. За гаспадаром падымаўся з лаўкі сусед і, нясьмела тупаючы ззаду, устаўляў свае словы:

— Так, так, ніякага парадку!

Гэта надавала сьмеласьці гаспадару і ён плявузгаў далей.

— Запомні і скажы ім усім, што наш чалавек— рабочы,—пры гэтым ён паказваў на суседа,—ня хоча такога парадку; скажы ім, што партыя ваша, маць яе... людзей у магілу гоніць такімі парадкамі. Ніколі гэткага ня было, каб гандляры ўсё пахавалі... Скажы, што я ўсіх комуністых парэжу, хай толькі дадуць мне права! Я не баюся. Ідзі заяўляй, пакліч міліцыю і скажы, што фэльдфэбель гвардыі яго вялікасьці Паскудзін незадаволены парадкамі вашымі... ідзі, ідзі!.. Я рабочы; хто мае права мне што-небудзь зрабіць?..

Увесь прапахлы гарэлкай, хістаецца. Прыкры... А з рота белай пенай падае на грудзі на сарочку сьліна.

У Саламона ад усяго гэтага аж кіпела ў сярэдзіне, расла злосьць і пачуцьцё агіднасьці—было жаданьне схапіць яго, сьціснуць за горла, паваліць і таптаць, таптаць нагамі... Гэта прарывалася ў гарачых злосных словах. Ён ведаў, што тлумачэньням тут ня месца; што яго трэба біць, біць словамі, фактамі.

Ня стрымаўшыся, ён усхватваўся з крэсла і крычаў гаспадару:

— Ты брэшаш, грамадзянін,—брэшаш! Рабочы—нашы парадкі хоча, пайдзі запытай, ён табе скажа. Ня хочаш ты іх, ты толькі! Шкурнік! Працаваць ня хочаш! За чарку прадаешся, фэльдфэбель! То-та і ёсьць, што фэльдфэбель ты, а не рабочы: шкуру толькі рабочую надзеў. Садраць яе з цябе трэба, каб не паганіў званьня рабочага... Спаць ідзі, лепей ды менш слухай спэкулянтаў і сальнікаў з Ніжняга рынку, а то давядуць яны цябе да ручкі... П'яніца!

Гаспадар змоўк на хвіліну і адыходзіў ад Саламона, але потым, ужо цішэй крыху, зноў гаварыў:

— А хлеба чаму няма,—хлеба? Што чароды завялі па ўсіх кутках? хто вінен тут? Я піў і раней ня меней, але жыў лепей, а цяпер, што ў мяне за жыцьцё?

І блююочы бруднымі паганымі словамі ў бок Саламона, ён, урэшце, адыходзіў зусім і клікаў суседа куды-кольвечы пайсьці. Саламон зачыняўся ў сваім

пакоі і думаў аб гэтым, толькі-што бачаным жыцьці і жыцьці на заводзе.

У Саламона быў свой цьвёрды, непарушны лад думак аб жыцьці. Ён цьвёрда верыў у канечныя мэты, пастаўленыя партыяй, рэволюцыяй. Ён яскрава ўяўляў гэтае будучае жыцьцё і нават фізычна адчуваў кавалкі яго ў сёньнешнім: бачыў яго ў канавах раскапаных па горадзе, у кінутых па вуліцах трамвайных рэйках і ў рыштаваньні новых вялікіх камяніц, бачыў яго штодня і ў газэтных радкох, якія нясуць радасныя весткі аб ідучым новым жыцьці, з усіх куткоў Беларусі, Саюзу...

Вось яно, перад вачыма, вялізарнае, неабсяжнае ў сваіх мэтах...

У імя яго лепшыя з людзей у мінулым тысячы вёрст зьвінелі кайданамі аж да сібірскай тайгі. У імя яго гінулі тысячы маладых, прыгожых жыцьцяў у каменных мяшкох царскіх астрогаў, турмаў. Толькі ў імя яго! А сёньня вось гэтае бруднае шумавіньне дробязяй імкнецца засланіць сабою вялікія кавалкі растучага новага ад многіх тых, хто прывык не тварыць жыцьцё, а браць яго ўжо праверанным, гатовым; хто, забыўшыся аб зусім нядаўнім яшчэ страшным мінулым, патрабуе новага жыцьця поўнасьцю, безадкладна,—сёньня-ж...

І з гэтым зьяўлялася ў Саламона і расло жаданьне ўсё аддаць, усё зрабіць, каб толькі хоць на адзін крок яшчэ наблізіць так ясна бачаную ім будучыню...

*

Зэлда Язэпаўна ляжала пад цёплаю дарагою коўдраю і ўсьміхалася... Сагрэтая пасьцель прыемна вабіла. А на крэсьле перад ложкам сядзеў муж.

— Лажыся, лажыся, Абрам! А справы—заўтра; яны кожны дзень. Днёў-жа ў бога таксама шмат...

Усьміхаецца яна з-за цёплай коўдры, абапёршыся локцем на падушку пуховую і далоньню шырокай, пухлай падтрымлівае шчаку. Цераз сарочку тонкую выпінаюцца круглыя грудзі... Гаспадар даўно ўжо ня думае аб справах, ён пацïху зазірае за сарочку жонкі, на яе пухкія грудзі, і ўсьміхаецца задаволеным нутраным сьмехам.

Падсунуў бліжэй да ложка крэсла, гладзіць голае плячо жонкі.

— Ня ведаю, як ты, а я—усё думаю, думаю...

— Аб гэтым?

— Ага!

— Соня—добры чалавек,—якраз Довіду пара. А тое, што яна комуністка? Ну і добра, няхай сабе комуністка? І комуністка згодзіцца да справы!

— А калі яна часамі ды гэтую справу папсуе? Калі ад яе ды будзе цорэс [1]) ?

— Ужо і папсуе? Чаму папсуе? Чаму цорэс? Соня—разумны чалавек і Довід разумны; умее справу весьці. Пакуль у паасобку—яна сваю справу ведае, а ён сваю, а як сойдуцца разам, ды над аднэй справай абое па-

[1]) Гора.

думаюць і будзе вельмі добра і будзе нам а грэйсэ нуц [1]).

І жонка пацiхеньку рагоча; рагоча і дрыжыць на падушцы, і дрыжаць ад гэтага грудзі яе пухкія.

— Хі-хі-хі!

Рагоча і гаспадар.

— Знацца, трэба...

— Ну?

— Паспрабаваць.

— Паспрабаваць?

— Нам бог дапаможа.

— Няхай: зол зайн азэй [2])!

— Ты, Зэлдэ, нядрэнна надумала. Довід-жа на яе так заглядаецца, так смачна заглядаецца, ну, проста, як на цымус. Яна комуністка, дык... Ой, было-б добра! Партыйная сям'я! Я служу сабе, «чырвоны спэц», але маю і прыватную практыку. Ха-ха-ха! Доктару—дазволена мець прыватную практыку, а мне чаму не? Дый нават ні я! Гандлёвая фірма «Зэлдэ Кантаровіч!» Парт'ячэйка Соф'і Навумаўны! І універмаг—«Довіда Кантаровіча». Я зусім збоку-прыпёку. Ха-ха-ха!

Сьмяецца і Зэлда.

— Я ніколі не надумаю кепскага. Я паважаю Соф'ю Навумаўну і люблю Довіда. Усё добра сойдзе і нам шмат карысьці будзе. Толькі...

— Ну?

---

1) Вялікая карысьць.

2) Хай будзе так.

— ... Як яна.

— Г-м-м... Хіба ты ня бачыш? Яны-ж сябруюць, чырванеюць пры людзях абое. Трэба рабіць. Каму-ж ня хочацца жыць лепей, чым ён жыве?..

Абрам Кантаровіч распрануўся і палез, тоўсты, непаваротлівы, пад сагрэтую жонкаю коўдру. Лежачы, ён доўга гладзіў яе руку, казытаў вусамі яе твар і скрозь вусы ціханька сыпаў нядобрым рагатком.

— Хі-хі-хі... Заўтра ўмова са Слуцкімі. Купяць, прывязуць, прадамо. Чатыры—на сем... Чым дрэнна жыць цяпер? Хі-хі-хі... Добра жыць, умець толькі трэба. Увайдзі ў іх жыцьцё і суньдя сабе краёчкам... краёчкам, каб не адставаць ад яго і браць усё, што пападзецца. О, я заўсёды ў ногу з жыцьцём іду. Хі-хі-хі... Дрэнна, хто ідзе супроць, а мне—чаго супроць?.. Пажыву—пагляджу.

*

Заўтра новы год.

У заводзкім клюбе вечарам сёньня кароценькі даклад аб дасягненьнях заводу і пасьля концэрт сваімі сіламі... Соня з работы прыйшла рана і сумуе ў пакоі... Халаднавата ў ім і пустэча. Можна пайсьці ў клюб, там ёсьць людзі, але штось яе затрымвае, чагосьці яна сама чакае.

У пакой увайшла гаспадыня, села насупроць, уздыхае.

— Ведаеце, Соф'я Навумаўна, сумна жыць у такіх умовах, як вашыя. Ды яшчэ гэтак цяжка працаваць

вам, жанчыне! Вы-ж ні хвілінкі ня маеце адпачынку! Мне часта-часта хочацца з вамі пасядзець, пагутарыць пра сёе-тое, але вас так рэдка можна сустрэць! Вось і сёньня, мусіць?..

— У нас у клюбе сёньня вечар, даклад. Туды, пэўна, пайду...

— Вось, бачыце! А я прыйшла запрасіць вас да сябе, хоць на сёнешні вечар толькі... У клюбе-ж сёньня надта шмат людзей. У такі холад, далячыня. А мы-б пасядзелі, пагутарылі... У новы год ёсьць аб чым успомніць! Мы-ж—савецкія людзі, разам з усімі сьвяткуем новы год. Падзялеце з намі гэты вечар, адзін хоць вечар! І Довід прасіў... У нас так мала добрых знаёмых!

Тон Зэлды падкупляў.

«Ну, чаму сапраўды не пайсьці, не пасядзець з імі, не расказаць чаго? Яны цікавяцца ўсім, усім,—думала Соня,—дый Довід прасіў, а ён так уважліва слухае мяне».

— Вы нам навіны раскажаце, гарбаткі вып'ем, потым у кіно разам пойдзем.

На гэтым Зэлда Язэпаўна ўзьнялася са стула, а разам за ёю мэханічна ўстала і Соня.

У пакоях усё так знаёма. Ядзя, а з ёю побач Довід,—аб нечым гутараць. Як толькі зайшла Соня, ён зьмяніўся ў твары, пачырванеў, пачаў блытацца ў гаворцы, схапіўся з месца...

— Я ўсё ніяк не зьбяруся да вас за кніжкамі.

— Чаму-ж? Прыходзьце, калі я дома. У мяне бываюць часамі добрыя кнігі.

— Дзякую, дзякую, я з прыемнасьцю прыеду. А вы будзеце кіраваць мной у чытаньні. Цяпер так многа кніг,—асабліва палітычных, што і ня ведаеш, за якую ўзяцца?..

Сядзелі ў мяккіх цёплых крэслах. Абрам Кантаровіч,—ах, гэты мілы Абрам Кантаровіч! Ён так цікава і хітра апавядае пра справы ў сваім трэсьце. У яго апавяданьнях усе, асабліва комуністыя, выглядаюць такімі прастакамі, неразумнымі... Праўда, Абрам Кантаровіч выбачае ім, яны пролетары, яны-ж такі заняты народ, такі заняты! Сходы, паседжаньні, камісіі! О, ён гэта разумее—кіраваць усёй дзяржавай... Як «чырвоны спэц», ён і сам дапамагае, усімі сіламі дапамагае. Ён можа ілюстраваць гэта цэлым шэрагам фактаў... У Соні абуджаецца і расьце добрае, цёплае пачуцьцё да Абрама Кантаровіча...

— Вы добры і сумленны чалавек. Каб усе так аддана дапамагалі дзяржаве, ня было-б тых недарэчнасьцяй, аб якіх гаворыце.

А побач сядзіць Довід і так лісьліва дадае:

— А я, ведаеце, многа думаў аб партыі. Толькі будучы ў партыі, можна сапраўды працаваць. Я-ж служачы, толькі маленькі служачы. У дадатак цяпер яшчэ такая строгасьць, такая строгасьць. А мне так хочацца працаваць!

— Дык працаваць можна і ня будучы ў партыі!

— Яно то так, але зразумейце самі, хіба-ж гэта тое самае? Тут можна займацца толькі маленькай справай, а ў мяне сіл, адданасьці хапіла-б і на вялікую! Да беспартыйнага недаверлівасьць, насьцярожанасьць вечная да яго, а мяне мучыць гэта.

— Партыя верыць беспартыйным, якія давялі...

— Але вы не разумееце, Соф'я Навумаўна, як гэта цяжка! Я ня ведаю, як другія, а ў мяне адна мэта—быць у партыі. Хай сабе хоць дзесяць год кандыдатам, хоць дзесяць год праверкі,—я ўсё вытрымаю, абы толькі ў партыі, абы бліжэй, каб болей зрабіць...

— Працуйце Довід Абрамавіч, працуйце, заваёўвайце права быць у партыі сваёй работай...

— Я заваюю!

А гаспадыня паказвала ў пакоях мэблю, убраньні.

— Мы так бедна жывем, так бедна. Ужо ўсё старое, усё трэба зьмяніць.

— Гэта вы дарэмна, вы жывяце добра яшчэ...

— Ну, дзе яно добра? Усё такое старасьвецкае. Другія жывуць у аднэй раскошы, а ў нас ва ўсім недахват. Адно толькі, што мы савецкія людзі: ня гонімся за гэтым, жывем, як прыходзіцца.

Пілі гарбату. Потым адсунулі стол да сьцяны. Зэлда зайграла на старым папсаваным крыху піяніно вальс. Соня закружылася ў вальсе з Довідам. Гэта так прыемна! Ён асьцярожна рукой трымае, ледзь датыкаецца яе стану і ў той-жа час моцна горне ўсю

яе да сябе. Яны вальсуюць, нават забыліся, як скончылі, а ім ужо крычаць брава, плёскаюць у далоні.

— Ого, Соф'я Навумаўна, вы так добра вальсуеце...

— Ах, дзе там! Я так даўно ўжо вальсавала, што і забылася нават.

— Не! З вамі так лёгка вальсаваць...

Соня чырванела і радавалася. Потым скакалі яшчэ кокетку і Соня, усьміхаючыся Довіду, сапраўды кокетнічыла, заглядала яму ўвесь час у вочы.

А ў кіно глядзелі «Чалавек з рэсторану». Соня была ў захапленьні ад карціны і няпрыкметна, міма-волі брала рукі Довіда, сьціскала іх, хілілася бліжэй да яго...

*

«Ці не аб гэтым варажылі карты? Чарнявы валет! Можа і ён? О, я была-б шчасьліваю! Дарма, што ён беспартыйны; ён усё-ж наш чалавек, ён здолее шмат карыснага зрабіць і зможа быць у партыі! А зрэшты—ці гэта настолькі важна ўжо,—працуюць-жа сотні беспартыйных!.. А ён такі добры, разумны і ласкавы».

Соня сумысьля прыпаміпала ўсе падрабязнасьці сваіх апошніх спатканьняў з Довідам. Так,—ён яе пакахаў,—гэта відаць... гэта яна ведае з яго заблытанай гаворкі з ёю, з яго саромлівых поглядаў пры спатканьнях... Гэтак сама ведае яна і аб сваім да яго пачуцьці,—праўда яшчэ ня зусім для яе выразным...

Соні ўжо дваццаць пяць год, і яна ўсё часьцей і больш думае аб сваёй будучыні ў апошнія дні і ўсе яе думкі аб будучыні чамусьці абавязкова кружацца наўкола чарнявага валета.

«Толькі крыху абсталявацца трэба, абавязкова... Дзе-б толькі грошай дастаць,—а яны так патрэбны! Заработку не хапае; ім можна пражыць толькі вось гэтак проста, без усялякае раскошы... Дый хіба гэта раскоша, калі маеш крыху лепшае паліто, для ўрачыстых дзён, не адну, а некалькі сукенак, ці лепшыя фіранкі на вокны, лепшы ложак. А гэтага старога ложка сорамна цават».

І Соня быццам сапраўды сёньня ўпяршыню ўбачыла свой парыжэлы, выцьвіўшы ложак і заўважыла яго раскірэчаныя падагнутыя ножкі.

Яна падымалася і яшчэ раз аглядвала ложак, а потым, заплюсьніўшы вочы, у роспачы кінулася на падушку. Але хутка і ложак, і паліто адплываюць кудысьці далёка і застаецца толькі ён—чарнявы...

Вось ён стаіць каля яе і саромна пазірае ў вочы. Потым садзіцца на ложак, па яе запрашэньню бярэ яе рукі, цалуе, абдымае, моцна-моцна сьціскае ў абдымках яе цела ў аднэй кашулі... Цалуе яе твар, вочы, плечы голыя, а яна хавае галаву ў яго на грудзёх, туліцца да яго ўсім целам бліжэй і бліжэй... Цела яе ахапляе салодкая палкая гарачыня...

Мары зьнікаюць. Напружанае, расхваляванае цела ападае і вяне... Тады яна зноў заплюшчвае вочы і

выклікае нядаўнія мары, каб зноў адчуваць яго абдымкі, пацалункі, і самой абыймаць яго за шыю сваімі сагрэтымі голымі рукамі, туліць да сябе...

*

Чатыры дні ва ўсіх аддзяленьнях заводу віселі абвесткі аб агульным сходзе рабочых і служачых з дакладам дырэктара аб пераабсталяваньні заводу. На чацьверты дзень з сямі гадзін вечара пачалі зьбірацца ў клюбе. Соня прыйшла без спазьненьня і, аглядзеўшыся, далучылася да сяброўак. Да пачатку сходу, зазвычай спозьненага, гаварылі аб усім, што здарылася за апошнія дні ў заводзе. Соня слухала размовы сяброўак, спрэчкі іхныя, потым сама ўмяшалася ў гаворку і горача спрачалася з комсамолкай Марыляй аб дабрабыце работніц. Пачалося з таго, што адна старэйшая работніца пакрыўдзілася на немагчымасьць з-за дзяцей і хаты наведваць вечарамі сходы ці гурток... Другая запярэчыла ёй, Марыля падтрымала, а потым у кругу пачалі сам-на-сам спрачацца толькі Марыля і Соня. Другія толькі слухалі або ўстаўлялі паасобныя словы...

Але раптам спрэчкі спыніў званок старшыні. За сталом ужо сядзеў дырэктар, нечага шукаў у пачцы раскладзеных перад ім табліц, а побач зачытваў абвестку дня старшыня заўкому.

Пачаўся даклад. Дырэктар расказаў аб мінулым заводу, прыпамятаў сходу, як на завод з месяц падрад хадзіў інжынэр; растлумачыў, што гэты інжынэр з

Нямеччыны і што ён і складаў проект пераабсталяваньня заводу. Зачытаў табліцы, што даводзілі значнае патаненьне продукцыі заводу, якое дасьць пераабсталяваньне, а ў самым канцы гаварыў аб няўважлівых адносінах з боку некаторых рабочых да матэрыялу, інструмантаў.

Адзначыў нават прыклад значнага глуму пустых скрынак пры пераносцы. Гаварыў і аб прагулах, і аб частых спазьненьнях на работу.

Соня ўважліва выслухала даклад. На сходзе яна адчувала сябе зусім інакш як дома; інакш і думала. Ад таго, што ўвесь сход уважліва слухаў дырэктара і ад таго, што ён гаварыў сур'ёзна і абгрунтавана, у Соні таксама зьявілася моцнае жаданьне выйсьці і перад сходам сказаць аб сваім аддзяленьні. Гэта яе абавязак, як комуністкі і работніцы, яна добра разумела гэта. А ў іхным аддзяленьні якраз наглядаюцца частыя спазьненьні і непатрэбныя з-за гаворак або жартаў перапынкі ў працы і шэраг другіх дробных фактаў, якія сьведчаць аб адсутнасьці дысцыпліны.

Гарачыя спрэчкі цягнуліся аж да адзінаццатай гадзіны ночы. Пасьля свайго выступленьня Соня адчула боль у галаве і ныцьцё ў грудзях... Гэта ад хваляваньня, бо гаварыла яна заўсёды ад усяго сэрца і моцна хвалявалася перад выступленьнем. І пасьля выступленьня была задаволена, адчувала сябе ў большай меры зьвязанай з заводам, з таварышамі па працы...

Пры выйсьці са сходу, сустрэлася з сакратаром ячэйкі. Прывіталіся. Ён спытаў яе аб прычынах ненаведваньня партшколы. Нешта тлумачыла ў адказ і жартавала...

Быў узьняты добры настрой.

*

Саламона мучыла старое, даўняе жаданьне. Яно перайшло ў пал, не давало спакою...

Пуд сыравіны дае ўсяго толькі дваццаць сем фунтаў дражджэй! Усяго. Праўда, здаецца гэта не яго, Саламона, справа, колькі фунтаў дражджэй атрымліваецца з пуда сыравіны, мог-бы ён аб гэтым і ня думаць, але пасьля таго, як пазнаў з кніжкі магчымасьці разьвіцьця дражджавой вытворчасьці, ня думаць аб гэтым ён ужо ня мог. Яго цягнула да заводзкай лябораторыі. У час абедзеных перапынкаў ён бег у лябораторыю і, стоячы побач з майстрам Супронам, назіраў за тым, што рабілася на палічках і сталох у прабірках, шклянках і коўбах, напоўненых вадкасьцю. Хацелася ўцяміць таемнасьці гэтых прабірак і шклянак, зразумець сэнс хэмічных процэсаў, што адбываюцца ў коўбе ў час награваньня майстрам. Ён пасябраваў з Супронам і той запрашаў на працу да сябе, на дапамогу...

— Ты хлопец кемкі, ты хутка ўсё ўцяміш і будзем мы з табой варыць тут штукі розныя. Трэба гэта. І кніжка табе на-руку якраз.

Пасьля такіх спатканьняў з майстрам Саламон вечарамі браўся за кніжку і адаляваў адну за другою хэмічныя формулы і з кожным посьпехам яшчэ мацнейшым было жаданьне пératварыць іх у жыцьцё.

На вытворчай нарадзе, падагрэты кніжкамі і Супронам, Саламон выступіў і пачаў даводзіць магчымасьць павышэньня проценту карыснасьці сыравіны, нават пры існуючым процэсе працы толькі пры маленечкіх палепшаньнях абсталяваньня.

Дырэктар і адзін з майстроў выступілі супроць... Яны даводзілі, што бліжэйшая пэрспэктыва заводу не ў павышэньні проценту выррабу з пуда сыравіны, а ў пытаньні продукцыі, шляхам пераабсталяваньня, якое дасьць магчымасьць паскорыць процэс выррабу адзінкі дражджэй. Падвышэньнем-жа проценту карыснасьці адзінкі сыравіны,—казалі яны,—займемся праз некалькі год.

Ніхто Саламона не падтрымаў. А ноччу яму сьнілася, што стаіць ён над прабіркамі і шклянкамі ў лябораторыі, патроху штосьці па чарзе падбаўляе ў іх, згодна завучаным формулам і растуць ад гэтага ў прабірках, шклянках, бутэльках, коўбах дрожджы, вырастаюць у нешта вялізнае, выходзяць з прабірак і шклянак і запаўняюць усю лябораторыю. Саламон ускрыкнуў ад радасьці і абудзіўся ўспацелы...

Жаданьне працаваць у лябораторыі зрабілася хваробаю.

Ён пачаў упарта дабівацца свайго...

— Праўда, я ня спэц,—казаў ён сакратару ячэйкі і дырэктару,—але я шмат чытаю, хачу працаваць і ведаю, што, падвучыўшыся на практыцы, здолею прынесьці заводу карысьць. Перавядзеце...

Дырэктар-жа даводзіў, што гэта будзе дорага каштаваць, бо ў ляботарыі другога падручнага ня трэба.

— Дык назначце хоць чорнарабочым, я памагаць буду, абы бліжэй да ляботарыі...

Сакратар ячэйкі шукаў компромісу, але дырэктар ні зашто ня ішоў насустрач.

Вечарам позьнім Саламон доўга блудзіў па горадзе. Ён выйшаў з дому бяз мэты. Хацелася пераканаць сябе ў тым, што нічога ня выйдзе і што трэба справу з ляботарыяй адкласьці. Але ніяк ня мог вытлумачыць сабе няўважлівых адносін да сваіх заяў з боку дырэктара.

«Я толькі гэтым жыву... Чаму-ж ня пушчаюць мяне да ўлюбёнай працы? Чаму ня хочуць, каб было ня дваццаць сем, а трыццаць два ці трыццаць пяць фунтаў? А гэта-ж зусім рэальная справа, пра гэта упарта гавораць кнігі. Хоць-бы фунт на пуд, дык і то гэта дасьць каля сотні лішніх пудоў дражджэй у месяц, больш тысячы пудоў за год. А магчыма-ж і пяць фунтаў на пуд. Гэта цэлыя тысячы пудоў новых, дадатковых пудоў дражджэй!»

Ён аніяк не разумеў, чаму ня хочуць даць яму магчымасьці заняцца досьледамі, каб формулы, пазнаныя з кніг, ператварыць у рэальнасьць. Ён-жа здо-

леў столькі кніг! Ён-жа бачыў у формулах ня толькі лацінскія значкі альфабэту, а цэлыя пуды сыравіны, цэлыя горы скрынак, а ў іх новыя і новыя фунты сопкіх, мяккіх, прыемных пахам, дражджэй. Саламон і цяпер адчувае гэты пах. Ён казыча ноздры і так раздражняе, што Саламон быццам бачыць, як пеняцца і растуць дрожджы.

Саламон спыніўся. Пахне заводзкая пара. Ён акурат стаяў супроць заводзкага двара і вецер адтуль даносіў пах...

Саламон трошкі пастаяў, потым завярнуўся ісьці дахаты.

«Сёньня-ж вазьму і напішу заяву; абгрунтую яе, з кніг вазьму падставы і давяду ім, якія значныя прыбыткі даў-бы дзяржаве завод пры павялічэньні коэфіцыенту карыснасьці пуда сыравіны. Тысячы... Тысячы рублёў, разьвіцьцё заводу!..»

А праз два дні было паседжаньне бюро парт'ячэйкі. Разьбіралі ў бягучых справах заяву Саламона і справу Соні.

Саламон увесь час сядзеў чырвоны і ў дзесяты раз, на новых лістках блёкноту, перапісваў тое, што хоча сказаць. Сэрца гэтак часта-часта білася і знэрвована дрыжэлі пальцы. А побач сядзела Соня і раз за разам, тулячы вусны рогам хусткі, пазяхала... Яна павінна была даць тлумачэньні аб прычынах ненаведваньня партшколы.

Першай была заява Саламона. Дырэктар зноў выступіў супроць пераводу ў лябараторыю. Старшыня-ж

заўкому прапанаваў даць паўдня працы ў лябараторыі. Саламон ужо і за гэта дзякаваў яму ў душы, і нават прасіў слова, каб хутчэй заявіць аб згодзе, як раптам сакратар ячэйкі ўнёс прапанову перавесьці туды яго падручным майстра.

— Малады, справу добра ведае, а вучыцца і шчыра, і чартоўскі многа. Калі папрацуе ды ў ВУЗ пойдзе пасьля гэтага, дык спэца свайго мець будзем!

Прагаласавалі. Чатыры на тры: Саламон Кац будзе працаваць у лябараторыі. Ён моўчкі ўсьміхаўся і сарамліва чырванеў ад радасьці неспадзяванай.

*

З работы прыйшла Соня ўстрывожанай. Бюро ячэйкі вывесіла ў канторы маленькі сьпіс неакуратных наведвальнікаў партшколы. Сярод іх, трэцяй спачатку па ліку, была яна. На заводзе ёй цэлы дзень успаміналі аб гэтым і, з кпінамі, віталі.

А пасьля работы яшчэ раздражнілі і ў харчэўні. Яна купіла абед і з талёнамі доўга стаяла ў чарзе за крэслам, за сьпіною абедаючага мужчыны. Той паціху, нібы наўмысьля, пераліжоўваў мяса, абгрызаў дачыста косткі і штохвіліну абціраў хустачкай губы або пальцы. А калі ён, праз хвілін дзесяць, запытаў у афіцыянта аб другой страве, той адказаў, што ёсьць толькі «язычкі». Соня скрывілася: «Ах, «язычкі» ўжо гэтыя». Яна не магла нават падумаць аб іх. Раззлаваная, яна здала талёны ў касу і пайшла дамоў.

У сенцах яе спаткала гаспадыня.

— Вам позва—здалёку аднекуль. Гаварыў паштальён, каб не пазьней як праз тры дні вы зьявіліся на пошту і самі, толькі асабова...

Не распранаючыся, яна разглядала позву і адгадвала.

— Што-ж там за паведамленьне ды яшчэ здалёку? Ад каго? І чаму толькі асабова?

З гэтымі думкамі Соня лягла рана спаць.

На другі дзень а дзесятай гадзіне яна ўжо стаяла ў чарзе каля акенца нумар чатыры. Чарга павольна прасоўвалася ўперад, меншылася і гэтак-жа зноў нарастала. За акном нізенькі лысы чалавечак. Узяў ён позву, разглядзеў уважліва, зірнуў на яе самую і ў дакуманты. А потым напісаў штампаваную паперку і аднатаваў яе ў кнізе.

— У банку, да дзьвёх гадзін! Наступны...

Соня нічога не разумела. Перад вачыма ўсё закружылася... Гэта, мусіць, ад пярэстых вопратак розных людзей у чарзе і ад задухі. Трэба хутчэй на паветра. Паперку схавала ў портманэт.

На дварэ каля пошты людзі; шумна. Пайшла ў сад. Хацела абдумаць усё, зразумець. Ад напружаных думак і зьмены душнага паветра пошты на сьвежае надворнае балела галава, рабілася млосна... Соня села на лаўцы.

Каля лаўкі алешына голая. На гальлі яе абледзянелы ўчарайшы дождж. Алешына быццам апранута ў ледзяную сарочку. А калі дыхае вецер,—яна зашур-

шыць, зазвоніць абмёрзлым гальлём і сыпле на зямлю маленькімі кавалачкамі празрыстага лёду.

Пачаў ісьці сьнег.

Над садам неба ў хмарах мутных. Хмары сыплюць першым ціхім, рэдкім сьнегам. Сьняжынкі то адзінкамі, то гуртам цэлым адна за другой ляцяць і на сьцежку ўтоптаную кладуцца. Глянеш на сьняжынкі, жадаючы ўлавіць палёт іх некалькіх зразу і кожнай у пасобку,—і здаецца, што гэта не сьняжынкі падаюць, а белыя, пухавыя, дрыжачыя ніткі-пасачкі цягнуцца тоненькімі струнамі нежнымі ад хмар на зямлю і сваімі канцамі ўсьцілаюць і ўсьцілаюць яе, робяць чыстай, сьветлай і нават чуецца ў паданьні сьняжынак ціхая музыка мяккая.

Сьняжынкі падаюць на распалены гарачы твар. Упадзе, ціха-ціха датнецца да твару сьняжынка і зьнікне,—растане, не пакінуўшы сьледу. Хочацца ад гэтага, каб болей падала сьняжынак, і Соня, падняўшы галаву, зусім падстаўляе свой гарачы твар беламу халоднаму павуціньню...

Ужо абсыпана імі паліто, лаўка; ужо трохі астылі ногі і холад тоненькімі струменямі пабег па ўсяму целу, аж да грудзей, і ад гэтага яшчэ мацней забалела галава... Лоб гарачы.

«Пайду ў банк, а потым у амбуляторыю, хоць-бы толькі не захварэць, хоць-бы толькі ня грып?»

Мякка, зусім ня чутна ступаюць ногі ў сьвежа апаўшы няпрытоптаны сьнег. Ня зьлёгся ён яшчэ і сьняжынкі лёгкія ляжаць, як упалі: старчма, пахіла,

плазам і лёгка ўздымаюцца за нагамі. А ад хмар цягнуцца новыя белыя, бясконцыя ніткі,—і снуюць зіму, ператыкаюць зямлю чорную белым утокам...

*

Вечарам гуляла Соня з Довідам. Адну за другой міналі алеі... Соня ішла сюды з надзеяй гаварыць аб тым, чаго ня трэба чуць староньнім. Яна даўно ўжо чакала такога спатканьня. Хацела да прагнасьці, у адзіноцтве з ім, пад змрокамі вечара, адчуваць у сваёй яго руку і слухаць словы аб каханьні... Яны павінны быць—гэтыя словы, яна гэта ведала і чакала...

А цяпер, пакуль Довід гаворыць аб кіно, успамінае знаёмых і,—па ўласьцівых людзях звычаях абгаварваць усіх да сябе падобных,—гаворыць пра сваіх сяброў, пра іх каханак, яна мацней і мацней сьціскае яго руку, патрабуе гэтым ад яго другіх слоў... А чуючы, як ён ад аднае тэмы раптам, бяз ніякае сувязі, пераходзіць на другую, яна хоча адгадаць, калі-ж ён скажа самае галоўнае і нават вызначае хвіліны... Ён-жа ўспамінае зусім няцікавыя факты, падоўгу і без патрэбы апавядае пра іх...

Ужо позна, робіцца холадна. Разумее Соня, што калі не падштурхнуць яго на размову аб галоўным, дык ён ня зможа пачаць сам.

— Мне холадна, можа пойдзем двору?

— Не, чаго-ж? Яшчэ трошкі пабудзем.

— Добра! Я згодна,—мне прыемна з вамі...

Сказала і чакае. А ён толькі пачырванеў і нешта, як-бы сам сабе, сказаў пацiху.

Ня ёмка выйшла неяк...

— Ну, а вам, вам ці прыемна са мною?

Толькі так хіба яго расьсьмеліш.

— Соф'я Навумаўна! Выбачце мяне! У мяне ўсё пераблыталася ў галаве. Вы самі ведаеце, як прыемна мне з вамі! Увесь час хацеў-бы быць разам... Выбачце мне,—і працаваць, і думаць лягчэй, калі вы дома ў нас, хоць і ня бачу часам, але ведаю, што блізка вы. Жыцьцё тады другім здаецца!

Соня чакала гэтых слоў, але хацела і крыху большага...

«Які ён дзіўны! Няўжо не разумее? А калі ня скажа цяпер, дык у другі раз я сама скажу, сама,— хіба абавязкова, каб ён першы?!»

*

Ня хочацца спаць, але не таму, што няма жаданьня легчы, пацягнуцца і заснуць, не,—а таму, што ёсьць другое больш моцнае жаданьне: сядзець на ложку і меркаваць, меркаваць, меркаваць без канца.

У пакоі цёпла ад печы напаленай; цяплыня аж на ложак дастае. А на дварэ мяцеліца, зусім зіма ўжо. Чутна, як пад страхой завывае вецер і, ня сьціхаючы, раз-по-разу сыпле густа сьнегам у шыбы аконныя. Калі выйсьці зараз на вуліцу, вецер сілком зрываў-бы з плеч паліто, забіраўся-б за пазуху, скідаў-бы з гала-

вы хустку, сьляпіў-бы вочы дробнымі сьняжынкамі... А ў хаце цёпла, прыемна...

Каторы ўжо раз пачынае Соня свае меркаваньні нанава і ўсё нібы чагосьці не дастае...

Паліто-ж яна, здаецца, сабе заказала новае зімняе. а праз некалькі часу дастане—паабяцалі ёй—сукна добрага і на летняе паліто. Застаюцца толькі—сукні, фіранкі, боты цёплыя, мэбля...

У каторы раз кружыцца думка ў карагодзе з палітоў, сукняў, фіранак, мэблі і неяк ня можа выйсьці за межы іх зачараванага кола, а Соня добра памятае, што трэба, абавязкова трэба яшчэ нешта абмеркаваць. Аглядае пакой, доўга спыняе погляд на кніжках, на стале, на вокнах. На хвілю адну толькі мільгануў з-пад сумачкі ражок зялёны партбілета...

І зноў карагод паліта зімняга і летняга, убраньняў, мэблі. Гэтыя рэчы робяцца ўжо ў думках да фізычнага адчуваньня рэальнымі і ўсё-ж ня выходзяць думкі з іх кола, чагосьці не знаходзяць там, чагосьці ня могуць прыпомніць.

«Так, так... яшчэ боты куплю фетравыя... тыя, што на Савецкай у вітрыне бачыла... нявысокія, шэранькія... Абавязкова куплю».

Цяпер і боты закружыліся ў агульным карагодзе, але зноў напружваюцца мазгі, хочуць яшчэ нешта ўспомніць.

«Ня тое, усё ня тое».

«Ага, як-жа з шапкай? Нельга-ж у гэтай болей хадзіць. Паліто добрае, боты і—шапка; ай, як сьмеш-

на. А я і забылася. Трэба купіць цёмную шапачку, як у Ядзі, яна так падыходзіць. З-пад шапачкі і з каўняра твар, як і ў Ядзі, будзе выглядаць зусім маладым, прыгажэйшым. Просьценькую, але пекную шапачку».

І ўсё-ж ткі чагосьці нанава не хапае яшчэ, чагосьці надта важнага, без чаго ня можа быць закончана кола думак. Хоча ўспомніць Соня і ня можа. Напружваюцца мазгі да таго, што ў скронях боль адчуваецца...

Урэшце задрамала... Цяплыня прыемная агарнула цела, думы стамілі яго...

Апоўначы прачнулася, сплючы разьдзелася і лягла зноў...

*

Шамацяць паперкі ў пальцах, мільгацяць над сталамі рукі, упакоўваюць сьвежыя пачкі дражджэй. Бесьперастанку шыпіць нутро заводу, бесьперастанку чохкае за сьцяной рухавік, дрыжаць нэрвона сьцены, дрыжыць зямля.

Соня паволі пакуе пачкі дражджэй і складае перад сабой на стале дзесяткамі. Рукі зусім мэханічна працуюць, бо думкі недзе там па-за мэблі, фіранак, убраньняў і паліто, а з-за іх выглядае малады чарнявы твар. І ўсё чагосьці не хапае.

«Чаго ён баіцца? Праўда, ён кожны дзень бывае, гаворыць ёй аб каханьні, але гэта ня ўсё яшчэ. Дакуль-жа яно будзе цягнуцца? Сёньня, калі прыйдзе—

дык сама скажу! Палахлівец ён... Мучыцца сам, кожны раз ідзе, каб сказаць галоўнае, і ня можа! Я—сама! Яно і сьмешна трохі, што дзяўчына зробіць прапанову, але-ж мы кахаем адзін другога, ведаем гэта! Ці-ж ня ўсёроўна?»

Цьвёрда парашыла зрабіць і гэта, але і цяпер усё чагосьці ня можа ўспомніць яшчэ, чагосьці не хапае...

Карагодам круцяцца думкі...

У пакойчыку парт'ячэйкі на стале конвэрт на імя сакратара. Ён разарваў конвэрт, дастаў ліст, перачытаў яго два разы.

«Няўжы—праўда? Чаму-ж яна затаіла гэта? І цэлы-ж месяц ужо хутка, а яна ніводнага гуку. Дзіўна! Мусіць, праўда, трэба зараз-жа выклікаць, спраўдзіцца».

Апрануў фрэнч, шапку. Пайшоў у пакавальнае аддзяленьне да Соні.

— У абед зойдзеш у бюро ячэйкі,—справа ёсьць.

І нічога ня мог зразумець.

«Нібы і нічога... такая справа, што і чорт галаву зломіць... Ня можа быць! Комуністка, тры гады ў партыі, не павінна так... не навічок-жа».

Яшчэ раз перачытаў заяву. Пазваніў на пошту, даведаўся аб Бульбяніку, сапраўды, ёсьць такі.

«Значыць правільна. Трэба пагаварыць сур'ёзна, рубам паставіць пытаньне,—гэта-ж ня жарты!»

Словы сакратара ячэйкі ўстрывожылі Соню.

«Чаго ён выклікае? Няўжо зноў за партшколу? А мо'... гэта?.. Так... так яно і ёсьць, пэўна дазна-

ліся... Няўжо-ж адбяруць? Якая ім справа. Гэта маё, толькі маё асабовае!..»

Трывожныя думкі пабеглі хутка, і разам з імі закарагодзілі, замітусіліся перад вачыма боты, паліто, Зэлда Язэпаўна і ён,—малады, прыгожы, чарнявы...

«Не аддам! Я ўвесь век жыла ў такіх умовах, у такіх умовах... Другія жывуць яшчэ і ня так! Нават і ў нас, комуністых... А мне чаму нельга? Зноў так? А будучыня?»

Абедзены гудок... Соня накінула паліто і пайшла... У пакоі адзін сакратар.

— Чаго клікаў?

— Заява на цябе.

— Заява? Аб чым?

— А як ты думаеш, ёсьць аб чым на цябе пісаць?

— Ня ведаю. Можа і ёсьць.

— Ну, добра, кінем гэта. Заява кажа, што ты атрымала з Амэрыкі дванаццаць тысяч даляраў. Правільна ці не?

— Так, атрымала.

— Чаму-ж ты не паведаміла ячэйку?

— ?!

— Ты ня ведала, што гэта трэба, ці сумысьля не зрабіла?

— Ня ведала.

— Дык ведай, ёсьць такая партыйная дырэктыва: кожны член партыі, які атрымлівае вялікія сумы

грошай, павінен скарыстоўваць іх толькі з ведама партыі.

Перад вачыма ў Соні карагодам носяцца і ложак, і паліто, і боты, і Абрам Кантаровіч, і сакратар ячэйкі,—толькі ён нешта крывіцца на яе і дражніць.

«Гэта яго не хапала тады»,—дагадваецца Соня.

— Як гэта?

— Партыя вырашае, колькі грошай пакінуць самому, а рэшта—у комбыт.

Толькі пасьля гэтых слоў Соня выразна адчула ўсю вялізарнасьць сумы ў дванаццаць тысяч даляраў, усю моц яе, яе значэньне ў жыцьці. Яны могуць даць пэўную магчымасьць вылезьці з гэтага цяжкага, стамляючага жыцьця і пачаць нейкае інакшае.

Яна маўчала.

— Дык вось. Калі ня ведала ты, дык яшчэ нічога, а калі ведала, дык зараз-жа павінна дакументальна паведаміць ячэйку пра атрыманьне грошай і вызначыць, якую суму ты для сябе просіш,—пяцьсот ці тысячу! Болей контрольная камісія не дазволіць.

— Я аб гэтым ня думала. А чаму адбіраць, дзе такое правіла? Я сама магу даць, колькі я захачу комбыту, а не комбыт будзе вызначаць мне, мае-ж грошы!

— Якраз ня так, а наадварот. Колькі трэба табе—столькі партыя і дасьць, але ня тысячы-ж даляраў, не магазын-жа ты адчыняць зьбіраешся? А мо' з процантаў хочаш жыць? Тады нельга быць у партыі!

— Я хачу не гандляваць, а жыць трохі лепей. І ад комбыту не адмаўляюся...

— Дык я-ж табе кажу, які парадак існуе. Зараз-жа напішы заяву, а ў суботу на бюро разьбярэм.

У Соні расла моцная крыўда, хацелася спрачацца.

— Ня буду пісаць заявы!

— Не жартуй! Інакш ня можа быць!

Вярнулася на працу расхваляванай. Пальцы аніяк ня згіналіся спрытна, як заўсёды. З асаблівай сілай ныла сьпіна. А думка з болем сьвідравала мазгі: як быць, што выбраць? І ніяк ня можа зразумець гэтых правіл, чаму хоча адабраць ад яе партыя магчымасьць лепей жыць?

*

У суботу, вешаючы нумар свой, прачытала Соня, што яе выклікаюць на бюро а сёмай гадзіне вечара. Яна яшчэ нічога не парашыла, заявы не падала і наваі ня ведала—ці пойдзе на бюро, ці не.

Пасьля работы зноў прачытала абвестку і пайшла дамоў...

На кватэры ў Абрама Кантаровіча кожную суботу госьці,—весела. У такія вечары асабліва прыгожа выглядаюць пакоі Зэлды Язэпаўны, і Соня прыемна адпачывае ў глыбокім крэсьле, слухае Довіда, выслухоўвае ветлівыя словы гаспадара з гаспадыняй або госьцяй. Так прыемна адпачываць.

«Яны працуюць, гэтыя людзі, як і ўсе,—думае Соня,—працуюць для дзяржавы, як і я, і жывуць

добра, з імі можна адпачыць, набрацца сіл, павеселіцца. Дык чаму-ж мне нельга?»

Довід трымае яе рукі ў сваіх і ў змрочным пакоі дзьве сьвечкі мала сьвецяць, нахіляецца да яе і ціха гаворыць аб сваім жаданьні быць заўсёды з ёю.

Соня любіць Довіда і ўжо цьвёрда гаворыць з ім аб дні вясельля, сямейнага невялічкага вясельля. Яна думае аб гэтым.

«Дык няўжо-ж сыйсьціся з ім і жыць зноў, як дагэтуль, каб зноў мець толькі паліто шэранькае і шапку? А як-жа будуць дзеці? Жыцьцё не на год, не на месяц,—як тады. Спадзявацца на лепшае. А хто яго ведае, калі яно лепей стане, мала што мы гаворым, будуем...»

Ветліва міргаюць агенчыкі сьвечак. Лашчаць погляд парт'еры зялёныя, цяжкія над дзьвярыма, шафа з пасудаю крыштальнаю, сярэбранаю і багатыя ўбраньні гасьцей. Моладзь занята, яна пад музыку піяніна скача польку шумлівую. Абрам Кантаровіч таксама ў другім канцы пакою заняты: ён са служачым трэсту аб нечым гутарыць,—і ніхто ня бачыць, як Довід цішком падносіць да губ сваіх Соніны рукі, цалуе і гладзіць іх. А Соня грозіць яму пальчыкам і ўсьміхаецца...

У пакой зайшла служка гаспадыні.

— Вас просіць, Соф'я Навумаўна, госьць.

У калідоры яна адразу пазнала сакратара ячэйкі.

— Я думаў, што ты захварэла. А сёмай гадзіне бюро будзе,—твая справа. Трэба, каб была ты сама.

Доўга маўчалі абое.

— Я ня буду на бюро.

— Як гэта?

— Ды так,—ня буду. Ня можаце вы са мною гэтак зрабіць!

— Ня ўпірайся. Я сказаў табе, якая існуе дырэктыва. Комуністы інакш рабіць ня можа. Ты-ж не маленькая дзяўчынка, тры гады ў партыі...

— Дык што-ж?

— Як што-ж? Ты не разумееш?

— Вельмі добра разумею!

З пакою даносіліся гукі полькі і скокаў.

— Та-ак. Дык усё-ж ткі? Як разьбіраць справу?

Соня яшчэ адчувала сьляды пацалункаў Довіда, помніла ўгавор аб вясельлі і аб тым, што парашыла зрабіць яму ў дзень вясельля падарунак: сказаць аб грашох. А тут ён,—ячэйка...

— Чаго вы ад мяне хочаце з ячэйкай?

— Хочам, каб сказала канчаткова, разумееш ты ці не?

— Разумею!

— Дык што-ж ты выбіраеш,—партыю ці грошы? А? Сорамна!..

— Ня дам грошай! Рабеце, што хочаце.

— Не дасі?.. вычысьцім...

— Вычышчайце, падзякую...

У сакратара задрыжэлі губы, на твары некалькі раз перакасіла левую шчаку, зморшчыўся лоб, вочы неяк дзіка глянулі на Соню.

Адзін супроць аднаго яны моўчкі сталі адну толькі хвілю, а здалося, што доўга, доўга. Страшна Соні ад яго погляду. Вось ён ужо ад сьцяны адышоў, да яе падыходзіць...

— ... Сволач ты! У-у-у м-маць тваю... партбілет носіш... паскуда...

Плюнуў пад ногі злосна і пайшоў.

Яшчэ хвіліну пастаяла Соня, потым млосна ёй зрабілася, пайшла ў пакой села ў крэсла. Довід чакаў сумны.

— Соф'я Навумаўна, вы нечым усхвалёваны,— скажэце?

Пагладзіў яе руку, хацеў узяць у сваю. Яна адхіліла.

— Што з вамі, Соф'я Навумаўна?

— Пакіньце,—мне ўсё так абрыдзела...

Яе ахапіла злосьць і крыўда на ўсіх: і на Довіда, і на сакратара ячэйкі, і на сябе, і на гасьцей. Прыемны чарнявы твар Довіда адразу паказаўся прыкрым, хацелася адпіхнуць яго і нешта нядобрае крыкнуць усьлед. А Зэлда Язэпаўна здалася—занадта тоўстай.

Усё заскакала наўкола, закарагодзіла: і Абрам Кантаровіч, і Зэлда Язэпаўна, і шапачка, і ложак, і боты, і сакратар ячэйкі, а з шафы з пасудаю, з-за порт'ер і фіранак вокан быццам глядзеў нехта, паказваў пальцамі на яе і рагатаў...

— Не магу я, дрэнна мне зрабілася нешта...

Устала з крэсла і, як п'яная, хістаючыся каля сьцяны, каб не перашкодзіць скокам, пайшла ў свой

1964 г.

пакой... Довід хацеў падтрымаць, але яна ўзяла яго руку і адвяла ўбок...

— Ня трэба, пакіньце мяне адну...

Зьдзіўлены і зьбялелы стаяў у калідоры Довід.

Задзіраста брынкала на старым піяніно полька.

У пакоі Соня заперла на замок дзьверы і, не распранаючыся, кінулася ў ложак,—схавала твар у падушку... А навокал яе кружыліся карагодам нейкія незнаёмыя, скрыўленыя твары, стол, паліто, боты, убраньні, шафа гаспадарская з пасудаю і ўсё гэта крычала: што выбіраеш? што выбіраеш?

Соня моцна сьціснула рукамі скроні, глыбей схавала ў падушку твар, сьціснула зубамі навалку падушкі і сама сабе глуха крыкнула: ня дам! нічога ня дам! ня дам!..

У пакоях гаспадара змоўкла полька.

Госьці пачалі разыходзіцца. У кандэлябрах мядзяных дагаралі ўжо сьвечкі, а Зэлда Язэпаўна яшчэ доўга і ўпарта штосьці шаптала мужу...

За акном слаўся ціхі сьнег.

Студзень 1929 г.
в. Пацічова.

ЗЬМЕСТ


Стар.

Уцякач . . . . . . . . . . . 3
Дасужая . . . . . . . . . . . 18
Кнак . . . . . . . . . . . 70
Суседзі . . . . . . . . . . . 92
Ня так . . . . . . . . . . . 121
Перад канцом . . . . . . . . . . 125
Даляры . . . . . . . . . . . 147

1964 г.

Бел. аддзел
1994 г.

B00000003 1 19234